Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 СНЕЖНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 239 (26104)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«Прамая лінія»: толькі ў «Звяздзе»!

І ЗНОЎ ПРА «ЛЬГОТНАЕ ПЫТАННЕ»

З 17 снежня 2007 года ў Беларусі ўступае ў сілу Закон «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях», і адначасова пачнуць дзейнічаць дадатковыя меры па сацыяльнай падтрымцы некаторых катэгорый грамадзян. З улікам вялікай колькасці зваротаў, што паступаюць у рэдакцыю з гэтай нагоды, газета «Звязда» вырашыла правесці «прамую лінію» з прадстаўнікамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Канкрэтныя дату і час правядзення «прамой лініі» мы паведамім дадаткова, а тым часам чакаем вашых папярэдніх пытанняў па мінскім нумары 287 17 57.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

Працягваецца падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2008 года. Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8800**	**26400**	**52800**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8300**	**24900**	**49800**
63858 (ведамасны)	**14000**	**42000**	**84000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**12800**	**38400**	**76800**

СТРАТЭГІЧНАЕ ПАРТНЁРСТВА!

Нягледзячы на ажыятаж, развіты некаторымі СМІ, двухдзённы афіцыйны візіт Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Мінск не стаў нечым надзвычайным. Праўда, інтрыга захоўвалася дастаткова доўга — ні па прылёту, ні пасля нефармальнай сустрэчы двух лідараў у гарналыжным курорце «Сілічы» ў чацвер вечарам ніякіх заяў не прагучала.

Учора пасля ўрачыстай сустрэчы каля рабочай рэзідэнцыі кіраўніка беларускай дзяржавы прэзідэнты правялі перамовы ў вузкім складзе. Распачынаючы сустрэчу, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок гатовы да перамоваў з Расіяй па ўсіх пытаннях. Ён таксама выказаў здзіўленне з нагоды ажыятажу, які выклікаў на Захадзе візіт Уладзіміра Пуціна ў Беларусь. Беларускі лідар запэўніў, што тут няма ніякага падтэксту. «Мы як дружалюбныя саюзныя дзяржавы сустракаемся ў Мінску. Было б дзіўна, калі б Прэзідэнт Расіі не пабываў з афіцыйным візітам у Беларусі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, абодва прэзідэнты яшчэ падчас сустрэчы ў Душанбэ звярнулі ўвагу, што дагэтуль не было афіцыйнага візіту Уладзіміра Пуціна ў Мінск. Як падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы, на парадку дня вельмі многа пытанняў — ад абароны, бяспекі Саюзнай дзяржавы да эканамічных і сацыяльных аспектаў. Дасягнутыя дамоўленасці лідары абедзвюх краін пазней агучылі на сумеснай прэс-канферэнцыі.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін падзякаваў Аляксандра Лукашэнку за прадастаўленую магчымасць правесці Вышэйшы дзяржсавет Саюзнай дзяржавы ў Мінску. Гаворачы аб развіцці двухбаковых адносінаў паміж нашымі краінамі, расійскі Прэзідэнт асабліва адзначыў стабільны рост аб'ёмаў узаемнага гандлю. Паводле яго слоў, па выніках 2007 года тавараабарот павінен дасягнуць новай планкі — 24 млрд долараў. «Гэта вельмі добры паказчык», — даў ацэнку расійскі лідар.

Як лічыць Уладзімір Пуцін, «аб'ём нашых адносінаў, іх разнастайнасць і іх дыверсіфікацыя адсоўваюць на другі план усялякі афіцыёз». Але і вырашэнне афіцыйных пытанняў таксама нельга ігнараваць.

Па завяршэнні двухбаковай сустрэчы ў вузкім складзе Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін усклалі вянок да манумента Перамогі ў Мінску і ўзялі ўдзел у цырымоніі адкрыцця галаўнога офісу Банка ВТБ (Беларусь). Расійскі банк мае вялікі вопыт паспяховага супрацоўніцтва з Беларуссю. Стратэгія яго развіцця прадугледжвае пашырэнне крэдытавання дзяржаўных прадпрыемстваў, кампаній нафтахімічнай галіны і іншых буйных прадпрыемстваў рэспублікі, а таксама актывізацыю работы ў галіне абслугоўвання знешнегандлёвага абароту паміж нашымі краінамі. Пасля ўрачыстай цырымоніі прэзідэнты накіраваліся да будынка Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, дзе і прайшло пасяджэнне ВДС Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

На парадак дня Вышэйшага Дзяржсавета было вынесена больш за дзесяць пытанняў. Найважнейшыя з іх — выкананне бюджэту 2007 года і бюджэт на 2008 год, рэалізацыя мерапрыемстваў Плана сумесных дзеянняў у галіне знешняй палітыкі, гандлёва-эканамічныя адносіны дзвюх краін. Як вядома, бюджэт на 2008 год складзе каля 4 млрд расійскіх рублёў, што на 10 працэнтаў больш за сёлетні.

У Мінск разам з Уладзімірам Пуціным прыбыла даволі прадстаўнічая дэлегацыя — прэм'ер-міністр Віктар Зубкоў, спікеры абедзвюх палат Федэральнага Сходу Сяргей Міронаў і Барыс Грызлоў, віцэ-прэм'ер Аляксей Кудрын, міністр эканамічнага развіцця і гандлю Эльвіра Набіуліна, міністр прамысловасці і энергетыкі Віктар Хрысценка, міністр транспарту Ігар Лявіцін, міністр абароны Анатоль Сердзюкоў, кіраўнік мытні Андрэй Бельянінаў.

Адкрываючы пасяджэнне ВДС Саюзнай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Пуціна з пераканаўчай перамогай усерасійскай палітычнай партыі «Адзіная Расія» на выбарах у Дзярждуму РФ. Паводле яго слоў, поспех гэтай партыі — сведчанне падтрымкі народам Расіі палітычнага курсу Пуціна на ўмацаванне расійскай дзяржаўнасці, павышэнне аўтарытэту Расіі на міжнароднай арэне. Беларускі лідар з задавальненнем адзначыў, што свой першы візіт пасля «рэферэндуму» Прэзідэнт РФ здзейсніў менавіта ў Беларусь. «Мы расцэньваем гэта як сімвал адданасці ідэі яднання нашых краін, а таксама як ацэнку значнасці беларуска-расійскіх адносінаў», — заявіў беларускі лідар. У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь нязменна разглядае Расію як галоўнага стратэгічнага партнёра.

Сведчаннем узаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін з'яўляецца рост тавараабароту, які па выніках года можа дасягнуць рэкорднага ўзроўню і перавысіць 24 млрд долараў. «Наша сціплая па сваіх прыродных рэсурсах, невялікая па колькасці насельніцтва краіна стаіць сярод лідараў па аб'ёму гандлю з Расіяй побач з сусветнымі індустрыяльнымі гігантамі: ЗША, Кітаем, Германіяй», — канстатаваў кіраўнік Беларусі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, узаемаадносіны паміж нашымі дзяржавамі дасягнулі высокага ўзроўню інтэграцыйнага ўзаемадзеяння, пры якім бакі ўжо выпрацоўваюць сумесныя дзеянні, свядома перадаюць пэўныя нацыянальныя паўнамоцтвы для вырашэння агульных задач. Менавіта на гэта накіравана дзейнасць Вышэйшага Дзяржсавета, іншых органаў Саюзнай дзяржавы.

«Рэаліі сённяшняга жыцця ставяць перад намі яшчэ адну актуальную задачу — забяспечыць больш якасны ўзровень узаемадзеяння на міжнароднай арэне. Не толькі разам выстаяць у свеце новых пагроз і выклікаў, але і ўзмацніць наш знешнепалітычны ўплыў, нарасціць эканамічны патэнцыял», — заявіў беларускі лідар.

Беларусь гатовая сыграць сваю ролю ў пытанні мяркуемага размяшчэння ў Еўропе элементаў проціракетнай абароны ЗША, каардынаваць свае дзеянні з расійскім бокам па адаптацыі Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як паведаміў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, на сустрэчы ў вузкім складзе, якая доўжылася больш за чатыры гадзіны, кіраўнікі дзяржаў сканцэнтравалі ўвагу на пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Паводле яго слоў, і ВДС павінен канцэнтраваць увагу на такіх прагматычных рашэннях, якія максімальна адпавядаюць задачам, што стаяць перад дзяржавамі. Наглядным прыкладам гэтага з'яўляецца пазітыўная дынаміка тавараабароту паміж Беларуссю і Расіяй, прырост якога склаў больш за 25 працэнтаў. Уладзімір Пуцін таксама адзначыў, што асноўным крытэрыем выніковасці сумеснай работы з'яўляецца паляпшэнне жыцця грамадзян нашых краін. «На гэты аб'ектыўны паказчык мы маем намер арыентавацца і ў будучым», — адзначыў расійскі лідар.

Прэзідэнт Расіі лічыць неабходным прадпрыняць больш энергічныя крокі ў накірунку фарміравання адзінай эканамічнай прасторы Беларусі і Расіі і ліквідацыі перашкод у гандлі паміж дзвюма краінамі, якія пакуль застаюцца.

На пасяджэнні было разгледжана пытанне выканання ў 2006—2007 гадах праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Супрацоўніцтва МЗС дзвюх краін працягнуць у рамках аналагічнай праграмы на 2008—2009 гады.

ВДС разгледзіў прапанаваныя змяненні ў складзе беларуска-расійскай камісіі па падрыхтоўцы Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы, а таксама кадравыя рашэнні ў адносінах старшыні і сустаршыні Пагранкамітэта Саюзнай дзяржавы.

Па завяршэнні пасяджэння ВДС кіраўнікі дзяржаў падпісалі шэраг дакументаў. Сярод іх — сумесная заява па выніках перамоваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, Мемарандум аб цяперашнім этапе развіцця эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і РФ. Урадамі былі падпісаны дакументы аб развіцці супрацоўніцтва ў галіне вытворчасці і ўзаемных паставак лекавых сродкаў, аб стварэнні роўных умоў у галіне цэнавай палітыкі на чыгуначным транспарце. Таксама падпісаны дагавор паміж ААТ «Белзнешэканомбанк» Рэспублікі Беларусь і дзяржаўнай карпарацыяй «Банк развіцця і знешнеэканамічнай дзейнасці «Знешэканомбанк» РФ.

Важным вынікам беларуска-расійскай сустрэчы стала выдзяленне Беларусі стабілізацыйнага крэдыту ў аб'ёме 1,5 млрд долараў, які павінен забяспечыць больш лёгкі пераход двухбаковага супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы на рынкавыя рэльсы.

На выніковай прэс-канферэнцыі Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін таксама заявіў, што незапланаванага павышэння цаны на газ для Беларусі не будзе. Расія выканае ў поўнай ступені падпісаныя летась дамоўленасці, нягледзячы на тое, што сама Расія будзе закупляць газ у Срэдняй Азіі па новых, больш высокіх цэнах.

Сяргей ПРОТАС.

Фота БЕЛТА.

«Звязда» і «Рэспубліка» — лепшыя ў самым «цёплым» конкурсе

Учора ў Міністэрстве інфармацыі адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу на лепшыя публікацыі па тэме мацярынства і бацькоўства. Першымі названы газеты «Звязда» і «Рэспубліка».

Конкурс гэты ўжо другі раз ладзяць на парытэтных умовах Міністэрства інфармацыі і Грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын». І што прыкметна, другі год запар у нашай краіне павышаецца нараджальнасць. «Магчыма, у гэтым ёсць і наша заслуга, — напалову сур'ёзна пракаментавала гэты факт намеснік старшыні «Беларускага саюза жанчын» Рэгіна Давідовіч. — Праз сродкі масавай інфармацыі людзі даведваюцца пра тое, як дзяржава падтрымлівае інстытут сям'і, газеты дапамагаюць стварыць моду на нараджэнне дзяцей, на шматдзетную, моцную і шчаслівую сям'ю».

«Ёсць заслуга журналістаў і ў тым, што дзеткі, якія засталіся без апекі бацькоў, праз газетныя публікацыі і акцыі знайшлі свае новыя сем'і», — дадала намеснік начальніка Упраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў міністэрства Валянціна Мяшчэрская.

Адну з такіх акцый: «Дзіця — самы дарагі госць у доме» праводзіла на сваіх старонках «Звязда» вясной гэтага года. У выніку яе некалькім дзецям, не толькі з мінскага дзіцячага дома, ёсць цяпер каму прамовіць самыя цёплыя на свеце словы «мама» і «тата».

Тое, што тэму мацярынства і бацькоўства ўпадабалі і самі журналісты, сведчыць вялікая колькасць удзельнікаў конкурсу — 86 намінантаў з усіх рэгіёнаў Беларусі і праблема, перад якой паўстала журы, адбіраючы лепшых з лепшых.

— Прадстаўленыя матэрыялы былі настолькі якаснымі, цікавымі, рознабаковымі і душэўнымі, што мы вырашылі павялічыць колькасць пераможцаў, — паведаміў на цырымоніі ўзнагароджання намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук.

Першай прэміяй і дыпломам I ступені адзначаны газеты «Звязда» і «Рэспубліка». Дыпломы другой ступені і тры другія прэміі ўручаны выданням «Народная газета», «Белорусская нива», «Народная трибуна» (Брэст) і «Віцьбічы» (Віцебск). Трэцяе месца ў конкурсе падзялілі ведамасная газета «Наш банк сегодня» (ААТ «ААБ Беларусбанк»), раённыя «Адзінства» (Барысаў), «Дняпровец» (Рэчыца) і спецыяльны карэспандэнт газеты «Магілёўскія ведамасці» Людміла Грышанава.

Дыпломамі Грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» і Міністэрства інфармацыі адзначаны яшчэ 22 выданні і 4 аўтары. А Крысціне Карпінчук з горада Узда Мінскай вобласці Беларускі саюз жанчын уручыць каштоўны падарунак за... верш, які яна прысвяціла сваёй прыёмнай маці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже административно-управленческого здания (915,4 кв.м) в г. Логойске по ул. Победы, 102. Пл. зем. уч. 0,1926 га. Начальная цена — 600 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2007 г. Аукцион состоится 29.12.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже административного здания (об. пл. 480,2 кв.м), здания склада (об. пл. 35,0 кв.м), расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Минская, 21. Площадь земельного участка — 0,2509 га. Начальная цена (снижена на 20 %) — 92 400 000 бел. руб. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.09.2007 г. Аукцион состоится 29 декабря 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28 декабря 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Тел: (8017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания конторы (464,4 кв.м), расположенного: Минская обл., Узденский р-н, пос. Новый, начальная цена снижена на 20 % и составляет 116 996 400 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.08.2007 г. Аукцион состоится 08.01.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул.Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

ПАЛЯЎНІЦТВАЗНАВЕЦ СМЯРОТНА ПАРАНЕНЫ

У райцэнтры Гарадок 56-гадовы інжынер-паляўніцтвазнавец быў смяротна паранены стрэлам з карабіну. Ён перад трагедыяй атрымаў у пакоі для захоўвання зброі службовы карабін. Калі паляўніцтвазнавец даставаў карабін з чахла, выпусціў яго з рук. Ад удару прыкладам аб падлогу і адбыўся нечаканы стрэл...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На выхадныя холадна, а потым пацяплее

У суботу і нядзелю тэрыторыя Беларусі апынецца на ўскрайку скандынаўскага антыцыклону, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. Таму пры высокім фоне атмасфернага ціску ападкаў у гэтыя дні не будзе.

На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Уначы 2—8 градусаў марозу, пры праясненнях да мінус 10. Удзень — ад 0 да 5 градусаў марозу.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца, толькі па паўночным усходзе краіны пройдзе невялікі снег. Аднак ужо ў другой палове тыдня стане крыху цяплей, месцамі пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Чакаецца туман і слабы галалёд. Удзень ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ОАО «Белагропромбанк» совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖЕЙ,

расположенных по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 91:

Номер лота	*Номер гаража*	*кв.м*	*Начальная цена с НДС*
1	1 Б (с ямой)	28,3	18 400 000
2	2 Б (с ямой)	20,3	13 710 000
3	3 Б	16,5	11 510 000
4	4 Б (с ямой)	16,3	12 700 000
5	5 Б	16,7	11 550 000
6	6 Б	16,6	11 530 000
7	7 Б	16,4	11 410 000
8	8 Б	15,7	11 250 000
9	9 Б	16,6	11 610 000

Размер задатка 10 % от начальной цены лота и перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 28 декабря 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з 75-годдзем ВНУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з 75-гадовым юбілеем ВНУ.

«Усе гэтыя гады акадэмія актыўна фарміруе кампазітарскую, выканальніцкую і музыказнаўчую школы, забяспечвае высокакваліфікаванымі кадрамі канцэртныя арганізацыі і навучальныя ўстановы краіны, — гаворыцца ў віншаванні. — Сярод выкладчыкаў нямала праслаўленых майстроў мастацтва, якія ўдастоены ганаровых званняў і ўзнагарод. Дзякуючы іх старанням студэнты і выпускнікі ВНУ дастойна прадстаўляюць Беларусь на прэстыжных міжнародных конкурсах і фестывалях.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Органам ЗАГС — 90 гадоў

«ШАНОЎНЫЯ МАЛАДЫЯ, У ГЭТУ ХВАЛЮЮЧУЮ, АДКАЗНУЮ ХВІЛІНУ...»

У пятніцу, 13-га, шлюб зарэгістраваць можна, але ахвотнікаў няшмат

З чым, як правіла, атаясамліваецца работа органаў ЗАГС (запіс актаў грамадзянскага стану)? Безумоўна, з рэгістрацыяй шлюбаў, і пажадана ў такой вельмі прыгожай, па-хатняму ўтульнай зале для ўрачыстасцяў, як у аддзеле ЗАГС адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна. Аднак кампетэнцыя гэтых службаў куды больш шырокая, у чым кожны з нас і пераконваецца на тых ці іншых этапах жыццёвага шляху. А іх работнікам трэба не толькі дасканала ведаць законы, але і быць добрымі арганізатарамі (прычым з творчай «стрункай»), дарадчыкамі і нават у пэўным сэнсе псіхолагамі.

Так лічыць начальнік аддзела ЗАГС адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна Галіна Казакова, якой рашэннем калегіі Міністэрства юстыцыі Беларусі па выніках працы за 2006 год прысвоена званне «Лепшы работнік органаў ЗАГС».

— У адпаведных упаўнаважаных дзяржаўных органах павінны быць належным чынам зарэгістраваны ўсе найважнейшыя падзеі ў жыцці чалавека. Гэта і яго нараджэнне, і стварэнне сям'і, і ўстанаўленне бацькоўства (мацярынства), і ўсынаўленне дзіцяці, і перамена імя, прозвішча, і скасаванне шлюбаў (па рашэннях судоў, якія ўступілі ў законную сілу да 1 верасня 1999 года), і смерць грамадзяніна. Аддзелы ЗАГС змяняюць, дапаўняюць, выпраўляюць, а таксамаануюць і аднаўляюць запісы актаў грамадзянскага стану, захоўваюць кнігі іх рэгістрацыі. Гэта важна не толькі для кожнага канкрэтнага чалавека і членаў яго сям'і, але і для грамадства ў цэлым, паколькі без дакладнай інфармацыі аб актах грамадзянскага стану немагчыма правядзенне выверанай дзяржаўнай палітыкі. І наша задача — своечасова і правільна зарэгістраваць гэтыя акты ў максімальна зручным для грамадзяніна рэжыме.

— Як жа гэта атрымліваецца на практыцы?

— Мяркую, што нашым наведвальнікам крыўдаваць не даводзіцца. Органы ЗАГС, як і іншыя дзяржаўныя ўстановы, працуюць з заявамі грамадзян паводле прынцыпу «адно акно». Гэта значыць, што калі чалавек звярнуўся ў аддзел ЗАГС па месцы жыхарства, дапусцім, у наш, а адпаведны запіс быў складзены і захоўваецца ў іншым аддзеле, то мы абавязаны пераслаць туды заяву і, атрымаўшы дакумент, уручыць яго грамадзяніну.

Увогуле нейкіх чэргаў цяпер практычна не бывае. Для гэтага практыкуем папярэдні запіс на правядзенне ўсіх працэдур, у тым ліку і на рэгістрацыю шлюбу. Як вядома, адпаведная заява па закону можа быць пададзена не раней, чым за тры месяцы да рэгістрацыі. Аднак сёння можна ўжо запісацца на рэгістрацыю шлюбу нават на жнівень наступнага года, выбраўшы зручны час — дзень і гадзіну.

Дарэчы, рэгістрацыя шлюбу ў нашым ЗАГСе магчыма і ў нядзелю. Скажам, у гэтым годзе пасля посту пятніца выпала на 13 красавіка, усе баяліся і ніхто не хацеў рэгістравацца, а за суботу мы проста фізічна не паспявалі. Таму выконвалі свае абавязкі і пятнацатага. Гэтак жа было і цяпер, перад калядным постам, які наступаў 26 лістапада. Працавалі і ў пятніцу, 23-га, і ў суботу, і ў нядзелю.

— Да пятніцы, 13-га, стаўленне перад рэгістрацыяй шлюбу заўжды такое рынцыповае?

— Так як, дарэчы, і да мая. Такі цудоўны месяц, але па статыстыцы ў нас тады вяселляў прыкладна столькі ж, колькі і ў перыяд посту.

— Вы лічыце апраўданымі звязаныя з постам абмежаванні ў тым ліку і на вяселлі?

— Усё залежыць ад жадання самі людзей. Некаторыя прыходзяць спецыяльна параіцца з намі наконт дня, калі лепш зарэгістраваць шлюб. Што датычыцца посту, то, на мой погляд, мы павінны жыць па нейкіх правілах і захоўваць традыцыі, якія былі закладзеныя нашымі продкамі.

— А ці раюцца з работнікамі ЗАГСа наконт імёнаў нованароджаных? Якія імёны сёння найбольш папулярныя?

— Так, раюцца, асабліва чамусьці таты. Што датычыцца найбольш папулярных імёнаў, то сярод хлопчыкаў гэта цяпер Мікіта, Кірыл, Арцём, Уладзіслаў. «Вяртаюцца» Цімафей, Мацвей. Даюцца і гучныя, рэдкія імёны. Нядаўна, да прыкладу, мы праводзілі ўрачыстую рэгістрацыю нараджэння Раціміра. Мажліва, бацькі адразу настроены на тое, што ён будзе нейкім асаблівым, мо, кіраўніком.

Сярод дзяўчынак «лідзіруюць» Дар'я, Софія, Настасся, Марыя, Ганна. Чамусьці апошнім часам менш называюць Ірынай, Галінай, Наталляй, Таццянай. Затое ў нас рэгістраваліся Джульеты, Монікі, Луізы, Ніколь, не Валерыя, а, на французскі манер, Валеры. Пасля кінафільма «Брат» вельмі распаўсюджаным было імя галоўнага героя, толькі ў розных інтэрпрэтацыях — Даніла, Данііл, Даніэль. А ў мінулым месяцы, відаць, у сувязі з вядомым серыялам у нашым ЗАГСе рэгістраваліся дзве Кіры.

Давалі мы «пуцёўку ў жыццё» таксама Кастусю, Алесю, Змітеру. Іх бацькі размаўляюць па-беларуску і, бачна, даражаць сваімі каранямі. Як правіла, такія людзі і ўрачыстую цырымонію рэгістрацыі шлюбу просяць правесці на беларускай мове.



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА (БЕЛТА).

Начальнік аддзела ЗАГС Ленінскага раёна г. Гродна Галіна КАЗАКОВА праводзіць прыём наведвальнікаў.

— ЗАГС да гэтага гатовы?

— Так. І асабіста я, і галоўныя спецыялісты ЗАГСа Марыя Дзямідзік і Алена Бубен. Яшчэ пры падачы заявы мы цікавімся жаданнем людзей наконт мовы правядзення рэгістрацыі шлюбу. Беларуская — не самая папулярная, аднак хто хоць аднойчы прысутнічаў на гэтай цырымоніі, мяркую, абыякавым не застаўся. «Шаноўныя маладыя, у гэту хвалюючую, адказную хвіліну...» Нацыяльныя касцюмы, «Зорка Венера» і ўвогуле чыста беларускае музычнае суправаджэнне ў выкананні скрыпачкі Ірыны Кротавай і піяністкі Вольгі Тарарараваў...

А вось урачыстасці з нагоды юбілею вяселля становяцца ўжо ў нашым ЗАГСе добрай традыцыяй. Для кожнай пары мы рыхтуем сцэнарый, папярэдне даведваемся аб гісторыі стварэння гэтай сям'і, яе жыццёвым шляху. На ўрачыстую цырымонію прыходзяць дзеці, унукі юбіляраў, прадстаўнікі раённай адміністрацыі і калектываў, дзе яны працавалі. Як правіла, людзі адзначаюць 25, 50 гадоў сумеснага жыцця. А нядаўна Павел Сцяпанавіч і Еўдакія Васільеўна Грыневічы прымалі ў нашым ЗАГСе віншаванні з 60-гадовым, «брыльянтавым» юбілеем, з уручэннем Ганаровага акта.

Мы ў нашым ЗАГСе з кожным годам сустракаем усё больш моладзі. Калі ў 90-х у нас рэгістравалася штогод 300—400 шлюбаў, то цяпер — амаль тысяча. Значна больш складаецца і запісаў аб рэгістрацыі нараджэння дзяцей. Павялічваецца колькасць дзяцей, якія нарадзіліся другімі, трэцімі. І ўжо не дзіва, калі бацькі прыходзяць рэгістраваць чацвёртае дзіця...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

САМЫ РАЗУМНЫ ЗНАЙШОЎСЯ

Ходзяць чуткі, што ў інтэлектуальнай тэлегульні «Адзін супраць усіх», якая ідзе штотыдня на АНТ, з'явіўся першы рэкардсмен, у сэнсе, абсалютны пераможца. Яму ўсё ж удалося выйграць галоўны прыз — 50 мільёнаў беларускіх рублёў. Падрабязнасцяў прэс-служба АНТ не раскрывае, маўляў, да эфіру нельга. Але прызнаюцца, што эфір гэты мы ўбачым у гэтым годзе — значыць, зусім хутка.

Нагадаем, гульня «Адзін супраць усіх» знаходзіцца на экране паўтара месяца. За гэты час 350 чалавек праверылі сябе на ўдачу і эрудыцыю, але пашанцавала, зразумела, далёка не ўсім. Выйгравалі розныя сумы, ад 35 тысяч да без малога 10 мільёнаў рублёў. Пры тым найскладанейшымі пытаннямі для гульцоў аказаліся зусім простыя, здавалася б, рэчы. Так, на пытанне трэцяй ступені складанасці «Як афіцыйна называецца галоўны заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь?» (Нацыянальны сход) не змаглі адказаць аж 24 чалавекі з 50 удзельнікаў (яны з іншай краіны на гульню прыехалі, ці што?). 27 чалавек не ведалі або забыліся, пры якім кіраўніку Расія прадала Аляску ЗША (Аляксандр II), 22 не адказалі правільна, якая песня была пазыўнымі беларускага радыё («Радзіма мая дарагая»), і 20 чалавек не здалі б гісторыю марксізму-ленінізму, бо не ведалі, якім дзіцем у сям'і Ульянавых быў Валодзя (трэцім). Тым цікавей паглядзець на чалавека, які ведае — няхай і не ўсё, але на 50 мільёнаў дакладна...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07239 >

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.12.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 154,00
1 еўра	3 138,70
1 латвійскі лат	4 506,75
1 літоўскі літ	909,05
1 чэшская крона	119,29
1 польскі злоты	871,80
1 расійскі рубель	87,89
1 украінская грыўня	425,44

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,5092
10 UAH	48,2873
1000 BYR	11,3587
EUR	35,8398

Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.12.2007 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

10 000 РУБЛЁЎ ЗА КВІТОК НА ГАРАДСКІ АЎТОБУС?

Калі ў аўтобусе ў чарговы раз прыемным жаночым голасам нагадалі, што льготныя квіткі будуць сапраўдныя толькі да 16 снежня ўключна, я машынальна зірнуў на мабільнік, зверыўся з календаром і падумаў — то ж на наступным тыдні ўжо! І пачаў шарыць па сваіх кішэнях у пошуках ільготнага квітка: мо які заваляўся, дык трэба скарыстаць. Грошы, канешне, невялікія, але ўсё роўна шкада, калі прападуць. І што вы думаеце, знайшоў адзін квіток, ды не просты, а наміналам ў «10 000» беларускіх рублёў!

Не, я не памыліўся — на ім так і напісана: «Білет на адну паездку. Трамвай, аўтобус, тралейбус. 10 000 руб. МІНСК». Нават памятаю, як ён да мяне патрапіў. Калісьці браў я інтэрв'ю ў кандуктара тралейбуса, цікавай і абаяльнай, дарэчы, жанчыны. Ну й паколькі яна працуе на адным і тым жа маршруце, а я там раз-пораз катаюся...

— Ой, я вам такую гісторыю раскажу зараз! Заходзіць, значыць, адзін раз у тралейбус бабулька. Ну я пытаюся ў яе, што за праезд яна мае. Тая пакорпалася ў кішэнях паліто, знайшла нейкі квіток і мне дае. А я гляджу — нейкі ён незвычайны. На ім сума стаіць: 10 000 рублёў. Аказваецца, бабулька апранула старое паліто, якое невядома колькі часу ў шафе пылілася з гэтым квітком у кішэні. Так мне гэты дзесяцітысячны «рарытэт» бабулька і падарыла.

Вызначыць жа дакладны час, калі хадзілі такія квіткі, мне дапамаглі спецыялісты КУП «Мінсктранс». Аказваецца, з 1 жніўня 1999 года поўны квіток стаў каштаваць 10 000 беларускіх рублёў, а льготны — 5 тысяч. Во! Значыць, той экзэмпляр, што трапіў мне ў рукі, якраз з 1999 года. Але не думайце, што 10 000 — гэта мяжа цаны за квіток! З 10 лістапада 1999 года кошт праезду падаражэў удвая — і поўны квіток у Мінску можна было набыць за 20 тысяч рублёў. Гэтую суму перавысіць не ўдалося, бо 1 студзеня 2000 года адбылася дэнамінацыя — ад «зайчыка» адкінулі тры нулі. І во, з 20 рублёў у 2000 годзе кошт поўнага квітка вырас да 600 рублёў у 2007 годзе. А пачыналася ўсяго з 5 капеек у 1990 годзе...

Дарэчы, у «Агенцтве КУП «Мінсктранс» вядзецца спецыяльны альбом, дзе транспартнікі збіраюць калекцыю квіткоў сталіцы ды, па магчымасці, іншых гарадоў. Займаюцца, калі можна так выказацца, перыдрамафіліяй, гэта значыць — калекцыянаваннем квіткоў. І па гэтаму альбому, скажу я вам, можна цэлую гісторыю квіткоў у Мінску напісаць. Ну вось, напрыклад, ці ведаеце вы, што:

◆ *у чэрвені 1960 года было вырашана, што ўзровень свядомасці мінчан — будаўнікоў камунізму — стаў дастаткова высокім, і ў тралейбусах з'явілася каса-скарбонка. Кідаеш туды манетку — і адрываеш квіток ад доўгай стужкі...*

◆ *у 1972 годзе ў беларускай сталіцы ўпершыню з'явіліся кампосцеры, а на прыпынках — кіёскі з квіткамі. Дарэчы, Мінск першым у СССР перайшоў на квіточную сістэму праезду ў грамадскім транспарце. Як думаеце, можа з тых часоў і пачалі з'яўляцца так званыя «зайцы»?*

◆ *недзе да 1992 года на праязных быў напісаны наступны тэкст: «Войдя в салон предъявите билет водителю или пассажирам». Правільна! Калі таму вадзіцелю праязныя ў кожнага разглядваць? А пасажырам усё роўна доўга ехаць, вось хай і не сумуюць, праязныя адзін у аднаго пытаюць! Мо трэба вярнуць гэтае правіла?*

◆ *з 1 сакавіка 1995-га былі ўведзены дэкадныя праязныя білеты, з 1 лютага 1996 года з'явіліся ў продажы блокі квіткоў (15 штук каштавалі як 13 адзіночных, а 2 былі ў якасці «бонуса»), а 7 верасня 1995 года на праязных сталі пісаць замест «студэнцкі» — «ільготны». Здаецца, калі той 95-ы год быў, ажно не: мне сёлета сяброўка з Гомеля праязны на тралейбус паказала, дык там так і напісана: «месячный билет для студентов». Гэта проста гомельскія транспартнікі бланк мо з якіх васьмідзесятых гадоў выкарысталі!*

◆ *у кастрычніцкім розыгрышы рэкламнай гульні «Шчаслівы білет» былі разыграны 5 «залатых білетаў», якія давалі права іх шчаслівым уладальнікам на працягу ўсяго года з 1 лістапада 2004 года па 1 лістапада 2005 года бясплатна ездзіць на ўсіх відах наземнага транспарту.*

Ці калекцыянуе хто квіткі акрамя «Агенцтва КУП «Мінсктранс», спытаеце вы? Так, сапраўды, такія людзі на Беларусі ёсць. Некаторыя займаюцца гэтым больш сур'ёзна, некаторыя — менш. Хтосьці нават абменьваецца з перыдрамафіламі іншых краін. А і праўда, скажаш каму, што, маўляў, манеты збіраю, дык суразмоўца і не здзівіцца. А калі — «квіткі калекцыяную», то можа і пазайздросціць, убачыўшы каляровыя паперкі з Масквы, Варшавы ды Парыжа...Вось і я, пакуль шукаў інфармацыю пра «дзесяцітысячны» квіток, вырашыў паспрабаваць невялічкую калекцыю білецікаў ды праязных назбіраць. І, дарэчы, невялікі пачак розных білецікаў сабраўся — што ў сябе знайшоў, што сябры падарылі. Бо не можа такога быць, каб у чалавека пасля вандроўкі, напрыклад, за мяжу, не завалялася ў кішэнях квітка з грамадскага транспарту. А зараз во пераглядаю сваю сціплую калекцыю, ды думаю, куды яе падзець, калі маё калекцыянаванне не перарасце ў хобі. Выкідваць жа шкада. Мабыць, калі надакучыць, то трэба будзе зрабіць падарунак «Агенцтву КУП «Мінсктранс», папоўніць іх калекцыю, каб не знікла бясследна жыццё майго пакалення, захавалася хоць бы і праз такую дробязь, як квіткі на грамадскі транспарт.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ПРАЗ ГРАНІЦУ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

У Беларусі з 22 снежня 2007 года ўступае ў сілу новы ўказ № 503 «Аб ільготным перамяшчэнні праз мытную граніцу тавараў для асабістага карыстання». Гэты дакумент зацвярджае Палажэнне аб ільготным парадку перамяшчэння тавараў для асабістага карыстання і спрошчаным парадку іх мытнага афармлення, якое рэгламентуе ўвоз у Рэспубліку Беларусь фізічнымі асобамі ў спрошчаным парадку тавараў і транспартных сродкаў для асабістага карыстання.

Чым была выклікана неабходнасць распрацоўкі і прыняцця гэтага дакумента? Якія змяненні для ўвозу тавараў і транспартных сродкаў ён прадугледжвае? На гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнта БЕЛТА адказала галоўны інспектар упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Кацярына Таранава.

Палажэнне прадугледжвае змяненні ў парадак увозу тавараў і транспартных сродкаў. У прыватнасці, з 22 снежня будзе зменшана норма бяспошлconsidнага ўвозу тавараў для асабістага карыстання з 50 да 35 кг коштам да 1 тыс. еўра. Гэта абумоўлена частковай уніфікацыяй з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі. Гэта абмежаванне па вазе адпавядае таксама дзеючым нормам правозу багажу ў разліку на аднаго чалавека: па чыгунцы — 36 кг, у самалёце — ад 20 да 35 кг у залежнасці ад авіякампаніі.

Акрамя іншых тавараў для асабістага карыстання фізічная асоба мае права ўвозіць без выплаты пляжоў 200 штук цыгарэт або 200 г тытунёвых вырабаў, 5 ювелірных вырабаў, прадукты харчавання: з краін СНД з 1 чэрвеня па 31 кастрычніка — 30 кг на чалавека, у іншы перыяд — 5 кг, з іншых краін — 5 кг незалежна ад пары года. Таксама прадугледжваецца бяспошлінны ўвоз не больш як 2 л алкагольных напіткаў. Раней названая норма складала не больш як 1 л, дадаткова бяспошлінна можна было ўвезці 1 л піва. Піва з 22 снежня будзе адносіцца да алкагольных напіткаў у выпадку, калі масавая доля этылавага спірту ў ім складае 7 і больш працэнтаў. Адпаведна, калі масавая доля этылавага спірту складзе менш як 7 працэнтаў, піва будзе ўвозіцца як звычайны тавар (бяспошлінна, калі агульная вага ўсіх тавараў, што перамяшчаюцца, складзе не больш як 35 кг, а кошт — не больш як 1 тыс. еўра). У адпаведнасці з новымі нормамі мэбля разглядаецца як звычайны тавар для асабістага карыстання.

Без выплаты мытных плацяжоў могуць увозіцца ў Беларусь былыя ва ўжытку тавары для асабістага карыстання, згодна з устаноўленым палажэннем пералікам, увозімыя нерэзідэнтамі, незалежна ад іх мытнага кошту і вагі, а таксама свойскія жывёлы, у тым ліку прызначаныя для палявання, спорту, турызму. Таксама ў краіну бяспошлінна можна ажыццяўляць увоз так званага «запасу аўтамабіліста» — запасных частак, якія па правілах дарожнага руху павінны знаходзіцца ў транспартным сродку і могуць спатрэбіцца для дробнага рамонту ў дарозе. У яго ўваходзяць знак аварыйнага спынення, домкрат, два проціадкатныя ўпоры, запасное кола, ручны інструмент для зняцця і ўстаноўкі колаў, трос, 5 лямпаў для знешніх светлавых прыбораў і плаўкія засцерагальнікі. Усе астатнія запчасткі будуць абкладацца мытнымі плацяжамі. Прычым пад імі разумеюцца любыя часткі, агрэгаты і прылады да транспартных сродкаў, а таксама шыны, як новыя, так і былыя ва ўжытку.

Спецыяліст праінфармавала, што з 22 снежня ўводзіцца новая норма, у адпаведнасці з якой рэзідэнты Беларусі, якія пражывалі за мяжой і знаходзіліся на консульскім уліку не менш як год, пры зняцці з такога ўліку могуць бяспошлінна ўвезці тавары (акрамя транспартных сродкаў, кузаваў і прычэпаў) коштам да 5 тыс. еўра. Вагавых абмежаванняў пры гэтым не прадугледжана.

З пераліку тавараў, што абкладаюцца мытнымі пошлінамі, падаткамі пры ўвозе выключаны пыласосы, відэазапісваючая і відэаўзнаўляльная апаратура. Гэта абумоўлена тым, што большасць грамадзян пры выездзе на адпачынак бяруць з сабой відэакамеры, якія пры ўвозе абкладаюцца мытнымі пошлінамі і падаткамі, калі іх не прадастаўць да мытнага афармлення пры вывазе. З мэтай выключэння канфліктных сітуацый і паскарэння праходжання мытнага кантролю турыстамі гэта пазіцыя выключана.

З катэгорый транспартных сродкаў, адносна якіх сума належных да выплаты мытных пошлін, падаткаў вылічаецца ў залежнасці ад года выпуску і аб'ёму рухавіка, выключаны матоды і мотаролеры, г.зн. транспартныя сродкі, аб'ём рухавіка якіх складае менш як 50 куб. см. Пры іх увозе неабходна будзе выплаціць адзіную стаўку — 50 еўра. З катэгорыі транспартных сродкаў, якія могуць увозіцца па адзінай стаўцы ў льготным парадку, выключаюцца пасажырскія мікрааўтобусы.

Новы дакумент таксама прадугледжвае павелічэнне ставак мытных пошлін на некаторыя катэгорыі тавараў. У прыватнасці, у два і чатыры разы адпаведна да 4 еўра за 1 кг павышаны стаўкі на будаўнічыя матэрыялы і сантэхнічнае абсталяванне. На газавыя і электрычныя кухонныя пліты, выцяжкі, кухонныя камбайны, мікрахвалевыя печы стаўкі выраслі прыкладна на 15—20 еўра. На астатнія групы тавараў яны захаваны.

З уступленнем у сілу дакумента пры абкладанні мытнымі пошлінамі і падаткамі ювелірных вырабаў будуць прымяняцца адзіныя стаўкі. Так, на вырабы з серабра пашыраецца стаўка 10 еўра, золата і плаціны — 50 еўра, вырабы з каштоўнымі камянямі незалежна ад металу — 200 еўра за адну адзінку.

Цяпер у міжнародных паштовых адпраўленнях забаронена перасылка алкагольных напіткаў і тытунёвых вырабаў. Але з 22 снежня можна будзе перасыльаць да 2 літраў алкагольных напіткаў, 200 цыгарэт або да 200 г тытуню. Норма бяспошлінная ўвозу тавараў у міжнародных паштовых адпраўленнях павялічана са 100 да 120 еўра. «У выпадку, калі ў паштовых адпраўленнях перасылаюцца ювелірныя вырабы коштам больш як 120 еўра, то яны будуць абкладацца па адзіных стаўках», — адзначыла спецыяліст.

Што датычыцца мытных пошлін, падаткаў на ўвозімыя транспартныя сродкі, то памеры адзіных ставак захаваны на ўзроўні дзеючых. Таксама захоўваюцца павышаныя стаўкі для транспартнага сродку, які паўторна прадастаўляецца па мытнага афармлення на працягу каляндарнага года. Аднак калі раней павышаная стаўка пашыралася на другі і наступныя ўвозімыя транспартныя сродкі самой асобай, або ў яе адрас, гэта значыць улік вёўся па асобах, якія з'яўляюцца ўласнікамі, то з моманту ўступлення ўказа ў сілу пры абкладанні мытнымі пошлінамі і падаткамі ювелірных вырабаў будуць прымяняцца павышаныя стаўкі мытных пошлін, падаткаў, будзе разглядацца другі прадстаўлены да мытнага афармлення. Такім чынам, асобам, якія ажыццяўляюць дастаўку транспартных сродкаў па даручэнню асобаў, якія не выязджалі для іх набыцця за мяжу, так званым перагоншчыкам, необходна будзе самастойна прадставіць увозімыя транспартныя сродкі да мытнага афармлення ў пагранічным або ўнутраным пункце мытнага афармлення, і ім давядзецца выбіраць, увезці адзін транспартны сродак па нізкіх стаўках для сябе або для іншай асобы. Чакаецца, што гэта норма падштурхне асобаў, якія займаюцца такім бізнэсам, перайсці ў легальнае прававое поле і ўтварыць юрыдычную асобу або зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Атрымаўшы такі статус, перагоншчык зможа ўвозіць любую колькасць аўтамабіляў у год з выплатай мытных пошлін, падаткаў па ўстаноўленых стаўках і афармляць іх на сябе як на юрыдычную асобу. Стаўкі мытных пошлін, падаткаў на першы транспартны сродак, што прадастаўляецца да мытнага афармлення фізічнай асобай, і на неабмежаваную колькасць транспартных сродкаў, увозімых юрыдычнымі асобамі, з'яўляюцца аднолькавымі.

БЕЛТА.

(Працяг будзе.)

КАМЕНТАРЫЙ

Фота Пятра ФАМІНА.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне першаму намесніку міністра Ананіч Ліліі Станіславаўне з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні першаму намесніку міністра інфармацыі Ананіч Ліліі Станіславаўне з прычыны напаткаўшага яе непапраўнага гора — смерці МАЦІ.

Спорт-тайм

Касціцын-малодшы дэбютаваў у НХЛ

Беларускі хакеіст Сяргей Касціцын дэбютаваў у НХЛ у асноўным складзе «Манрэаль Канадзіенс» (раней ён выступаў за фарм-клуб «Гамільтан Бульдогс» у АХЛ), ды яшчэ ў першым звяне з капітанам каманды фінам Саку Койву. Стартавы матч у наймацнейшай лізе планеты аказаўся пераможным для 20-гадовага нападаючага (4:1). Цікава, што другую шайбу ў вароты «Філадэльфіі» закінуў старэйшы брат Сяргея 22-гадовы Андрэй Касціцын. Зараз на яго рахунку пяць дакладных кідкоў і сем выніковых перадач.

У «вышку» адправіцца пераможца

У вышэйшы дывізіён маладзёжнага чэмпіянату свету па хакеі з шайбай праб'ецца толькі пераможца групы. Зборная нашай краіны (яна выступае ў дывізіёне 1 у групе «В») ужо двойчы святкавала перамогу ў Латвіі: каманда Андрэя Расолькі выйграла ў французаў (6:1) і венграў (3:2). Наступны паядынак сёння беларусы правядуць супраць славенскіх ігракоў. Таксама давядзецца спаборнічаць з англічанамі і гаспадарамі турніру (16 і 18 снежня).

Пласконны пераходзіць у «Хімкі»

Ігрок салігорскага «Шахцёра» і абаронца нацыянальнай футбольнай зборнай Павел Пласконны будзе выступаць за падмаскоўныя «Хімкі». З расійскім клубам ён заключыў кантракт на тры гады.

Англічане супраць італьянца ў зборнай

Галоўных трэнераў клубаў англійскай прэм'ер-лігі (гэта Гарэт Сатутгейт з «Мідлсбро», Сціў Копел з «Рэдынга» і Марк Х'юз з «Блэкберна») засмуціла назначэнне на пасаду галоўнага трэнера футбольнай зборнай Англіі італьянскага спецыяліста Фабіо Капэла. Настаўнікі перакананы, што каманду іх краіны павінен узначальваць англічанін.

Капітанам не шанцуе



Невядомыя абрабавалі ў Вялікабрытаніі дом капітана «Ліверпуля» Сцівена Джэрарда, калі ён удзельнічаў у выязным матчы групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў супраць «Марселя». На шчасце, зладзеі нічога не ўчынілі жонцы Джэрарда, якая знаходзілася ў доме, а толькі забралі яе ўпрыгажэнні. Пацярпеў і капітан зборнай Расіі Андрэй Аршавін (*на фота — № 10*). Еўрапейскі саюз футбольных асацыяцый дысквалiфікаваў яго на два матчы за ўдар саперніка ззаду ў адборачным матчы да Еўра-2008 супраць каманды Андоры. Такім чынам, Аршавін не згуляе ў фінальнай частцы чэмпіянату Еўропы супраць іспанцаў і грэкаў, а выйсці на поле зможа толькі ў сустрэчы са шведамі. Праўда, галоўны трэнер расіян Гус Хіддзінк у адным з інтэрв'ю сказаў, што яму патрэбны толькі футбалісты, якія змогуць згуляць ва ўсіх матчах, а значыць, Аршавін можа наогул не быць уключаны ў склад каманды.

Пераможца Лігі чэмпіёнаў — наймацнейшы ў свеце?

У фінале клубнага чэмпіянату свету па футболе ў Японіі (16 снежня) сустрэнуцца італьянскі «Мілан», які не пусціў у галоўны матч гаспадароў, японскі клуб «Урава Рэд Даймандс», (1:0), і аргенцінскі «Бока Хуніёрс».

Перад прэм'ерай

Чацвёра за аднаго

Чатыры артысты будуць іграць аднаго героя ў новым спектаклі тэатра імя Янкі Купалы. Гэта толькі ў кіно лёгка зрабіць так, каб славуты Труфальдзіна з Бергама паспяваў усё. У нас усё будзе зусім не так, як у любімым многімі фільме з Канстанцінам Райкіным. Але ведаеце, што прыемна: у Купалаўскім тэатры ёсць не адзін артыст, які можа яскрава ўвасобіць вобраз хітрага служкі! Сустрэча з ім у Мінску адбудзецца 16 снежня — на гэты дзень запланаваная прэм'ера спектакля «Слуга двух гаспадароў» паводле Гальдоні. Прыемная сустрэча напрыканцы года, калі кожны з нас павінен паспяваць вельмі шмат і сапраўды не за дваіх, а можа нават за чацвярых... Гэты спектакль стаў сумесным беларуска-шведскім праектам. Італьянскую камедыю на сцэне галоўнага тэатра Беларусі ставіць шведскі рэжысёр Аляксандр НАРДШТРЭМ, з якім мы сустрэліся напярэдадні прэм'еры.

— Што новага даведаюцца беларускія гледачы пра Труфальдзіна? Чым можа здзівіць гэты спектакль?

— На мой погляд, новае — гэта заўсёды пападанне ў сёння. Ён успрымаецца новым, калі ёсць рэзанансны ефект: супаў з думкамі гледачоў, патрапіў у настрой. Вось чаго хацелася б дасягнуць. Наконт навізны я думаю так: у тэатры нічога новага быць не можа, у тэатры ўжо ўсё было, тэатр паспрабаваў самыя розныя формы, іх насамрэч не так і многа. Новае можа нарадзіцца тады, калі тэхнічна і тэхналагічна нешта мяняецца, напрыклад, калі з'яўляюцца і прыходзяць у тэатр камп'ютарная графіка, нейкія тэхнічныя магчымасці. Але драматычны тэатр гэтымі сродкамі ўсё роўна карыстаецца дастаткова рэдка. Цэнтр увагі драматычнага тэатра — гэта акцёр і яго духоўныя перажыванні. Ніякая тэхніка ні замяніць, ні нават узмацніць іх не можа — калі гэтага няма, то яго няма.

— Вы нарадзіліся ў Пецярбургу, цяпер з'яўляецеся грамадзянінам Швецыі і актыўна ставіце спектаклі ў Беларусі. Вас прываблівае наша краіна?

— Я актыўна ставіў спектаклі ў многіх краінах. За гэты год у мяне будзе ўжо пяты спектакль. З іх два ў Пецяргургу, адзін у Швецыі. І ў Беларусі я супрацоўнічаў сёлета з операй і Нацыянальным драматычным акадэмічным тэатра імя Янкі Купалы. Так, мяне прываблівае праца ў Беларусі. Асабліва ў оперы — тут я адкрыў харство гэтага жанру. Для мяне гэта новы жанр, я сам шмат чаму вучуся. Сёлета дзве оперы ў вас паставіў. У Купалаўскім тэатры гэта будзе ўжо другая па ліку сумесная праца. Першая была на Малой сцэне — «Маналог».

— Як гэты праект нарадзіўся?

— Гэта сумесная ідэя. Першы спектакль прапанаваў я, таму што на той момант жыў у Беларусі і ўдзельнічаў у сумесным беларуска-шведскім культурна-тэатральным праекце «Тэатр у турме». Тады і прапанаваў тэатру зрабіць спектакль на добраахвотных асновах. Валерый Мікалаевіч Раеўскі пайшоў на рызыку — ён мяне мала ведаў — і пагадзіўся. Я яму за гэта ўдзячны. Мы зрабілі спектакль, які прыйшоўся даспадобы. З майго боку ўзнікла ідэя пастаноўкі Гальдоні, таму што італьянскі тэатр мне блізкі, я яго люблю. І ў Купалаўскім тэатры не было Гальдоні, камедыі не з'яўляліся вельмі даўно. А гэтая п'еса ўвогуле не ставілася дагэтуль.

— Акцёры з энтузіязмам адрэагавалі на гэтую пастаноўку?

— Не магу сказаць, што з вялікім энтузіязмам. Гэта было для мяне вялікай нечаканасцю. Таму што ёсць п'еса «Слуга двух гаспадароў», і не трэба мяне пераконваць, што гэта добры матэрыял. Гальдоні сам за сябе гаворыць. Ён пражыў многіх і перажыве яшчэ многіх, будзе жыць вечна. Таму дзіўна, калі ўзнікае недавер... Падкрэслю: недавер да рэжысёра заканамерны, ён заўсёды ёсць, асабліва да новага чалавека. Гэта нармальна. Акцёры — людзі трапяткія, у іх шмат залежыць ад адносінаў, ад настрою. У тэатры імя Янкі Купалы вельмі моцная трупа, з якой працаваць цікава. Думаю, што добрым акцёрам Гальдоні павінен падабацца і павінна быць жаданне гэта сыграць.

— Каб прызначаць акцёраў на ролі, трэба ведаць патэнцыял людзей. Як вы вызначалі, хто будзе Труфальдзіна?

— Я раіўся з мастацкім кіраўніком тэатра. Ролю Труфальдзіна ў нас іграюць чатыры акцёры. Я думаю, што чацвёра разам яны здужаюць усё. Тое ж самае з роляй Эсмеральдзіны — у нас на яе чатыры актрысы. Што датычыцца ўсіх астатніх персанажаў: тое, што мы вырашылі сумесна з Раеўскім, патрапіла вельмі дакладна. У тэатры ёсць каму іграць усе гэтыя ролі.

— Вы зараз супрацоўнічаеце з тэатрам, які працуе на беларускай мове. Ці не ўзнікаюць з-за гэтага ў вас складанасці, напрыклад, з акцёрамі, якія прамаўляюць свой тэкст па-беларуску?

— Не, мала таго, я адчуваю, што беларуская і руская мова вельмі блізкія. Беларускую мову насамрэч няцяжка разумець, калі гаворыш па-руску, абы было жаданне для гэтага. Я ўсё выдатна разумею, некаторыя фразы тым, на жаль, на постсавецкай прасторы, чым лепшы тэатр, тым больш праблем. Акцёраў выклікаюць на здымкі, на тэлебачанне, там ім лепей плацяць, узнікаюць іншыя творчыя і камерцыйныя інтарэсы. Іх асабістае стаўленне да тэатра мяняецца. Дзякуй Богу, што гэта датычыцца не ўсіх. Ёсць цудоўныя акцёры, якія ўсё паспяваюць — і там, і тут. Вось як у нашым спектаклі — ён паспяваў служыць двум гаспадарам. Не «халявіў» ні там, ні там, выкладваўся. Калі гаварыць пра сэнс гэтага спектакля для сённяшняга дня: або паспяваў, або не, іншага не дадзена. Інакш ты сам будзеш у пройгрышы. Зразумела, сёння, каб пражыць, трэба працаваць у некалькіх месцах, асабліва маладым. Але гэта праблема не тэатра Янкі Купалы ў прыватнасці, гэта праблема ўвогуле пераходнага перыяду ад таго старога рэпертуарнага тэатра, калі людзі ледзь не жылі ў яго сценах, да тэатра, дзе людзі хочуць зарабляць. Многія тэатры, я думаю, паспрабуюць перайсці на заходнюю сучасную сістэму, калі ставіцца спектакль, запрашаюцца на яго артысты і адыгрываюць яго перад гледачом пэўную колькасць разоў, а потым распускаюць і ўсё. Натуральна, што дзесьці захаваюцца і такія тэатры — нацыянальныя, акадэмічныя, рэпертуарныя, з вялікай трупай. Я абсалютна ўпэўнены, што Купалаўскі тэатр захаваецца і будзе жыць па сваіх законах.

— Што яшчэ вы б хацелі паставіць у Беларусі?

— Пасля прэм'еры 16 снежня я з'язджаю, і на гэтым пакуль усё. У мяне шмат працы ў розных краінах. Я яшчэ вельмі хацеў бы вярнуцца ў оперу. З драматычным тэатрам трэба ўзяць тайм-аўт. Зрэшты, самае галоўнае — якім атрымаецца гэты спектакль. Глядач прыйдзе на камедыю, і калі яму будзе смешна, калі яму будзе добра, і нават нейкія думкі пасля гэтага спектакля ўзнікнуць, значыць, у нас атрымалася.

Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.

Пять цифр
и вся информация
ВАША!
подписной индекс
63851
"ЗНАМЯ ЮНОСТИ"
в новом формате

ПРЫНЦЫП ПАВАРОЦІ

Зімовыя зацемкі

Прачытала пра скандальныя чуткі вакол завяшчання вялікага спевака Лучана Паваротті, — дзіўна стала. Ніхто асабліва не ўспамінае, якім геніяльным ён быў спеваком, які рэдкі голас падарыла чалавеку прырода. Італьянскую, ды і не толькі, грамадскасць хвалюе, каму дастануцца мільёны Паваротці: жонцы, з якой пражыў 40 гадоў, і яе дзецям ці былой яго сакратарцы Нікалеце, якая не так даўно стала другой жонкай і паспела нарадзіць дзяўчынку. Вядомы тэнар быў нябедным чалавекам, і пакінуў каля сябе 250 мільёнаў долараў. Але ўсе ведалі, што завяшчанне складзена на карысць маладой і бліскучай Нікалеты. Калі ён цяжка захварэў, яна, як пакорлівая жонка, чакала наканаванага лёсам, праўда, на адлегласці чакала, у далёкай Амерыцы... А пасля смерці папаўзлі чуткі, што Лучана Паваротці змяніў завяшчанне на карысць траіх дачок ад шлюбу з першай жонкай. Адумаўся. Ну, у багатых свае замарочкі, — скажа нехта. Не толькі ў багатых.

У мужа адзін з былых калег трапіў у такі пераплёт! А пачыналася вельмі рамантычна: маладая, прыгожая. Усё перакрэсліў, усё пачаў спачатку. І ўсё як быццам было добра. Потым выпадкова застаў у абдымках маладога. Да банальнасці проста. Але цяпер у чалавека — ні сям'і, ні кватэры, работу паехаў шукаць у блізкае замежжа. Калі б сам малады, а так — узрост, здароўе. Чалавек жа, здаецца, нядрэнны. Усе сябры яму вельмі спачуваюць. Іван Пятровіч, так назавём, любіў прыводзіць прыклад Алега Табакова. Новая сям'я, маладая жонка, вельмі прыгожа жывуць ужо каля дваццаці гадоў, і калі меркаваць па інтэрв'ю Алега Табакова і Марыны Зудзінай, вельмі шчаслівыя. Іван Пятровіч гаварыў, што Табакоў увасабляе сабой чалавека будучыні. Ёсць нейкая тэорыя наконт таго, што ў будучыні, калі прагрэс чалавецтва не спыніцца якой-небудзь катастрофай, працягласць жыцця рэзка ўзрасце, і нашы нашчадкі змогуць некалькі разоў мяняць прафесію і род дзейнасці, некалькі разоў заводзіць сям'ю.

Можа яно так і будзе, але жывём мы ў веку 21-м. І ці варта спрабаваць паўтараць эксперымент, калі ў некага атрымалася, лепш за ўсё спытаць у Івана Пятровіча. Але ён зараз далёка ад Беларусі. Тут мяне могуць абвінаваціць у чэрствасці, маўляў, святыя пачуцці эксперыментам называе. Не, я не супраць святых і вялікіх. У вяках засталося, як рускі дыпламат кацярынінскай эпохі Мікалай Разанаў з першага позірку закахаўся ў юную дачку губернатара Каліфорніі. Потым пра гэта паэмы, оперы склалі. Невядома, як расійска-амерыканская гісторыя пайшла б далей, калі б тое каханне адбылося... Але я пра другое. Пра рамантыку і прозу жыцця.

Не, эксперыменты таксама могуць быць. Але ўдаюцца яны найчасцей багатым. Як яшчэ назваць гісторыю, што гадоў колькі таму ўзахлёб апісвалі многія газеты? Адзін генерал-губернатар, які паспеў пабываць нават віцэ-прэзідэнтам, сваткаваў дзень народзінаў маладой жонкі. Для балю быў зняты цэлы санаторый, а яго адпачываючыя выселены. Ноччу, каб кінуць да ног каханай мільён пунсовых ружаў, у паветра падняўся самалёт-знішчальнік. Дзве тоны галандскіх найсвяжэйшых кветак грымнуліся вобзем з вышыні. Добра яшчэ, што ніхто не трапіў выпадкова пад «груз кахання», а то стаў бы незнарок «грузам-200». Генералу, што заяваў у Афгане, вядома, што гэта такое. Але ж чаму не пазабавіцца, калі, як у той песні, «усё ў тваіх руках»?

Калі ж «усяго» няма (ну хоць бы пары кватэр, пары дзесяткаў тысяч валюты для ўрэгулявання маёмасных канфліктаў), то трэба моцна думаць. Ды і не адной маёмасцю, відаць, можна адкупіцца ад таго, што з жыцця не выкінеш, калі пражыта яго большая частка. На вакзале неяк купіла газетку ад зусім няма чаго чытаць. Аказалася выданнем, у якое сентыментальныя паненкі дасылаюць свае аповеды. Зачыталася адной з іх. Аўтарка там выстаўляе сябе вялікай гуманісткай. Сапраўды, рэдкі выпадак фіналу тыповай гісторыі. Сталы выкладчык сышоў да маладой студэнткі. У іх нарадзілася дзіця, была шчаслівая сям'я. А потым былая жонка захварэла на рак. Калі ёй стала дрэнна, муж з новай жонкай забралі яе да сябе і даглядалі. Аўтарка распавядае, якой цікавай жанчынай аказалася яе папярэдніца, які духоўна багаты, з высокім інтэлектам чалавек, як многаму маладая навучылася ў сталай. Дзяўчаці, якое так і цешылася сваёй чуласцю і гуманізмам, вядома, і ў галаву не прыходзіла падумаць, чаму тая, сталая, захварэла. Анколагі зараз адной з найгалоўнейшых прычын раку называюць стрэсы, перажыванні. Не задумалася, і гэта зразумела: у маладосці ёсць свой натуральны эгаізм, абумоўлены маладосцю. Але цікава было б даведацца, што думае пра гэту гісторыю чалавек, які быў яе галоўнай дзеючай асобай? Ці мог бы ён сабе ўявіць тое, як яго, старога і нямоглага, даглядала б яго каханая ўжо з маладым мужам? Калі той захоча, вядома.

На такія рэчы ў кожнага свая гісторыя і свая праўда... Учора перачытвала інтэрв'ю Вікторыі Токаравай з нагоды яе юбілею і падкрэсліла цэлы абзац, дзе пісьменніца гаворыць пра жыццё з мужам, калі яна ўжо стала вядомай, а ён быў радавым інжынерам: «Я думаю, ён пакутаваў па першым часе, пакуль не прывык. Потым махнуў рукой. Хутчэй за ўсё, у глыбіні душы марыў сустрэць другую жанчыну — адданую, верную, але, відаць, не сустрэў і застаўся са мной. Я ў глыбіні душы шукала некага ярчэйшага, цікавейшага, але таксама не знайшла і засталася з ім. І зараз мы гэтаму вельмі рады. Калі гульні згуляныя, гэта так добра, што захаваная сям'я. Таму што сям'я — там, дзе агульныя дзеці, потым унукі».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Забытае? Новае? Вечнае!

Калі надыходзіць Калядная ноч?

Такое пытанне задала нам Любоў Мікалаеўна з г. Жыткавічы Гомельскай вобласці. Каб адказаць на яго, зробім невялікі, але абавязковы ў гэтым выпадку, экскурс у гісторыю фарміравання беларускага народна-хрысціянскага і грамадзянскага календара.

Старажытны славянскі каляндар (у тым ліку і беларускі) фарміраваўся ў цеснай суаднесенасці з прыродна-касмічнымі рытмамі і цыкламі. Самым галоўным фактарам аказаўся гадавы рух Сонца па нябасхіле. Поўны цыкл абарачэння Зямлі вакол Сонца атрымліваў у сабе чатыры найважнейшыя падзеі: зімовае сонцастаянне, веснавое і асенняе раўнадзенствы, летні сонцаварот. У поўнай адпаведнасці з імі славяне пачалі адзначаць свае самыя галоўныя святы: Каляды — Купалле, Ярылаў Вялікдзень і восеньскі Багач. Гэта былі фазавыя святы, а ў роўных прамежках паміж імі адзначалі яшчэ чатыры святы, якія фіксавалі пераходны стан прыроды ад адной пары года да іншай. Паміж зімой і вясной — Масленіцу, вясной і летам — Зялёныя святы (Сёмуху), летам і восенню — багатыя і складаныя абрады Жніва, восенню і зімой — Восеньскія Дзяды.

Аднак у перыяд з 988 г. па канец XIV ст. на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян (беларусы, рускія, украінцы) паступова пачынае распаўсюджвацца царкоўна-хрысціянскі каляндар, структурную аснову якога складаў старажытнарымскі каляндар, а вось месца Сонца заняў жыццяпіс зямнога і нябеснага існавання Хрыста, а таксама святы ў гонар Багародзіцы. Змяніўся аб'ект ушанавання — пакланення, але ключавая ідэя засталася той самай.

З 18 па 23 снежня ў прыродзе ўсталёўваўся непрацяглы перыяд уяўнай раўнавагі (дзень і ноч не павялічваліся і не памяншаліся), а вось у ноч з 24 на 25 снежня Нябеснае Сонца паварочвала «на лета» — пачынаўся новы цыкл прыроднага існавання, і адпаведна — у жыцці людзей. Нашы продкі, якія абагаўлялі бога Сонца, якраз у гэты час і адзначалі «перанараджэнне» бога жыццядайнай энергіі, а свята ў гонар маладога Сонца атрымала назву Каляды. У 325 г. на Нікейскім саборы мудрацы пад патранажам Канстанціна Вялікага выпрацавалі свой алгарытм напластавання хр

Толькі ў «Звяздзе»

ГАЗЕТНЫ СЕРЫЯЛ «ЖАНАЦІКІ»

Вяселле я згуляў бы яшчэ некалькі разоў, натуральна, з сабой, любімым, у галоўнай ролі. Калі кажу аб гэтым сваёй ужо жонцы, яна неяк на мяне глядзіць дзіўнавата, затое ўсім сябрам задума падабаецца. Бо свята пачатку сямейнага жыцця мяне, напрыклад, вельмі ўразіла. Безумоўна, галоўная жаночая роля ў другім і трэцім вяселлі належала б маёй сённяшняй жонцы. Трэба пачынаць рэпетыцыі. Таму што час праляцеў неяк занадта хутка: рыхтуешся-рыхтуешся, і раптам пам, пам, парам-пам-пам-пам — гучыць марш Мендэльсона. І ўсё, ты ўжо з пярсцёнкам на пальцы. Спрытнасць рук і ніякага махлярства. Нагадаем, паважаныя чытачы, што на мінулым тыдні я меў гонар (ці, можа, глупства, як запэўніваў мяне за пяць хвілін да роспісу сяброк юнацтва Вацлаў) зарэгістраваць шлюб.

Пячатка ў пашпарце стаіць, і, акрамя вялікага задавальнення ад пройдзенага шляху, нейкі лёгкі смутак на душы. Такі, ведаеце, рамантычна-настальгічны: «Ах, мой мілы Аўгусцін, усё прайшло, прайшло, прайшло». Наперадзе ўсё жыццё трэба з гонарам пераадольваць цяжкасці і нягоды армейскіх... цьфу, сямейных будняў.

Якія, дарэчы, маглі не адбыцца. Бо вяселле я амаль што адмяніў. Перад самым ЗАГСАм. Цікава, што б адбылося пасля таго, калі б жаніх аб'явіў, што шлюбу не будзе? З кім з чытачоў такое здарылася — паціскаю вашу мужную руку. А астатнім скажу, што не трэба асуджаць неабдумана, лепш паставіць сябе на месца чалавека. Мой выпадак, напэўна, прэтэндаваў на тое, каб трапіць у Кнігу рэкордаў Гінэса. Як унікальная прычына адмены вяселля. Усё было банальна і смешна, як заўсёды ў бязвыйсцевых сітуацыях. Бо ў дзесяць гадзін раніцы, калі да выкупу нявесты застаецца ўсяго — нічога, знікае наш кот. Хто не чытаў мінулы суботні нумар «Звязды», патлумачу: не проста кот, а Яго Высокасць Кот Марцін. Які даўно ўжо стаў паўнапраўным членам нашай сям'і, маленькім дзіцяткам, любімай, не паварочваецца рука, істотай. Калі тлумачыць далей: у яго ёсць уласны гардэроб і нават мадэльер адзення, перасоўная сумка, некалькі домікаў і ляжанак, тры мяхі рознага корму, якія не ўлазяць у кухонную шафу, уласны вялікі «чалавечы» ложак, і, напэўна, дзесяткі тры цацак, і яшчэ больш медалёў і ўзнагарод. Вядома ж, мы не маглі пакінуць яго дома — а раптам яму стане страшна? Ён бы хадзіў па кватэры і жалобна мяўкаў, няшчасны і адзінокі... (Адчуванне такое, што калі яго эксцэнтрычныя паводзіны не спыняцца, наступныя разы ён таксама рызыкуе стаць галоўным героем нашага сямейнага серыяла.) Таму павезлі яго на вяселле.

Дык вось, знік ён з верхняга пакоя вялікага двухпавярховага катэджа бабулі, з месца, за якім сачылі дзесяць пар вачэй, дзе ў прынцыпе немагчыма схавацца нават маленькаму хамяку. Ведаючы яго няўрымслівы характар, магчымасць таго, што ён выбег на вуліцу, была вялікая. Бо шукалі яго дзесяць чалавек. Спачатку я адзін, а потым бабуля нявесты, мае мама, тата, сястра, стрыечны брат, госці, суседка... Шукалі на працягу дзвюх гадзін, кожны ўзяў на сябе па пакою, а потым мяняліся месцамі. Ката не было. Калі да пачатку вяселля засталося паўгадзіны, я абвясціў, што свята не будзе, пакуль не пададуць мне ката, жывога і цэлага. Таму што ў белым касцюме (колер гэты пачалі ў магазінах адзення называць «колерам жаніха») я аблазіў усе шчыліны, гарышча і пад лесвіцай, пад ваннай, у сабачай будцы на вуліцы, у закутку, дзе стаіць ацяпляльны кацёл. Павыкідваў, не разбіраючы, рэчы з зачыненых дагэтуль шафаў і кнігі на паліцах... Бо ўявіў, што нявеста, як і было задумана, пажадае мець фатаздымак з любімым катом. І што я скажу? Скончыліся пошукі тым, што дзядуля маёй Ганначкі са зламанай нагой (дарэчы, менавіта з-за гэтай акалічнасці вяселле праходзіла ў Мар'інай Горцы) узняўся на крутой лесвіцы на другі паверх і самастойна абмацаў усе пакоі.

Ката не знайшлі. Тады мужчынская логіка ўзяла верх над трапяткім сэрцам, і задумалі мы хітры план. З першых хвілін сямейнага жыцця я ўжо пачаў падманваць жонку. Прынамсі, гэтым можна карыстацца, як было даказана тым жа вечарам. Вось яна, хлусня ў выратаванне ў чыстым выглядзе. Мы не сказалі маёй каханай, што Марцін прапаў і, магчыма, збег з дому. Замест гэтага праграма вяселля была зменена, і на фота з любімым коцікам часу раптоўна не засталося. На роспіс я пайшоў, дакладней, мяне павялі, сціснуўшы зубы і з радаснай усмешкай. На пытанні, як там Марцыпанчык, я прамаўляў скупое «нармальна». А наступнай раніцай мне трэба было расказаць жонцы аб тым, што кот знік...

Зараз гучыць непраўдападобна, але ў мяне быў натуральны шок. Давялося нават заліваць яго каньяком (празмернае, а тым больш неразбарлівае ўжыванне спіртных напояў шкодзіць арганізму, і жанікі не выключэнне, памятайце і не бярыце прыклад). Надзейны сродак! Калі, бліжэй да сярэдзіны вяселля, нявесту ўсё ж такі скралі, а мой сведка, каб яе выратаваць, танцаваў стрыптыз пад спевы музыкантаў і апладысменты расчырванелых паненак, навакольныя фарбы пачалі вяртаць сваю былую яскравасць. Я ўбачыў, што гасцям весела і быццам бы ўсё ідзе добра. Кагосьці нават удалося ўгаварыць адмовіцца ад традыцыйнай, як чамусьці усе мяркуюць, вясельнай бойкі (зараз згадаў, што гэтым госцем быў той самы Вацлаў, які перад ЗАГСам угаворваў мяне збегчы, назаўсёды і як мага далей). І гэтак далей. Усім было весела, і радасны балаган і вясельная блытаніна, чаго мы і дабіваліся, атрымаліся.

Таму калі кот у сярэдзіне вечара знайшоўся сам, мне стала зусім добра. Хоць і сыходзілі з вяселля мы самымі першымі — нехай запрошаныя радуюцца і гуляюць да глыбокай ночы без жаніха з нявесты, у іх ёсць іншыя справы. Але ўражанні засталіся самыя цудоўныя. Не ведаю дакладна, чаму некаторыя з маладых стамляюцца больш за ўсіх, у нас такога не было. Але сваю тэорыю на гэты конт я маю. Часам вяселле замест цёплага сямейнага свята ператвараецца ў цырымонію па выкананні абавязковых рытуалаў. Маўляў, як правільна стаць на ручнік ці як з левага боку пад правым вокам зверху завязаць нявесце хустку. І ні ў якім разе не наадварот. А то тады будзе дрэнна. Калі, крый Божухна, пярсцёнак упадзе ў час роспісу, дык хтосьці абавязкова завойкае, маўляў, жыццё будзе нешчаслівым. Ці зазначыць, што цырымонія выконваецца няправільна, вось на іх вяселлі было па-іншаму, мабыць, лепш за ўсіх. І, засяродзіўшыся на выкананні ўсіх гэтых невядома якіх правілаў, смак свята знікае. Бо маладыя думаюць толькі, на колькі кавалкаў разбіць талерку, а не як правесці час у кампаніі сяброў і сваякоў. Таму парада: жаніху і нявесце лепш расслабіцца і атрымліваць задавальненне ад таго, што адбываецца.

Таму першая шлюбная ноч прайшла ў нас без пачуцця стомленасці і так, як у нармальных сучасных маладых — мы грошы, якія нам падаравалі, лічылі да раніцы. Жартую, вядома ж. Грошай мы не лічылі, і ўвогуле забылі пра падарункі да канца другога дня святкавання. Яны захоўваліся ў, як прызначыў тамада, міністра фінансаў, любімай цешчы. А яна, у сваю чаргу, бавіла час з маімі роднымі. Дарэчы, пазнаёміліся яны толькі за два месяцы да свята. І сталі адразу ж сябраваць. Госці казалі, што так бывае не вельмі часта. Не ведаю, так гэта ці не, але ўзаемадносіны паміж цешчай і свекрывёй, як мы паспелі адчуць, адыгрываюць не апошнюю ролю ў жыцці маладой сям'і. Аб гэтым і не толькі аб гэтым — у будучых частках нашай сямейнай хронікі. Новы тыдзень — новыя падзеі. Да сустрэчы ў свежым суботнім нумары газеты.

Мір вашаму дому!

Дзмітрый АЛЬФЕР.

*Аб тым, як праходзіць вяселле на туманным Альбіёне, расказала нам сённяшні госць, **міс Яўгенія ПРАЙС, журналіст, эканаміст з Лондана, Вялікабрытанія.** Яна выйшла замуж тры месяцы таму:*

*— Шлюб у Англіі можна зарэгістраваць не толькі ў дзяржаўным ведамстве (аналаг нашага ЗАГСа. — **Аўт.**), але і ў царкве. Прычым у адным з гэтых месцаў. Вяселле працягваецца не больш чым адзін дзень. Усе сяброўкі нявесты апрануты ў аднолькавыя ўборы, аднаго і таго ж колеру. Сталы круглыя. Звычайна зал упрыгожаны кветкамі, іх вельмі шмат, афіцыянты разносяць адну-дзве стравы. Прынята вяселлі ладзіць тэматычныя, тады і ўборы сябровак і нявесты, і кветкі, і ўпрыгажэнні на стале вытрыманы ў аднолькавым колеры. У мяне было «блакітнае» вяселле, бо гэта мой любімы колер, а ўвогуле больш распаўсюджаныя «ліловыя» і «руковыя» шлюбы. На лімузінах маладыя не ездзяць, бо гэта лічыцца благім тонам. Звычайна заказваюць рэтра аўтамабілі 50—60-х гадоў мінулага стагоддзя.*

— А яшчэ на англійскіх вяселлях госці плацяць за алкагольныя напоі самі! Інакш гаспадары згалелі б, а госці знахабіліся. Моцныя напоі каштуюць у нашай краіне дорага.

МАЯ БРАЗІЛІЯ

Настаўнік геаграфіі на пенсіі атрымаў ад любімых вучняў, якія выраслі і сталі бізнэсменамі, адмысловы падарунак — падарожжа ў Бразілію



ГІСТОРЫЯ З ГЕАГРАФІЯЙ

68-гадовы магілёвец Барыс Ільіч Акуловіч шмат гадоў выкладаў геаграфію ў сярэдняй школе № 21 абласнога цэнтра. Яго маляўнічыя расповеды пра далёкія краіны і іх славутасці былі выключна тэарэтычнымі: у свядомым узросце настаўнік ніколі не быў у замежжы. Затое шмат займаўся пешым турызмам пад лозунгам «Мая Радзіма — СССР» і актыўна цягаў сваіх вучняў у цікавыя паходы.

У Барыса Ільіча заўсёды складваліся добрыя стасункі з дзецьмі і бацькамі. Ён і цяпер кажа, што варта быць настаўнікам толькі таму, што добрыя вочы і цёплыя ўсмешкі робяць жыццё лепшым.

— Быў вечар сустрэч у школе, і быў рады бачыць, што хлопчыкі, якіх я калісьці вучыў, сталі мужчынамі, заможнымі бізнэсменамі, — пачаў сваю гісторыю Барыс Ільіч. — Яны і ў юнацтве былі талковымі хлопцамі, перамагалі на алімпіядах. А цяпер аб'ехалі амаль увесь свет. І адзін з кампаніі расказаў, як быў у Бразіліі і ўзгадаў мае расповеды пра вадаспад Ігуасу. Ён сказаў, што вельмі хоча, каб я на свае вочы пабачыў тое, пра што казаў на школьных уроках. Гэта было прыемна чуць, але якое было маё здзіўленне, калі праз год мне цвёрда сказалі — давайце пашпарт і рабіце прышчэпкі.

БЕЛЫЯ ШТАНЫ

Пералёт з Мадрыда праз Атлантыку на «Боінгу» заняў 11 гадзін. Спаць, паводле слоў Барыса Ільіча, не было часу: размовы, тэлеэкран, тройчы харчавалі «даволі смачна», што часовыя графікі руху самалёта на дысплеі, маляўнічыя краявіды з ілюмінатара. І нарэшце: прызямленне ў Рыо-дэ-Жанейра.

— А ці праўда, што там усе ходзяць у белых штанах?

— Не, няпраўда. Самае распаўсюджанае адзенне — мужчынскае і жаночае — гэта шорты, усіх колераў. А што датычыцца знакамітых літаратурных персанажаў, якія марылі пра Рыо і белыя штаны, то ў раёне порта там усталяваны помнік Астапу Бэндэру. Праўда, мне падалося, што ён не падобны ні на Юрскага, ні на Міронава. Нейкі белы чалавек у белых штанах. Але руская дыяспара сцвярджае, што гэта менавіта Бэндэр.

ГЛАМУР І ФАВЭЛЫ

У Рыо Барыс Ільіч і яго спадарожнікі прабылі тры дні.

— Там ідэальныя ўмовы для жыцця, — расказаў ён пра гатэль, які размешчаны за некалькі дзесяткаў метраў ад акіяна. — Белы халат пасля душа, 12 шампуняў на выбар... Прадугледжана ўсё для камфорту чалавека. Націсніце на кнопку, і вам прынясуць. Ведаеце, я сваім вучням заўсёды расказваў, што Бразілія — гэта краіна, якая яшчэ развіваецца. Трэці свет. Маўляў, ёсць развітыя — гэта мы, а ёсць яны — ім яшчэ трэба развівацца. Дык вось што я скажу: калі б мы жылі так, як цяпер жыве Бразілія, то я быў бы самым шчаслівым чалавекам.

Хоць ёсць тут і свае акалічнасці. Васьмімільённы мегаполіс Рыо-дэ-Жанейра складаецца нібыта з дзвюх частак. Адна са шкла і бетону, са шматпавярховымі будынкамі, прыгожымі вуліцамі і шырокімі праспектамі. А другая — гэта фавэлы, дзе «квітнее» беднасць і крымінал.

— Гэта сапраўдныя бандыцкія раёны, куды турыстам катэгарычна не рэкамендуюць заходзіць, — расказвае Барыс Ільіч. — Туды нават паліцэйскія не ездзяць. І мы былі сведкамі таго, што робіцца ў фавэлах. Узброеныя паліцэйскія, накшталт нашых спецназаўцаў, абклалі дамы. Снайперы — усё, як у кіно. А тыя трушчобы з фанеры, кардону і дошак налеплены на гару як ластаўчыны гнёзды — паспрабуй да іх дакараскацца. Так што, можа, у гэтым Бразілія яшчэ сапраўды краіна, якая толькі развіваецца?..

Вялікае ўражанне — помнік Хрысту на гары Каркавада. Сама гэта гара мае вышыню ў 701 метр, і на ёй усталявана статуя Хрыста Збавіцеля з распасцёртымі рукамі вышынёй 30 метраў. Помнік быў пабудаваны ў пачатку мінулага стагоддзя і стаў адной з галоўных славутасцяў Бразіліі. Кожныя паўгадзіны цягнік падымае на гару турыстаў.

— Гэта экзотыка і прыгажосць, — гаворыць Барыс Ільіч. — Мяне там проста распірала ад радасна-га пачуцця, што я, просты настаўнік-пенсіянер з далёкай Беларусі, трапіў у найпрыгажэйшы горад свету, які цяпер рассцілаецца перада мной унізе.

БЕЗАЛКАГОЛЬНЫ ФУТБОЛ

Пляжы Капакабана цягнуцца некалькі кіламетраў па ўзбярэжжы Атлантыкі. Там белы і вельмі дробны пясок. Тым, хто адпачывае, не патрэбны ніякія лежакі — ні камянёў, ні ракушак на пляжы няма. А моладзь з раніцы да ночы бавіць час у спартыўных гульнях, і найбольш папулярны футбол.

— Футбол для бразільцаў — гэта ўсё! — пераканаўся Барыс Ільіч. — Калі нараджаецца дзіця, яму адразу дораць бутсы і футбольны мяч. І мне выпала шчасце пабываць на самым вялікім у свеце стандыёне «Маракана». Больш за 100 тысяч гледачоў: што там робіцца — цяжка ўявіць. Эмоцыі, фанатызм! Канфеці, газы, выбухі, петарды. Людзі скандзіруюць, трасуць транспарантамі. Калі паглядзець зверху, то маса людзей, гэты клубок проста кіпіць. На тым матчы Бразілія выйграла ў Эквадора з лікам 4:1.

— Напэўна, эмацыйнасць бразільскіх футбольных фанатаў падграецца моцнымі напоямі?

— Зусім не. Там аддаюць перавагу неалкагольным напоям. Больш за ўсё п'юць усякія «кокаколы» ды «спрайты». Я нават на карнавалах там не бачыў п'яных людзей. Ды і курыць там вельмі мала. На сненданне, абед і вячэру абавязкова, акрамя іншага, ядуць садавіну. Увогуле ўражанне такое, што бразільцы — вельмі здаровая нацыя.

АДКРЫТАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

— А бразільянкі — прыгожыя жанчыны?

— Даволі прыгожыя. Смуглявыя. Але, скажам так — сярэдняй паўнаты. Жанчын-нітачак я там не бачыў. Грудастыя, тэмпераментныя, рухавыя, вясёлыя. І адзенне на іх няшмат. Зразумець можна: у кастрычніку, а гэта вясна ў Паўднёвай Амерыцы, тэмпература паветра была 30—32 градусы цяпла.

Барыс Ільіч расказаў, што і на бразільскіх мужчын, якія ўсе скрозь стройныя прыгажуны, таксама прыемна паглядзець. Норавы там вольныя, пары цалуюцца прама на вуліцы і не саромеюцца сваіх пачуццяў.

— А яшчэ там людзі заўсёды ўсміхаюцца, добразычлівыя, з адкрытымі тварамі, — заўважыў Барыс Ільіч. — Не бачыў ніводнага разу, каб там бокам паглядзелі. Гэта і зразумела: турысты — гэта іх бізнэс, іх грошы, іх будучае.

Самбу пенсіянер танцаваць не навучыўся, але яго маладыя спадарожнікі ўзялі ў свяце самы непасрэдны ўдзел. Гаварыць, там танцуюць людзі ўсіх узростаў. Усе падпарадкоўваюцца аднаму рытму, і тысячы людзей на самбадроме сінхронна рухаюцца. Дзея працягваецца ўсю ноч — 10—12 гадзін.

ПІРАННІ Ў ДЖУНГЛЯХ

— Як вы, чалавек паважанага ўзросту, вырашыліся на тур выжывання ў Амазоніі?

— Я цудоўна выжыў. Хоць так, мая сям'я найбольш хвалявалася за гэтыя тры дні. Але я — нармальны здаровы чалавек. Ну, калі зусім шчыра, я і сам трывожыўся наконт вялікай спёкі — там даходзіць да 40—45 градусаў, але ўсё абышлося.

У Амазонію ўся кампанія адправілася на джыпах. Паўтары сотні кіламетраў, а потым на лодках па прытоку да самой Амазонкі. На беразе ракі пастаўлены індзейскія бунгала — драўляныя, плеценыя з зёлкамі і лісцем.

— Там усё вельмі акуратна, ёсць каналізацыя і душ, — расказвае Барыс Ільіч. — Умовы набліжаны да джунгляў, але прыбіральня чысценькая, араматызатарамі пахне як у нашай цырульні. Святла няма, але навокал лампадкі з пальмавым алеем. Увечары тэрыторыя нагадвае нейкі будысцкі храм.

На гэтай «базе» арганізавалі рыбалку, і турысты з задавальненнем лавілі піранняў. Дарэчы, адзін з нямногіх сувеніраў, якія прывёз на радзіму Барыс Ільіч — гэта якраз засушаная піранья. Цяпер зубы драпежніцы на трываласць правярае яго ўнук Ягор.

— А купацца баяліся, памятаючы пра фільмы жахаў пра піранняў?

— Мы купаліся. Нас вучылі, што індыкатарамі бяспекі служаць немцы. Там турыстаў вялікі паток, але рэпутацыя самых абачлівых — у немцаў. Калі немцы купаюцца — значыць можна. Калі ядуць — і вам можна. Там шмат рознай небяспечнай заразы і акрамя піранняў. Трэба быць уважлівымі.

РАЙ ВЫЖЫВАННЯ

— А на наступны дзень мы ўзялі заплечнікі і разам з праваднікамі-індзейцамі адправіліся ў джунглі, — працягвае Акуловіч. — Хадзілі шмат, але, як потым высветлілася, кругамі. Відаць, у мэтах бяспекі далёка ад базы не адыходзілі.

Турысты спалі ў гамаках пад адкрытым небам. Ноччу адпачывалі спакойна: то малпы на дрэвах загоцаюць, то нейкая птушка ўхне, але за дзень турысты столькі шпацыравалі, што засыналі імгненна.

— Адзін з нашых сказаў: я ў раі, — узгадвае Барыс Ільіч. — У вадаспадзе крышталёва чыстая вада, касцёр гарыць, птушкі спяваюць, індзейцы гатуюць ежу. Ды яшчэ трохі кашасы. Гэта нацыянальная бразільская гарэлка, якая гатуецца з цукровага трыснягу. Нагадвае нашу самагонку альбо віскі.

А потым райскае выжыванне раптоўна скончылася. Пайшоў моцны трапічны ліўень, і людзі літаральна за паўтары гадзіны вярнуліся на камфортную базу. Вымаклі да ніткі, але ліўень, калі шчыра, быў цёплы і гэта апошняе выпрабаванне не стала праблемай.

Дарэчы, іх група стала першай, якая ў туры па Амазоніі зрабіла запіс у кнігу ўражанняў на рускай мове.

МАЛПЫ І КААЦІ

— Там праўда шмат дзікіх малпаў?

— Так, праўда. І малпаў, і птушак, і ўсяго. Прырода там неверагодная!

У нацыянальным прыродным парку Акуловіч нарэшце пабачыў той самы вадапад Ігуасу, пра які так хораша расказваў сваім вучням.

— Там рака і сістэма вадаспадаў, — расказаў Барыс Ільіч. — Гэта прыгажосць неапісальная. Мы заплывалі за вадаспады на лодках, абляталі на верталётах аглядальныя пляцоўкі. Яркія птушкі, вялізныя матылькі, незвычайныя жывёлы. Там было цэлае царства папугаяў: адзін здаровы какаду парваў нашаму хлопцу капялюш.

Турыстам там вельмі падабаюцца кааці — гэта такія невялікія жывёліны накшталт янотаў. Яны вольна ходзяць сярод людзей і просяць ежы. Між тым, карміць іх строга забараняецца. Але гавораць, што забарону так і цягне парушыць: сімпатычны кааці глядзіць прама ў вочы вельмі жаласліва і цярпліва чакае ласкі і ласунка.

— Напэўна, такога кааці было б добра мець у якасці хатняй жывёлы...

— Што вы! З Бразіліі нельга вывозіць ні жывёл, ні насякомых, ні раслін. За якога-небудзь жука альбо жабу можна трапіць за краты на 6—8 гадоў!

ФАЗЭНДА ПАД СЛАЎГАРАДАМ

Потым былі іншыя мясціны. Мегаполіс Сан-Паулу, дзе адбываецца дзея ўсіх папулярных бразільскіх серыялаў. Гэта ўжо былі каменныя джунглі: хмарачосы суседнічаюць з пабудовамі мінулых стагоддзяў.

А ў Порта-Сігуру беларусы паглядзелі, што такое развіты аграэкатурызм. Там на тэрыторыі фазэнды фермер пабудаваў некалькі камфартабельных домікаў. Такая сучасная міні-вёска: джакузі ў нумары і расліннасць, як у батанічным садзе. Усюды кафэ, дзе кормяць турыстаў.

— Мне падаецца, што ў бразільцаў мы маглі б павучыцца экатурызму, — лічыць Барыс Ільіч. — Там цэлыя рэгіёны жывуць за кошт гэтага, і добра жывуць. Іх фазэнды добраўпарадкаваныя і цывілізаваныя. У іх няма прамысловай вытворчасці, але ёсць рамёствы. Мне падаецца, што падобныя фазэнды можна стварыць і ў любой вёсцы пад Слаўгарадам, ды ў кожным сельскім раёне.

РАЗЯЎЛЕНЫЯ РАТЫ

— А колькі каштавала падарожжа, калі не сакрэт?

— Тур на аднаго чалавека каштуе 6 тысяч долараў. У гэты кошт уваходзіць пералёт, гатэль са снеданнем. Астатняе — за свае грошы. Мяркую, што некалькі тысяч долараў з сабой браць трэба.

У паездцы Барыс Ільіч і яго сябры зрабілі больш за 15 тысяч здымкаў. А яшчэ больш прывезлі ўспамінаў.

...Якая цёплая ў акіяне вада і як трэба сустракаць вялікую хвалю, каб яна не шварknула цябе аб пясок.

...Як увечары блішчаць, як флікеры, раздзяляльныя палосы на шашы: у Бразіліі рух у розныя бакі падзяляе вялікі прамежак, і за 17 дзён беларусы не ўбачылі ніводнай аварыі.

...Як тлумачылі бразільцам, што яны з Беларусі, а тыя ведалі толькі рускіх і Ельцына.

— Калі б усё гэта спраўдзілася гадоў трыццаць таму, я стаў бы лепшым настаўнікам геаграфіі ў Беларусі, — уздыхае Барыс Ільіч. — Я тады пра Бразілію расказваў бы так, што ў дзетак роцікі б разявіліся ад захаплення. Але ўсё роўна я вельмі шчаслівы, што мая мара цяпер спраўдзілася.

Акуловіч прызнаецца, што хоць для сваіх маладых спадарожнікаў быў вялікім аўтарытэтам і з поспехам выкладаў на натуры свае тэарэтычныя веды пра Бразілію, але ўсё ж сам глядзеў на ўсё з тым самым разяўленым ротам.

Але верагодна, што ў наступным годзе магілёўца чакаюць новыя ўражанні: на гэты раз са сваімі былымі вучнямі Барыс Ільіч збіраецца наведаць Тайланд. Добрай дарогі!

Распытала пра бразільскія ўражанні Ілона ІВАНОВА.

Спажывецкі кошык

Сям'я беларусаў у трэцім квартале красходавала на спажывецкія патрэбы ў сярэднім Br859,3 тыс. Паводле даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, у Беларусі ў трэцім квартале гэтага года спажывецкія расходы ў сярэднім на сям'ю склалі Br859,3 тыс. у месяц. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Дарэчы

Дэпутаты прынялі ў першым чытанні папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях падаткаабкладання

Як адзначыў, прадстаўляючы законапраект, міністр фінансаў Беларусі Мікалай Корбут, гэтымі папраўкамі «ўдалося забяспечыць баланс інтарэсаў як бюджэту, так і падаткаплацельшчыкаў». Законапраект накіраваны на спрашчэнне структуры падатковай сістэмы ў рэспубліцы, забеспячэнне ўдасканалення падатковага заканадаўства.

Папраўкі ўдакладняюць пытанні прымянення ПДВ для індывідуальных прадпрымальнікаў і спрашчаюць парадак прызнання плацельшчыкаў падатку. Так, абавязак выплаты ПДВ для ІП будзе надыходзіць толькі ў выпадку перавышэння ўстаноўленага ў памеры 40 тыс. еўра аб'ёму абароту па рэалізацыі тавараў, работ, паслуг за тры папярэднія каляндарныя месяцы. Спрашчаецца парадак налічэння ПДВ. Аб'ектам падаткаабкладання не будзе прызнавацца перадача вырабленых, набытых тавараў, работ і паслуг на ўласныя спажыванні невытворчага характару. У выпадку змянення ставак ПДВ новы парадак падаткаабкладання будзе прымяняцца ў адносінах да адгружаных тавараў толькі з моманту змянення. Акрамя таго, законапраектам спрашчаецца парадак правядзення падатковых вылікаў. Таксама ўдасканальваецца парадак прымянення арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, парадак спагнання падаходнага падатку з фізічных асобаў і шэраг іншых.

У Беларусі з 2008 года грамадзяне змогуць падаваць падатковыя дэкларацыі для выплаты падаходнага падатку не па асноўным месцы работы. Цяпер гэта можна рабіць толькі па месцы асноўнай работы.

Прадстаўляючы законапраект аб унясенні паправак, міністр фінансаў Беларусі Мікалай Корбут адзначыў, што ён накіраваны на забеспячэнне далейшага спрашчэння парадку падаткаабкладання даходаў грамадзян. Папраўкамі вызначаны пералік даходаў, якія не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання, удакладнены парадак прымянення стандартных падатковых вылікаў у тым ліку ў выпадках перапынкаў у рабоце, службе, вучобе на працягу падатковага перыяду. Прапануецца знізіць памер падаходнага падатку па асноўным месцы работы з 20 да 15 працэнтаў. «Улічваючы, што фактычны памер сярэдняй стаўкі падаходнага падатку ў 2006 годзе склаў 10,3 працэнта, зніжэнне будзе садзейнічаць больш справядліваму падаткаабкладанню грамадзян, якія атрымліваюць даход ад работы па сумяшчальніцтву», — адзначыў міністр.

Папраўкамі прадугледжана, што сацыяльны падатковы вылік з 2008 года будзе праводзіцца не толькі па банкаўскіх крэдытах, выдадзеных на будаўніцтва жылля і навучанне, але і па пазыках, якія на гэтыя мэты дае свайму работніку наймальнік або індывідуальны прадпрымальнік.

Міністр паведаміў, што для стымулявання экспартнай дзейнасці беларускіх арганізацый плануецца ўстанавіць, што сума падатку, выплачанага імі ў бюджэт замежнай дзяржавы, будзе ўлічвацца пры вылічэнні падатку на прыбытак у Беларусі.

Мікалай Корбут падкрэсліў, што ўсе ўнесімыя ў законы папраўкі па пытаннях падаткаабкладання былі ўлічаны пры фарміраванні бюджэту на 2008 год. Праект бюджэту на 2008 год прадугледжвае, што дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту складзе каля Br2,2 трлн, або 1,9 працэнта да ВУП. Праектам бюджэту на 2008 год прадугледжваецца захаванне стаўкі ПДВ на ранейшым узроўні — 18 працэнтаў (раней планавалася яе павелічэнне да 20 працэнтаў). У выніку даходная частка бюджэту 2008 года скарацілася на Br1,1 трлн. Гэта, у сваю чаргу, запатрабавала скарачэння расходаў бюджэту будучага года. Адмена пэўных ільгот з 2008 года дасць бюджэту эканомію рэсурсаў у памеры Br168 млрд. У цэлым Мікалай Корбут ацэньвае бюджэт 2008 года як бюджэт развіцця, паколькі ў краіне прынята шмат важных праграм, фінансаванне якіх ажыццяўляецца з бюджэту, і іх неабходна выконваць. У выніку спрашчэння падатковай сістэмы і зніжэння падатковай нагрузкі ў распараджэнні падаткаплацельшчыкаў Беларусі ў 2008 годзе дадаткова застанецца каля Br1 трлн.

Свая справа: на скрыжаванні думак

УСЕ — ЗА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА?

«Паслухаць — дык усе, у тым ліку і чыноўнікі высокага рангу, гаворыць на «рынкавай» мове і з'яўляюцца гарачымі прыхільнікамі развіцця прадпрымальніцтва. Аднак словы часта разыходзяцца з рэаліямі, чуеш адно, а на справе сутыкаешся з мноствам бар'ераў і бюракратычных перашкодаў», — адзначыў адзін з удзельнікаў «круглага стала» ў Гродне на тэму «Актуальныя праблемы развіцця прадпрымальніцтва і шляхі іх вырашэння».

У абмеркаванні надзённых праблем (асабліва што датычыцца ўдасканалення падатковай сістэмы і спрашчэння парадку адміністрацыйных працэдур у дачыненні да бізнэсу) удзельнічалі старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, міністр статыстыкі і аналізу Уладзімір ЗІНОЎСКІ, прадстаўнікі Гродзенскага аблвыканкама, Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і найманых працаўнікоў імя прафесара М. Куняўскага, шэрагу камерцыйных арганізацый рэгіёна. Уладзімір Зіноўскі падкрэсліў, што такія сустрэчы становяцца ў краіне ўжо традыцыйнымі і заклікаў удзельнікаў «круглага стала» да шчырай размовы па пытаннях, якія іх хвалююць з тым, каб яны былі ўлічаны Саветам па развіцці прадпрымальніцтва і адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

Вось толькі некаторыя з «болевых кропак» беларускага прадпрымальніцтва, без падтрымкі якога, падкрэслівалася на нядаўнім семінары кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў, проста немагчыма рэалізаваць Дзяржаўную комплексную праграму развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гады.

Як вытрымаць падатковую нагрузку і пры гэтым весці прыбытковую дзейнасць?

Паводле інфармацыі БСПН імя прафесара М. Куняўскага, сёлета ў рэспубліцы даходы кансалідаванага бюджэту па выніках першага паўгоддзя склалі 51,7 працэнта ад аб'ёму валавога ўнутранага прадукту (пры прафіцыце бюджэту — 4,3 працэнта ад ВУП). Прычым гэта — «сярэдняя тэмпература па бальніцы». З улікам падатковых ільготаў і прэферэнцыяльных асобным буйным дзяржпрадпрыемствам узровень спагнання дабаўленага кошту па многіх іншых суб'ектах істотна вышэйшы і даходзіць прыкладна да 70 працэнтаў.

Старшыня БСПН імя прафесара М. Куняўскага Георгій БАДЗЕЙ спасылаўся на даныя даследаванняў Сусветнага банка, згодна з якімі супольны падатак у Беларусі ў 2006 годзе склаў 144,4 (!) працэнта ад прыбытку. Пры такім узроўні спагнанняў прыбытковая дзейнасць становіцца бессэнсоўнай, асабліва калі ўлічваць, што ва Украіне гэты паказчык — 57,3, у Расіі — 51,4 працэнта. У гэтай сувязі прадстаўнікі дзелавых колаў лічаць неабходным забяспечыць у 2008-м і ў наступныя гады скарачэнне супольнай падатковай нагрузкі не менш чым на два працэнты штогадова.

А вось прапанова аб павелічэнні на тыя ж два працэнтныя пункты існуючай стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, як было адзначана на пасяджэнні «круглага стала», з'яўляецца малаабгрунтаванай. Гэта прывядзе да павышэння кошту не толькі імпарту, але і ўсіх цэнаў як мінімум на тыя ж два пункты. Павелічэнне стаўкі ПДВ адмоўна адаб'ецца, перш за ўсё, на рабоце нематэрыяльнаёмістых прадпрыемстваў з вялікімі затратамі разумовай працы, што не адпавядае патрабаванням Дырэктывы № 3 і праграме інавацыйнага развіцця краіны.

Дарэчы, ПДВ, як падатак на спажыўца, у нас «манаполіі» не мае. Такая ж прырода і ў падатку з продажу, які ўстанаўліваецца мясцовымі органамі ў памеры 5—15 працэнтаў. Тым самым у наяўнасці двайное падаткаабкладанне. У перспектыве трэба вызначыцца, які з гэтых падаткаў мэтазгодна выкарыстоўваць.

Альбо хіба ж справядліва, што плаціць падатак на дабаўленую вартасць вымушаны дзесяткі камерцыйных ВНУ? Тым самым створаны няроўныя ўмовы гаспадарання і канкурэнцыі для прыватных і дзяржаўных устаноў адукацыі, а студэнты падзелены на розныя катэгорыі — дзяржаўных і прыватных. Пры гэтым апошнія плацяць за вучобу больш на велічыню ПДВ.

Нельга прызнаць аптымальным і рашэнне аб адмене з 1 студзеня 2008 года толькі падатку з карыстальнікаў аўтамабільных дарог, паколькі абаротныя падаткі, якія мелі намер адмяніць яшчэ ў 2006 годзе, застаюцца ў выглядзе збораў у фонд вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Аналагічную з абаротнымі падаткамі прыроду маюць адлічэнні ў інавацыйныя фонды, якія сёлета фарміруюцца ўсімі рэспубліканскімі органамі кіравання, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам (у памеры 0,25 працэнта ад сабекошту прадукцыі, работ і паслуг). Павышаныя нарматывы адлічэнняў устаноўлены па 17 міністэрствах і канцэрнах, шэрагу грамадскі

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

17 снежня — галоўны рэабілітолаг-эксперт аддзела медэкспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Уладзімір Валянцінавіч ЛАМАКА.

18 снежня — галоўны тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Алена Анатольеўна ЛАПЦЕВА.

19 снежня — намеснік дырэктара НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Аляксандр Сяргеевіч ПЯТКЕВІЧ.

20 снежня — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі Ірына Уладзіміраўна КАРАВАШКІНА.

У графіку магчымыя змяненні.

Ванна для прыёму родаў

У аршанскім раддоме ўстаноўлена першая ў Віцебскай вобласці ванна для прыёму родаў. Самыя перадавыя тэхналогіі рододапамогі будуць прымяняцца ў радзільным доме Аршанскай цэнтральнай раённай бальніцы, які адкрыўся сёння пасля рэканструкцыі.

Як расказала загадчыца раддома Іна Крачак, у ванне будзе праходзіць першы этап родаў — перыяд схваток. Гэта апрабаваная на практыцы методыка, якая добра сябе зарэкамендавала. Акрамя ванны, у перадродавых палатах маюцца спецыяльныя трэнажоры для парадзіх, з дапамогай якіх можна зменшыць болевыя адчуванні. У раддоме таксама ўстаноўлены сучасны апарат УГД, які дае магчымасць убачыць паталогіі развіцця плода на першых 12 тыднях цяжарнасці.

У пасляродавых палатах, разлічаных на 1—4 чалавекі, мамы будуць знаходзіцца са сваімі нованароджанымі малымі. У кожнай палаце ўстаноўлены душ і санвузел. Аднак самае галоўнае, як лічыць Іна Крачак, цяпер маладым татам не трэба будзе як раней стаяць пад вокнамі і знакамі выказваць словы падзякі сваім жонкам — з дапамогай відэатэлефона яны змогуць не толькі пачуць, але і ўбачыць сваіх блізкіх у цёплым і ўтульным прыёмным пакоі.

У камфортных умовах змогуць раджаць каля 1,5 тыс. жанчын у год. Прычым не толькі з Оршы і Аршанскага раёна, але і з суседніх — Дубровенскага і Талачынскага.

Рэканструкцыя раддома ў Оршы вялася на працягу двух гадоў. З абласнога і гарадскога бюджэтаў на яе накіравана каля Br12 млрд. У набыцці сучаснага абсталявання фінансавую падтрымку аказала Міністэрства аховы здароўя. У Віцебскай вобласці ў стадыі рэканструкцыі знаходзіцца яшчэ два радзільныя дамы — у Наваполацку і Віцебску. У адпаведнасці з прэзідэнцкай праграмай «Дзеці Беларусі» яны будуць здадзены ў эксплуатацыю ў 2008 годзе.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

Прамая лінія

З ГРЫПАМ НЕ ЖАРТУЮЦЬ...

Беларусь — адна з краін Садружнасці, дзе практычна ўсе інфекцыі эпідэміёлагі ўзялі пад кантроль. Больш за 20 розных захворванняў не рэгіструюцца ў нас ужо шмат гадоў. Беларусь прызнана поўнасцю свабоднай ад поліяміеліту, амаль свабоднай — ад халеры, чумы, тыфу. Пашыраная абавязковая вакцынацыя супраць некаторых захворванняў дазваляе стрымліваць іх на вельмі нізкім узроўні.

Але ёсць так званыя «сезонныя» інфекцыі, ад якіх мы пакутуем з году ў год. Перш за ўсё, гэта грып і вострыя рэспіраторныя захворванні. Міністэрства аховы здароўя заклікае людзей больш актыўна праходзіць імунізацыю супраць грыпу. Пакуль прышчэплена толькі каля трэці насельніцтва з так званай групы рызыкі. Сёлета ўпершыню будзе выкарыстоўвацца жывая грыпозная вакцына для дарослых. Дарэчы, кожны год на вакцынацыю супраць грыпу выдаткоўваецца каля мільёна долараў. А колькі каштуе дзяржаве вылечыць чалавека, які не прышчапіўся і захварэў на грып? Калі можна чакаць успышкі прастудных захворванняў? Ці ёсць супрацьпаказанні ў прымяненні вакцын супраць грыпу? Аб гэтым і іншым падчас «прамой лініі» Беларускага радыё, у якой разам з журналістам радыё Максімам Угляніцам узяў удзел і карэспандэнт «Звязды», і ішла размова з намеснікам міністра аховы здароўя, галоўным дзяржаўным санітарным урачом Беларусі, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам Міхаілам РЫМЖАМ.

— Міхаіл Іванавіч, як цяпер ацэньваецца сітуацыя з захворваннямі на грып, вострымі рэспіраторнымі захворваннямі?

— Пакуль эпідэміі няма, хоць пад'ём захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі пачаўся. Як правіла, аб эпідэміі грыпу мы гаворым толькі тады, калі сярод вылучаных вірусаў пачынае пераважаць вірус грыпу. На сёння яго доля складае менш за 10 працэнтаў. Паводле нашых прагнозаў, пачатак пад'ёму захваральнасці на грып чакаецца дзесьці ў канцы снежня — пачатку студзеня.

— Ужо вядома, які прыйдзе грып?

— Грып даволі зменлівы, асабліва вірус грыпу А. Нам вядомы тры вірусы — А, В, С, прычым два апошнія — стабільныя. А вось антыгенная структура віруса А схільная да даволі сур'ёзных змяненняў. На сёння мы чакаем вірус H3N2, які быў і летась. Між іншым, калі мы рыхтуем вакцыну, дадаткова ўлічваюцца і іншыя камбінацыі віруса. Гэта значыць, тая вакцына, якая зараз прымяняецца, абараняе ад усіх вірусаў.

— Цікава, а ў чым прычына сезоннасці захворванняў на грып? Чаму зімой людзі больш масава на яго хварэюць?

— Адна з найважнейшых прычын — недахоп святла. Вірусы, у тым ліку вірус грыпу, баяцца ўльтрафіялету, баяцца святла. Дарэчы, вірус грыпу нікуды з чалавечай папуляцыі і не сыходзіць. Іншая справа, што ў летні час, калі стаіць высокая тэмпература і шмат ультрафіялету, вірусы гінуць у знешнім асяроддзі. Сярод іншых фактараў, якія ўплываюць на пад'ём захваральнасці не толькі на грып, але і на іншыя рэспіраторныя вірусы, можна назваць перапад тэмпературы, тыя ж прамочаныя ногі і т.п.

— Ёсць меркаванне, што многім дапамагае змагацца з грыпам марознае надвор'е: маўляў, выйдзеш на холад, надыхаешся сцюдзёным паветрам, і мікробам канец.

— У медыкаў гэта называецца гераічнай загартоўкай. Аднак так рабіць не трэба. Тое ж, што неабходна гуляць на свежым паветры ў любое надвор'е, — гэта так. Праўда, калі чалавек хворы — гэтага лепш не рабіць, таму што такім чынам вы даяце моцную нагрузку на арганізм. Арганізм змагаецца з інфекцыяй, а вы дадаяце яму стрэсавыя сітуацыі. Што ж датычыцца самой загартоўкі, то гэта адна з вельмі важных працэдур і моцная мера прафілактыкі. Аднак, на жаль, мы не заўсёды правільна падыходзім да працэсу. Загартоўка арганізма павінна праходзіць паступова. І пачынаць яе неабходна не з таго ж аблівання халоднай вадой усяго цела, а, умоўна кажучы, з таго, што паставіць адну нагу ў ёмістасць з вадой пакаёвай тэмпературы, другую — у цёплую, а потым памяняць іх месцамі. Медыкі двума рукамі за загартоўку, аднак праводзіць яе трэба правільна.

— Колькі ў сярэднім абыходзіцца лячэнне чалавека, які захварэў на грып?

— Любое захворванне, асабліва ў адносінах да якіх ёсць вакцыны, наносіць значна большы эканамічны ўрон, чым затрачаныя дзяржавай сродкі на закупку вакцыны. Адзін выпадак захворвання на грып абыходзіцца дзяржаве эканамічнымі стратамі ў суме каля 100 долараў ЗША.

— Жанчына, якая сем гадоў таму перанесла анкааперацыю, пытаецца, ці можна ёй зараз прайсці вакцынацыю?

— Так, яна можа прайсці вакцынацыю, ніякіх проціпаказанняў у яе выпадку няма.

— Наколькі бяспечная і эфектыўная вакцына, якая выкарыстоўваецца нашымі медыкамі?

— Калі б вакцына несла рызыку, яна не выраблялася б. Вакцыны вельмі пільна кантралююцца. Эфектыўнасць жа вакцынацыі высокая. У гэтым годзе мы закупілі жывую вакцыну, а так званай інактываванай вакцыны, якая ўводзіцца з дапамогай уколу, закуплена толькі 13 тысяч доз, каб прышчапіць дзетак ва ўзросце да трох гадоў: жывая вакцына ў іх можа выклікаць інфекцыйны працэс. Калі ж весці гутарку пра жывую вакцыну, то ў яе ёсць вялікія перавагі. Справа ў тым, што яна ўводзіцца інтраназальна — проста распыляецца ў насавыя хады. Гэта важна з пункту гледжання вакцыяналогіі: вакцына будзе паўтараць рух дзікага віруса і стымуляваць мясцовы імунітэт. Да таго ж эканомлены вялікія сродкі толькі на адных шпрыцах, у якіх няма патрэбы пры жывой вакцынацыі, — гэта каля 45 тысяч долараў ЗША.

— Жыхарка Мінска пытаецца, ці існуе прышчэпка супраць герпесу?

— Вакцына такая існуе, але яна не мае папулярнага хаджэння, таму што вакцынацыя праводзіцца шматразова і строга па медыцынскіх паказаннях. Сапраўды, гэта інфекцыя — вельмі сур'ёзная праблема: вірус герпесу прысутнічае ў арганізме кожнага з нас і даволі часта, асабліва на фоне аслаблення імунітэту, праяўляе сябе ў выглядзе высыпання на губах і т.п. Высыпанне — зараджэнне вялікай колькасці новых вірусных часціц, якія зноў ідуць у наш арганізм. Людзям, у якіх назіраюцца частыя герпесныя высыпанні, сапраўды паказана вакцынацыя, аднак толькі пасля кансультацыі з урачом-інфекцыяністам і па паказаннях, якія будуць вызначаны.

— Многія не праходзяць вакцынацыю, не загартоўваюцца, а калі захворваюць на грып, то займаюцца самалячэннем ці пераносяць хваробу на нагах. Як да гэтага ставяцца ўрачы?

— Крайне адмоўна. Я ж, напрыклад, не сяду за руль аўтамабіля, калі не маю вадзіцельскага пасведчання. Чаму ж чалавек, не маючы адпаведных ведаў, пачынае на свой страх і рызыку гуляню са здароўем? Падбіраць лячэнне павінен спецыяліст. Самалячэнне, прыём нейкіх медыкаментозных сродкаў без кансультацыі з урачом павінны быць цалкам выключаны. Урач ведае, як вядзе сябе ваш артэрыяльны ціск, ён знаёмы з вашымі захворваннямі, а таму можа меркаваць, як паўплываюць на арганізм тыя ці іншыя прэпараты. Справа ў тым, што процівірусныя сродкі — даволі сур'ёзныя лекавыя прэпараты, якія неабходна прымаць у вялікіх дозах і працяглы час. І таму трэба ўлічыць не толькі паказанні, але і ўсе проціпаказанні. А таму, паўтаруся, гэта можа вызначыць толькі спецыяліст. Ці можна пераносіць грып на нагах? Гэта можа прывесці да вельмі сур'ёзных наступстваў — грып небяспечны сваімі ўскладненнямі. Грыпозная інфекцыя моцна «злізвае» імунітэт. Таму чалавек пасля перанесенага грыпу яшчэ каля месяца «адбудоўваецца», арганізм прыходзіць у норму па ўсіх сваіх функцыянальных паказчыках. Жартаваць з грыпам не трэба.

— А бываюць выпадкі, што праз 10—15 гадоў пасля грыпу ў чалавека пачынаюцца і праблемы з сэрцам?

— Гэта перанесены грып, які можа выклікаць кардыяміяпатыю, ці паражэнне сардэчнай мышцы. Яно праявіцца не адразу, а праз некалькі гадоў. Акрамя таго, не трэба забываць пра цяжкія паражэнні нырак, бронхалёгачнай сістэмы. Да грыпу трэба ставіцца вельмі сур'ёзна.

— Пытанне ад сям'і, члены якой выкінуюцца ўжо тры гады запар: ці могуць яны працягваць вакцынацыю, альбо неабходна зрабіць нейкі перапынак?

— У гэтым годзе, мяркую, ім можна зрабіць перапынак. У нас цыркулюе вірус, які быў летась, а таму, калі сям'я тры гады прышчэплівалася, то ў яе членаў застаўся так званы поствакцыйны імунітэт. Як толькі прыйдзе вірус і трапіць у арганізм, імуналагічная памяць яго ўзгадае і выкіне абаронныя антыцелы.

— Існуе яшчэ адна тактыка лячэння: у першы ж дзень захворвання некаторыя людзі актыўна пачынаюць прымаць прэпараты накшталт аспірыну. І хвароба часта адступае.

— Можна прымаць што заўгодна, але тут размова ідзе не пра грып, а хутчэй, пра рэспіраторную інфекцыю. Грып заглушыць гарачкапаніжальнымі прэпаратамі немагчыма. Грып, як правіла, пачынаецца не з мокрага носу, а з рэзкага ўздыму тэмпературы, галаўнога болю, болі надброўных дугаў і ліхаманкі. Гэта адрозніваем грыпозную інфекцыю ад астатніх рэспіраторных інфекцый. Пры грыпознай інфекцыі згаданая вамі тактыка будзе абсалютна неэфектыўнай.

— Дарэчы, наконт эфектыўнасці. Ці ідэнтычныя па эфектыўнасці беларускія і замежныя прэпараты?

— Безумоўна. У аснове любога прэпарата ляжыць формула, а формула таго ж аспірыну паўсюль аднолькавая. Выключэнне складае толькі напаўняльнік. Таму беларускія лекі нічым не саступаюць імпартным, і я не бачу сэнсу ганяцца за нейкім імпартным прэпаратам, які ўтрымлівае тую ж ацэтылсаліцылавую кіслату, але ў 10 разоў даражэйшы за айчынны.

— Мінчанка, якая патэлефанавала на «прамую лінію», паведаміла пра тое, што аднойчы зрабіла прышчэпку, пасля чаго сур'ёзна захварэла на грып...

— Я думаю, што гэта было захворванне не на грып, а напластавалася нейкая іншая інфекцыя. Аднак калі ў жанчыны было нейкае ўскладненне, то вакцынацыю можна зрабіць толькі пасля кансультацыі са спецыялістам. Неабходна паглядзець, магчыма, у яе выпадку не выключана алергічная рэакцыя.

— І неабходна памятаць, што вакцыну трэба рабіць не тады, калі пачаўся грып.

— Зусім правільна. Вакцынацыя павінна быць праведзена мінімум за два тыдні.

— Карыстаючыся выпадкам, хочацца задаць пытанне, якое не зусім па тэме сённяшняй гутаркі. Справа ў тым, што многіх бацькоў хвалююць непрыемныя гісторыі, скандалы, што ўзнікаюць вакол дзіцячых цацак, якія наносяць шкоду здароўю. На паліцы нашых магазінаў можа трапіць няякасная цацка?

— На прылаўкі — не, а трапіць у распубліку ў баулах прадпрымальнікаў, якія закупляюць іх дзесьці, напрыклад, на Чаркізаўскім рынку без гігіенічнай рэгістрацыі, — так. Усё, што паступае ў дзяржгандаль, на рынкі, павінна прайсці дзяржаўную гігіенічную рэгістрацыю. Таму я раіў бы пакупнікам, якія прыходзяць на рынак і хочуць там купіць, да прыкладу, медзведзяня, перш чым зрабіць гэта, папрасіць у прадаўца пасведчанне аб гігіенічнай рэгістрацыі цацкі. Калі яно ёсць, то цацка прайшла адпаведнае лабараторнае даследаванне і не з'яўляцца небяспечнай для дзіцяці. Дарэчы, у нашай краіне дзіцячыя цацкі праходзяць самы жорсткі кантроль — робіцца каля 30 даследаванняў па розных параметрах.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Свежанінка можа «ўзнагародзіць» трыхінелёзам

Трыхінэлёзны сезон распачынаецца ў нашай краіне восенню, разам з афіцыйным стартам паляўнічага промыслу, і завяршаецца толькі з апошнім забоем хатніх парсюкоў у прыватным сектары ў сярэдзіне вясны. Папярэдняй зімой у Беларусі былі зарэгістраваны дзве масавыя ўспышкі трыхінелёзу: у першым выпадку ад інфекцыі пацярпелі 7 чалавек, а ў другім колькасць хворых, якія трапілі на бальнічныя ложкі, дасягнула 20 чалавек. У абодвух выпадках віноўнікамі ўспышак стала мяса здабытых на паляванні дзікоў.

— Трыхінелёз выклікаецца паразітаваннем у мышачных тканках многіх драпежных жывёлін, а таксама чалавека нябачных няўзброенаму воку лічынак дробнага гельмінта — трыхінелы, — тлумачыць урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй Ведзянькоў. — Заражэнне адбываецца звычайна пры спажыванні ў ежу заражанага мяса дзікоў ці свойскіх парсюкоў. А пасля звужаюцца (праўда, паводле меркавання японскіх вучоных, гэты пазітыўны эфект зніжае сэкс па-за шлюбам).

Як і шакалад, сэкс уздымае настрой. Вучонымі даказана, што сэксуальна задаволеныя асобы значна радзей падвяргаюцца дэпрэсіі. Следства рэгулярнага сэксу — ураўнаважанасць. У арганізме ўстанаўліваецца гарманальная гармонія. Працяглае палавое ўстрыманне актывізуе агрэсію.

Псіхолагі лічаць, што сэксуальная актыўнасць павышае гібкасць мыслення, здольнасць хутка рэагаваць на тыя ці іншыя абставіны.

Ёсць меркаванне, што пачынаць сэксуальнае жыццё неабходна не пазней за 25 гадоў. Паколькі орган, які бяздзейнічае, пачне прыгнятаць дзейнасць іншых органаў, парушыць стройную сістэму нейрахімічнай і гарманальнай рэгуліроўкі ўсіх біялагічных працэсаў у арганізме. Палавыя ж органы створаны для суровай неабходнасці працягу роду, а не ад лішку творчага пачатку ў прыроды.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Восьмы год паспяхова здзяйсняецца ўнікальны праект Уладзіміра Кучмасава — маладзёжнае Грамадскае аб'яднанне спартыўны клуб каратэ-до «Эверэст». Палкоўнік запасу У. Кучмасаў аб'яднаў вакол сябе дзяцей ад шасці-сямі да пятнаццаці гадоў і на базе дзвюх мінскіх гімназій вучыць усходнім адзінаборствам. Цяпер у клубе болей за 300 хлопчыкаў і дзяўчынак, сярод якіх ёсць ужо чэмпіёны свету, Еўропы, шмат першаразраднікаў.

На здымку: заняткі дзяцей па каратэ-до ў зале педагагічнай гімназіі № 3 г. Мінска.

Краіна здароўя

Выпуск № 42 (55)

Бацькоўскі клопат

«Не пайду я ў садок...»

З нейкага часу толькі і чую аб тым, з якімі «канцэртамі» маладыя матулі вядуць дзяцей у садок. Што і казаць, усе (ці амаль усе) там былі, памятаем, чаго каштавала нам, маленькім чалавечкам, першае ў жыцці сур'ёзнае выпрабаванне — дачакацца, калі цябе забяруць...

Зразумела, што да новай абстаноўкі арганізм павінен прыстасавацца. Гэта і ёсць адаптацыя, якая ўключае досыць шырокі спектр індывідуальных рэакцый, характар якіх залежыць ад псіхалагічных, фізіялагічных асаблівасцяў дзіцяці, ад адносінаў унутры сям'і, ад умоў дашкольнай установы. Кожнае дзіця прывыкае да новых абставінаў па-свойму. І тым не менш спецыялісты вылучаюць некалькі агульных заканамернасцяў працэсу адаптацыі.

Бацькі павінны памятаць, што да 2—3 гадоў дзіця не мае патрэбы ў кантактах з равеснікамі, яна пакуль не сфарміравалася. У гэтым узросце дарослы выступае для дзіцяці як партнёр па гульні, прыклад для пераймання, равеснікі ж гэтага даць не могуць, паколькі самі маюць такую патрэбу.

Адна з прычын таго, што дзіця не можа хутка адаптавацца да ясляў — моцная прывязлівасць да маці, знікненне апошняй выклікае бурны пратэст.

Яшчэ адна прычына цяжкай адаптацыі — страхі перад незнаёмымі людзьмі. Боязь новых людзей і сітуацый прыводзіць да таго, што дзіця становіцца больш узбуджаным, ранімым, плаксівым, часцей хварэе, паколькі стрэс станчае абарончыя сілы арганізма.

Дарэчы, хлопчыкі ва ўзросце 3—5 гадоў больш уразлівыя ў сэнсе адаптацыі: яны ў гэты час найбольш прывязаныя да маці.

Для эмацыянальна неразвітых дзяцей адаптацыя адбываецца наадварот лёгка: у іх няма сфарміраванай прывязлівасці да маці. Псіхолагі ўказваюць на такі парадокс: чым раней дзіця будзе аддадзена ў дашкольную ўстанову (напрыклад, да 1 года), тым больш па-калектывісцку будзе настроена яно ў далейшым. Першасны эмацыянальны кантакт такое дзіця ўстанаўлівае не з маці, а з равеснікамі, што не лепшым чынам адбіваецца на развіцці яго эмацыянальнай сферы. У будучым такое дзіця можа не перажываць глыбокага пачуцця кахання, прывязлівасці, спачування.

Такім чынам, чым больш развіта эмацыянальная сувязь з маці, тым больш цяжка будзе адбывацца адаптацыя. Праблемы адаптацыі могуць пераадолець не ўсе дзеці, што можа прывесці да развіцця неўрозу. Лічыцца, што для паспяховай адаптацыі ў яслях ці садку дзіцяці дастаткова 1 года. У адваротным выпадку неабходна звярнуцца да спецыялістаў. Псіхолагі ўстанавілі дакладныя тэрміны прыстасавання: у яслях — 7—10 дзён, у дзіцячым садку ў 3 гады — 2—3 тыдні, у старэйшым дашкольным узросце — 1 месяц.

Нялёгка прывыкаюць да садка ці ясляў адзіныя ў сям'і дзеці, асабліва тыя, каго празмерна апякаюць, няўпэўненыя ў сабе. Горш за іншых адчуваюць сябе ў дашкольных установах і дзеці з флегматычным тэмпераментам. Яны не паспяваюць за тэмпам жыцця садка, не могуць хутка апранацца, есці. Калі пачаць іх «падсцёгваць», яны стануць яшчэ больш затарможанымі. Залішняя патрабавальнасць і прынцыповасць выхавальніка ў дачыненні да «праблемных» дзяцей, будзе сур'ёзным тормазам.

Пажадана не рабіць перапынкаў у наведванні садка: тыдзень дома прадэманструе дзіцяці, што ёсць і іншы варыянт, якога можна ўсімі сіламі дабівацца.

Магчыма, вам падасца, што паводзіны дзіцяці раптоўна мяняюцца — яно становіцца больш капрызлівым, па вечарах істэрыць з нагоды і без, скандаліць, крычыць, плача і г.д. Некаторыя бацькі схільны абвінавачваць у такіх пераменах садок. А прычын таму можа быць некалькі. Па-першае, адаптацыя да садка — вялікі стрэс для дзіцяці, яго нервы напружаны і ім патрабуецца разрадка. Акрамя таго, у акружэнні незнаёмых дзіцяці часта імкнецца стрымліваць негатыўныя эмоцыі. Так што «выходзяць» яны толькі вечарам і на бацькоў.

Па выхадных добра гуляць у самаробную напольную гульню «Дарога ад дому да дзіцячага садка» з дапамогай карты з дарожкамі і домікамі-арыенцірамі «наш дом», «маміна работа», «татава работа», «магазін», «дзіцячы садок». Па дарозе з дому ў садок і назад патрабуецца запамінаць арыенціры і наносіць іх на карту. Дзіця ходзіць сваёй фігуркай, бацькі — сваімі. Калі гуляць у гэту гульню па выхадных, дзіця не адвыкне ад садка, і панядзелак не будзе здавацца яму жудасным днём.

Ускладняюць адаптацыю і канфлікты ў сям'і, некантактнасць бацькоў. Дзеці міжволі засвойваюць негатыўныя рысы паводзінаў бацькоў, што не спрыяе іх адносінам з равеснікамі. Яны паводзяць сябе няўпэўнена і нерашуча, шмат хвалююцца, таму не могуць быць прынятымі групай.

Калі дзіця пакутуе ад нервовага парушэння, то аддаваць яго ў садок патрэбна не раней чым у 3 гады — дзяўчынку і ў 3,5 — хлопчыка. Наогул калі дзіця — адзінае ў сям'і, часта хварэе, перажывае страхі, то яго ўваходжанне ў садок павінна быць паступовым. Спачатку яго варта прывесці ў групу, пазнаёміць з выхавальнікам і дзецьмі, разгледзець цацкі, выклікаць цікавасць да новага акружэння і вярнуцца дадому. Пасля некалькі дзён можна пакідаць у садку да пачатку дзённага сну. Дома варта паболей гуляць у рухомыя эмацыянальныя гульні, каб здымаць напружанне, здольнае стаць прычынай неўрозу.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

КАНКРЭТНЫЯ ПАРАДЫ:

- *Самы спрыяльны ўзрост для наведвання садка — 3—5 гадоў.*
- *За месяц да планаў адвесці дзіця ў садок імкніцеся менш чым раней бываць з ім.*
- *Скажыце дзіцяці, што ганарыцеся ім: яно ўжо такое вялікае, што можа наведваць садок.*
- *Калі ў садку вы не пачуеце шуму і смеху, пашукайце іншы.*
- *Раскажыце выхавальніку, якія метады заахвочвання і пакарання прымальныя для дзіцяці.*
- *Пры развітанні не забудзьце запэўніць, што вернецеся за дзіцем.*
- *Не расцягвайце момант развітання.*
- *Калі дзіця вельмі цяжка развітваецца з маці, няхай у садок водзіць бацька.*
- *Давайце з сабой любімую цацку, якую можна і пакінуць у садку, і проста насіць штодня з сабой.*
- *Калі дзіця вяртаецца дамоў змучаным і нервовым, забірайце яго крыху раней.*
- *Гуляйце дома з хатнімі цацкамі «ў садок», арыентуйце дзіця на станоўчыя вынікі.*
- *Шукайце такога выхавальніка, які будзе ўлічваць індывідуальныя асаблівасці дзіцяці.*
- *Часта мяняць садкі — шкодна.*
- *Не аддавайце старэйшае дзіця ў садок адначасова з нараджэннем малодшага — лепей зрабіць гэта загадзя, яшчэ да вялікай падзеі.*
- *Садок — магчымасць кантактаваць з равеснікамі, і ён ні ў якім разе не можа замяніць сям'ю.*

Інфарм-укол

HOMO НЕ ТОЛЬКІ SAPIENS, АЛЕ І SEXY

Паўнацэннае сэксуальнае жыццё спрыяе працягненню маладосці.

Сэкс стымулюе і амалоджвае сістэму залозаў унутранай сакрэцыі. Падчас заняткаў каханнем гіпофіз, надныракавая і каляшчыта-падобная залозы, яечнікі ў жанчын і прастата і яечкі ў мужчын працуюць з павышанай інтэнсіўнасцю.

Рэгулярнае сэксуальнае жыццё прыводзіць у рух гармоны, іх узровень становіцца больш высокім, што аказвае пазітыўны ўплыў на арганізм у цэлым: спрыяльна адбіваецца на росце валасоў і пазногцяў, падцягванні мускулатуры, разгладжванні маршчын. Медыкі даказалі: жанчына, якая рэгулярна займаецца сэксам, выглядае маладзей за свой узрост на 5—10 гадоў.

Сэкс актывізуе імунную сістэму, якая найбольш эфектыўна працуе ноччу. Адсюль рэкамендацыя займацца сэксам перад сном: гармоны пранікнуць у кожны куток арганізма і будуць выкарыстаны найбольш аптымальна.

У час расслаблення пасля заняткаў сэксам глыбокае дыханне спрыяе ўзбагачэнню лёгкіх кіслародам.

Сэкс — цудоўная трэніроўка сардэчнага кровазвароту, паколькі паміж прэлюдыяй і аргазмам сасуды спачатку расшыраюцца, а пасля звужаюцца (праўда, паводле меркавання японскіх вучоных, гэты пазітыўны эфект зніжае сэкс па-за шлюбам).

Як і шакалад, сэкс уздымае настрой. Вучонымі даказана, што сэксуальна задаволеныя асобы значна радзей падвяргаюцца дэпрэсіі. Следства рэгулярнага сэксу — ураўнаважанасць. У арганізме ўстанаўліваецца гарманальная гармонія. Працяглае палавое ўстрыманне актывізуе агрэсію.

Псіхолагі лічаць, што сэксуальная актыўнасць павышае гібкасць мыслення, здольнасць хутка рэагаваць на тыя ці іншыя абставіны.

Ёсць меркаванне, што пачынаць сэксуальнае жыццё неабходна не пазней за 25 гадоў. Паколькі орган, які бяздзейнічае, пачне прыгнятаць дзейнасць іншых органаў, парушыць стройную сістэму нейрахімічнай і гарманальнай рэгуліроўкі ўсіх біялагічных працэсаў у арганізме. Палавыя ж органы створаны для суровай неабходнасці працягу роду, а не ад лішку творчага пачатку ў прыроды.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Сонейка патрэбна ўсім

Дажджлівая пахмурная восень, слотная зіма, туман уперамежку са снегам, а галоўнае — недахоп сонечнага святла ўплываюць не толькі на эмацыянальны, але і на фізічны стан чалавека. Пад уздзеяннем сонца ў скуры чалавека выпрацоўваецца вітамін D, які неабходны для лепшага ўсмоктвання кальцыю ў кішэчніку і яго канцэнтрацыі ў касцявой тканцы.

Як патлумачыла доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Эма Рудэнка, 40 хвілін уздзеяння сонечнага святла на адкрытыя ўчасткі цела — твар і рукі — дастаткова для выпрацоўкі сутачнай патрэбнасці арганізма ў «сонечным» вітаміне. У людзей жа, якія доўгі час не бываюць на свежым паветры, утвараецца дэфіцыт вітаміну D, што значна зніжае якасць і трываласць костак.

Багатай прыроднай крыніцай вітаміну D і кальцыю з'яўляецца рыбін тлушч, сардзіны, ласось, селядзец, скумбрыя, яйкі, пячонка куранят, сыр, малочныя прадукты, сметанковае масла, інжыр, міндаль, кунжут і інш.

Не прапускайце ніводнага сонечнага дзянька, асабліва ў асенне-зімовы перыяд, гуляйце на свежым паветры і займайцеся спортам.

Вольга ШВАЙКО, БЕЛТА.

Карысны прадукт

ВЫП'ЕМ ШКЛЯНКУ МАЛАКА, А ЗА ЁЙ — ДРУГУЮ

Сродкі масавай інфармацыі перыядычна палохаюць звесткамі аб сумніўнай якасці глазураваных сыркоў расійскай вытворчасці. Што ж, суайчыннікам можна параіць толькі адно: набывайце малако і малочныя прадукты айчыннага «паходжання».

Паводле слоў урача-гігіеніста Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольгі АГЕЕВАЙ, лабараторнае даследаванне малака і малочна-кіслых прадуктаў адбываецца па паказчыках бяспекі, рэгламентаваных Санітарнымі правіламі і нормамі. Даследуюцца таксічныя элементы, антыбіётыкі, інгібіруючыя рэчывы, пестыцыды, мікрабіялогія і некаторыя іншыя паказчыкі. Па вялікім рахунку, спажыўцу неабходна ведаць, што айчынны тавар, які прадаецца ў санкцыянаваных месцах гандлю, цалкам бяспечны. Найперш таму, што ўласна на вытворчых прадпрыемствах наладжаны адпаведны кантроль за якасцю выпушчанай прадукцыі. Іншая справа, «падкарэктаваць» сітуацыю могуць працэсы транспарціроўкі і захавання гатовых прадуктаў у гандлёвых пунктах.

— Таму сам спажывец павінен звяртаць увагу на тое, як захоўваецца прадукцыя на прадпрыемствах гандлю — 4(+-)2 градусы, памятаць аб вытрымліванні тэрмінаў годнасці і ўмоў захавання малочнай прадукцыі, — тлумачыць Вольга Іванаўна. — У хатніх умовах пасля ўскрыцця ўпакоўкі прадукт можа захоўвацца непрацяглы час і толькі ў халадзільніку. Ужыванне няякасных малочных прадуктаў можа стаць прычынай харчовага атручэння. У цёплым памяшканні стафілакокі, бактэрыі групы кішэчнай палачкі, патагенныя мікраарганізмы добра размнажаюцца, і праз 10—18 гадзін могуць выклікаць харчовае атручэнне. Яго характэрнымі прыкметамі з'яўляюцца павышаная тэмпература, галавакружэнне, млоснасць, рвота, панос...

Застаецца пажадаць усім прыемных малочна-кіслых пакупак і нагадаць, што выдаляць іх са штодзённага рацыёну нельга ні ў якім разе. Заўважана: як толькі ў краіне зніжаецца спажыванне малочных прадуктаў, тут жа ў насельніцтва пачашчаюцца непрыемнасці са страўнікава-кішачным трактам, касцёва-мышачнай сістэмай і апорна-рухальным апаратам. Асабліва гэта датычыцца, безумоўна, дзяцей.

Увогуле, вядома, што малако і малочныя прадукты ўтрымліваюць звыш 100 каштоўных кампанентаў. У тым ліку бялкі, тлушч, малочны цукар, мінеральныя солі, вітаміны, ферменты, гармоны. Малочныя прадукты характарызуюцца высокай харчовай каштоўнасцю. Яны з'яўляюцца найважнейшымі харчовымі крыніцамі кальцыю, вітамінаў А, В, Д, караціну, халіну, такаферолаў, тыяміну, аскарбінавай кіслаты. Малочны бялок валодае фактычна ідэальнымі якасцямі, паколькі ўтрымлівае ў збалансаваным выглядзе ўсе незаменныя амінакіслоты. Малочныя бялкі даволі хутка ператраўліваюцца і амаль поўнасцю засвойваюцца арганізмам. Пры рэгулярным ужыванні малака і малочных прадуктаў у дзяцей ва ўзросце 12—17 гадоў можна задаволіць 70 працэнтаў сутачнай патрэбы кальцыю, 40 працэнтаў — вітаміну B_2 і 20 працэнтаў — бялку. З дапамогай штодзённага ўжывання малочных прадуктаў можна перамагчы высокую распаўсюджанасць захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, касцёва-мышачнай і апорна-рухальнай сістэмаў.

Паводле слоў педыятраў, без належнай колькасці бялку ў рацыёне харчавання дзіця будзе часта хварэць. Асноўнымі ж крыніцамі бялку былі і застаюцца мяса, рыба і малако. Дарэчы, здаровы сутачны рацыён дзяцей (як і дарослых, вядома ж) прадугледжвае збалансаваную колькасць бялку (1 частка), тлушчу (1,2 часткі) і вугляводаў (4 часткі). Вугляводы, — значыць, не булачкі і цукеркі, а выключна фруктовы варыянт.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Доктор Алексей Алексеевич ХАДОРКИН:

при алкогольной, никотиновой, пищевой зависимости люди пытаются бороться со стрессом, употребляя спиртные напитки, сладкое, пищу, включающую жиры и муку, никотин. Это неправильно! Если вы сами не можете отказаться от этих привычек, мы окажем психологическую помощь. Так же успешно лечатся псориаз и энурез у детей.

Запись на прием по телефонам:

Минск 292-72-73
Брест 25-14-67
Барановичи 42-06-95
Борисов 73-37-77
Бобруйск 46-22-01
Витебск 36-40-30
Молодечно 7-01-88
Орша 21-40-40
Полоцк 43-58-61
Солигорск 7-32-39
Слуцк 2-99-19
Жлобин 5-11-42
Могилев 27-26-48
Пинск 37-32-42
Светлогорск 2-72-71, 2-16-55
Речица 3-52-77
Мозырь 2-94-74, 40-60-85
Гродно 74-04-24, 41-42-39
Волковыск 2-11-85
Лида 4-59-20.

Лицензия МЗ РБ № 02040/0311208 от 27.10.2006 г. до 27.09.2011 г.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

СКАНВОРД (8 СНЕЖНЯ). Па гарызанталі: Ваўкавыск. Лагода. Зарука. Штандар. Скапа. «Артэк». Нара. Усход. Халат. Ліга. Альянс. Матрац. Бушлат. Уса. Кома. Лінкор. Човен. Табу. Легар. Чардаш. Праца. Араты. Бал. Опера. Ітака. Абярэмак. **Па вертыкалі:** Капюшон. Арба. Акунь. Школа. Ядловец. Духан. Амега. Лаза. Сутана. Арад. Работа. Вугор. Рапа. Унты. Алека. Судак. Раб. Аск. Сом. Лучына. Алі. Канал. Нар. Палітрук. Вараг. Асоба. Ата. Цар. Шчупак.

СКАНВОРД (13 СНЕЖНЯ). Па гарызанталі: Баскетбол. Рэгбі. Капа. Аніс. Спас. Вол. Бурт. Ядок. Рак. Рэмез. Лампада. Паз. Міна. Варан. Трук. Фагот. Афіна. Прымак. Зман. Карыда. Нага. Ост. Кратар. Фэст. Футбол. Рагу. Мак. Гандбол. **Па вертыкалі:** Валейбол. Крама. Брама. Уфа. Кіно. Рапс. Свіфт. Прада. Факт. Бэра. Казка. Футра. Эпас. Гардэ. Бак. Саган. Смог. Інд. Луг. Ікс. Пак. Ікра. Машына. Вампір. Мат. Навага. Падол. Збан. Карнавал.

Тэлесеткі

ФІЛЬМ, ЯКІ МОЖНА... ПРАЧЫТАЦЬ

Вострасюжэтны дэтэктыўны серыял Сяргея Урсуляка «Ліквідацыя», які ідзе па буднях у вячэрнім эфіры Першага канала, стаў рэкардсменам па рэйтынгу. Па сабранай аўдыторыі серыял узначаліў спіс самых папулярных тэлевізійных падзей за ўвесь 2007 год. Такія даныя прадставіў па выніках праведзенага апытання аналітычны цэнтр «ЕсооМ».

14-серыйная гісторыя аб барацьбе з бандытызмам у пасляваеннай Адэсе пабудаваная на рэальных падзеях 1926—27 гг., і нават здымалася ў тых жа мясцінах. Апальны маршал Жукаў у 1946 годзе прызначаны камандуючым Адэскай ваеннай акругай. Прыбыўшы на месца, Жукаў дзіву даецца — у горадзе небывалы ўсплёск крыміналу, адзінай уладай па сутнасці выступае няўлоўны нямецкі шпіён Акадэмік, ды яшчэ банда «Стэпавыя ваўкі» пачала дзёрзка рабаваць ваенныя склады. Дзеля выкаранення злачыннасці маршал сумесна з кіраўніком адэскага крымінальнага вышуку Давідам Гоцманам задумвае складаную небяспечную аперацыю...

Усё гэта — і закручаная інтрыга, і гістарычнасць падзей, і зорны акцёрскі ансамбль (у галоўных ролях Уладзімір Машкоў, Міхаіл Парэчанкаў, Уладзімір Мяньшоў, Сяргей Макавецкі, Святлана Кручкова) — а таксама той факт, што на экраны Беларусі серыял трапіў упершыню — прыцягнула да фільма вялізную глядацкую ўвагу. Больш за тое, частка аўдыторыі нават пасля прагляду серыяла заставалася на Першым, павялічваючы тым самым рэйтынгі інфармацыйнага канала «Панарама». Як адзначаюць сацыёлагі, у выніку амаль трэцяя частка гледачоў краіны глядзела «комплекс» з фільма і «Панарамы», а гэта самы высокі паказчык цікавасці да інфармацыйных праграм за гэты год.

Серыял ужо з поспехам прайшоў ва Украіне, а ў Расіі стартаваў на тыдзень пазней, чым у нас. Дарэчы, крыху раней за фільм убачыла свет кніга «Ліквідацыя», напісаная паводле сцэнарыя Аляксея Паяркова. Прычым аўтарам двухтомнага рамана выступіў беларус — журналіст, дыджэй «Альфа Радыё» Вячаслаў Бандарэнка. «Раман даволі заўважна адрозніваецца ад фільма. У кнізе больш падрабязна прасочваецца лёс галоўных персанажаў, дэталёва прапісаны многія лірычныя сюжэты, больш увагі аддадзена лёсу маршала Жукава», — адзначае Вячаслаў Бандарэнка. Гэтаксама дзякуючы яму ў рамане прысутнічаюць «беларускія матывы» — напрыклад, адзін з герояў узгадвае пра Мінскі оперны тэатр. Іншыя падрабязнасці можна даведацца нават раней, чым скончыцца серыял — двухтомнік «Ліквідацыя», выдадзены ў расійскім выдавецтве «Росмэн» тыражом у 20000 асобнікаў, ужо з'явіўся на прылаўках сталічных кніжных магазінаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Падрабязней пра кнігу чытайце ў наступных нумарах газеты.

ОАО «МИНСКИЙ ПРИБОРОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД»

снимает с открытого аукциона по продаже недвижимости, объявленного 21 ноября 2007 года (газета «Звязда» № 221), здание корпуса № 40.

На открытый аукцион выставляется комплекс зданий № 19 и 19а общей площадью 2 832,2 кв.м. Начальная цена продажи — 8 536 817 240 рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 5 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится 20 декабря 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 19 декабря 2007 г. по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58, комн. 603.

Справки по телефону: 293 94 40, факс: 331 41 97.

Не так даўно я даведалася, што жанчына, якую шмат людзей лічылі добрым, нераўнадушным чалавекам, трапіла ў турму за забойства. Забіла пяцідзесяцігадовая жанчына роднага мужа... Мужчына доўгія гады над ёй здзекаваўся, і вось жанчына не вытрымала... Аб тым, што ў яе сям'і не ўсё ў парадку, яна нікому не гаварыла. Таму і здарылася трагедыя. Як сцвярджаюць псіхолагі, падобных выпадкаў не адзінкі. Не адзінкі тых, хто пакутуе ад «хатняга гвалту». Але чаму такая праблема існуе ў цывілізаваным XXI стагоддзі? Што рабіць, калі такое здарылася з табой: дараваць ці не? Да каго звярнуцца па дапамогу? Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала знайсці адказы на гэтыя пытанні ў тых, хто павінен іх ведаць, згодна са сваімі «прафесійнымі абавязкамі»: міліцыянера, псіхолага і свяшчэннаслужыцеля.

МІЛІЦЫЯ — СЛУЖБА РАТАВАННЯ

На мове міліцыі такі гвалт называецца «бытавым». Пра яго маштабы можна меркаваць па тым, што толькі ў адным гарадскім аддзеле міліцыі Мінска штодня раздаецца 2—3 званкі з просьбай аб паратунку ад блізкага свайго. Часцей за ўсё звоняць жанчыны.

— Такія «скандалы» здараюцца ў тых сем'ях, дзе муж любіць выпіць, — расказвае **Мікалай РУЦКІ, начальнік гарадскога аддзела міліцыі № 2 адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска.** — Прыйшоў п'яны, прапіўшы палову зарплаты, а то і ўсю, і потым збівае больш слабых фізічна: жанчын і дзетак. Гэта проста тыповы выпадак. Цвярозы чалавек дзесяць разоў падумае перад тым як абразіць, зняважыць, ды ўвогуле проста палаюцца. Асноўнай прычынай бытавога гвалту я лічу «зелле». У нашым аддзеле тэлефон разрываецца з пятніцы да нядзелі ўключна — і ўсё скаргі на п'яніц. А палове восьмай раніцы ўжо стаіць чарга ля крамы, і толькі чутна: «Гэй, Вася, я за табой!». Якая карысць з такога чалавека? Няўжо яны думаюць, што жанчыне прыемна ляжаць у ложку з брудным, п'яным мужыком? Мы тлумачым такім гаспадарам, што мужчыну, які не п'е, і жонка любіць, і дзеці паважаюць, і на працы ўсё добра. Але баюся, што гэта трэба было тлумачыць раней, калі яны былі яшчэ хлопчыкамі...

Бытавы, альбо сямейны гвалт — гэта не толькі бойкі паміж мужам і жонкай. Нярэдка руку адзін на аднаго падымаюць браты і сёстры, дзеці і бацькі... Праваахоўнікі не могуць выкінуць з галавы выпадак, які іх асабліва абурыў. На вуліцы Касманаўтаў у Мінску малады чалавек зачыніў на балконе сваю 75-гадовую маці. На дварэ стаяў трыццаціградусны мароз. Жанчына маліла выпусціць яе, плакала, але ён не звярнуў ніякай увагі, дадаў гук тэлевізару, каб маці «не перашкаджала». Старая прасядзела на балконе каля трох гадзін, пакуль хтосьці з суседзяў не пазваніў у міліцыю. Хлопца асудзілі за катаванне.

Звычайна сем'і, у якіх падобнае здараецца рэгулярна, знаходзяцца ў полі зроку ўчастковых. Папярэдзіць злачынства ў некаторых выпадках дапамагаюць адміністрацыйныя пакаранні за хуліганства, за пагрозу забойства, а таксама часовае — ад сутак да 15 — пазбаўленне волі і штрафы.

Ёсць яшчэ адна мера ўздзеяння міліцыянераў на членаў сям'і, якія расперазаліся, — ЛПП. Але туды не адправіш вінаватага адразу. Трэба, каб «выклікаў» міліцыі было некалькі. Ну і, само сабой, гэта датычыцца толькі тых выпадкаў, калі прычына зла — алкаголь.

— Каб абараніць сябе ад катавання, гвалту, не толькі фізічнага, але і душэўнага, трэба гаварыць аб гэтым, не баяцца, — лічыць Мікалай Васільевіч. — Калі людзі звяртаюцца да нас, гэта зусім яшчэ не значыць, што мы будзем саджаць вінаватага чалавека ў турму. Часта можа дапамагчы адумацца проста гутарка. Нельга ахвярам гвалту трымаць усё ў сабе. Вопыт паказвае, што менавіта такім чынам і здараюцца сямейныя трагедыі: ці то ахвяру пакалечаць, ці то яна сарвецца. А тады ўжо цяжка даказаць, што не ты — злодзей.

А АХВЯРА — ХТО?

У псіхалагаў праблема фізічнага гвалту стаіць не так востра.

— Традыцыйна вылучаюць фізічны гвалт, — расказвае **Таццяна ШЫЛА, супрацоўнік Службы дапамогі пацярпелым ад гвалту, кіраўнік грамадскай арганізацыі «Радзіслава».** — Да яго адносяць усё тое, што прыносіць фізічныя траўмы. Напрыклад, прыпякаюць цыгарэтай, колюць рознымі прадметамі, штурхаюць. Аднак, паводле нашай статыстыкі, больш за ўсё звароткаў па праблеме псіхалагічнага гвалту.

Ад яго ў роўнай меры пакутуюць жанчыны, мужчыны, дзеці і пажылыя людзі. Ад ігнаравання — адной з формы псіхалагічнага гвалту, часцей за ўсё пакутуюць дзеці і старыя. Узгаданы Мікалаем Руцкім выпадак на вуліцы Касманаўтаў — прыклад менавіта яго. Служба дапамогі, на жаль, фіксуе падобныя выпадкі нярэдка. Старым іх жа родныя ствараюць невыносныя ўмовы жыцця: закрываюць у пакоі, не даюць ежу, неабходныя лекі і нават магчымасць справіць патрэбу...

Як ні дзіўна, але малыя дзеці пакутуюць прыкладна ад таго ж. Часцей за ўсё такое здараецца, калі адзін з бацькоў заключае новы шлюб і малое выхоўваецца мачыхай ці айчымам. Першы перыяд для таго, хто стварыў новую сям'ю, вельмі важны, і калі дзіця нават і раскажа роднаму, што яго крыўдзяць, то яму ці не паверацца, ці не захочуць паверыць.

— Наша служба вельмі строга захоўвае ананімнасць тых, хто да нас звяртаецца, — гаворыць Таццяна Мікалаеўна. — Таму, калі дзіця ці дарослы звернуцца па дапамогу, але не захочуць, каб пра гэта даведаліся міліцыя, урачы ці ў іншым якімнебудзь ведамстве, то мы нікуды паведамляць не будзем. Проста будзем шукаць іншае выйсце разам.

Такое іншае выйсце аднойчы шукала пятнаццацігадовая дзяўчынка, якая звярнулася па дапамогу да псіхолага. Яна скардзілася на маці. Справа ў тым, што з сям'і сышоў яе тата. Маці вельмі даражыла адносінамі з мужам, таму яго сыход стаў для яе вялікай траўмай. Яна стала піць і жыла абсалютна без эмоцый. Хутка яна страціла сваю добрую працу і пайшла падмятаць вуліцы. У іх доме сталі збірацца яе сабутэльнікі. Адзін з іх быў такі агрэсіўны, што біў маці і нават падняў руку на дзяўчынку. Тая не разгубілася і выклікала міліцыю. Да іх стаў прыходзіць участковы, размаўляць з маці, але сітуацыя ніяк не змянялася. Сапраўды, участковы не можа знаходзіцца

Фота Марыі БЕГУНКОВАЙ.

круглыя суткі ў іх доме, каб абараніць дзяўчынку.

У падлетка не было добрага адзення, харчавалася яна чым прыйдзецца, у школе з яе сталі смяяцца... Дзяўчынка была ў адчаі. Яна хацела жыць, вучыцца, апранацца і есці, як усе нармальныя людзі. А чым дарослыя могуць дапамагчы ў такой сітуацыі?

Закон не дазваляе пазбавіць бацькоўскіх правоў маці дзяўчынкі, бо яна працуе і быццам бы выконвае свае абавязкі...

Аднак дзяўчынка сама падказала выйсце псіхолагам, таму што па натуры была валявой і моцнай. Яна хацела змяніць сітуацыю не на словах... Гатова была ахвяраваць сваёй марай пасля школы паступіць у інстытут і жыццём у сталіцы. Пасля заканчэння дзевятага класа яна паступіла ў ПТВ іншага горада. Толькі так яна магла атрымаць інтэрнат і стыпендыю. Свае крыўды на маці дзяўчынка вырашыла спакойна «прыняць» — яна не можа змяніць яе ні крыкам, ні плачам, ні размовамі. Падлетак паставіў перад сабой мэту пасля ПТВ паступіць у ВНУ і жыць...

Гвалт можа быць настолькі шматгранным і шматлікім, што цяжка бывае разабрацца, дзе ахвяра, а дзе вінаваты. Шантаж: «Скончу жыццё самагубствам, калі ты са мной развядзешся!», маніпуляцыя: «калі ты гэта не зробіш, то больш не дам сустракацца з дзіцем» . Апошнім часам прычынай частых звароткаў людзей да псіхолагаў стаў эканамічны гвалт. Звычайна з гэтай нагоды звяртаюцца людзі, якія не працуюць і залежаць фінансава ад іншых.

Муж і жонка разам вырашылі, што жанчыне трэба звольніцца з працы, таму што з іх малым здарылася гора — ён стаў інвалідам. Жанчына выпала са звыклага асяроддзя. На працягу доўгага часу яна мела зносіны толькі з урачамі і такімі ж маці, як сама. Яе кругагляд стаў настолькі вузкі, што яна толькі і магла гаварыць аб хваробе свайго дзіцяці. Мужчыну гэта раздражняла. Яму хацелася б пагаварыць і на іншыя тэмы, увогуле яна яму была патрэбная не толькі як маці хворага дзіцяці, але як жанчына, жонка, сябар. У хуткім часе ў сям'і наступіў крызіс. Муж стаў папракаць жонку тым рашэннем, якое яны прынялі разам, маўляў, ты сядзіш на маёй шыі. Псіхолагам спатрэбілася правесці з гэтай сям'ёй не адну кансультацыю, каб кожны з іх убачыў, што здарылася з імі.

— Праблема гвалту ў сям'і абмяркоўваюцца ва ўсім свеце дзесяцігоддзямі, — расказвае Таццяна Мікалаеўна. — Была распрацавана тэорыя, што існуе нейкі ген агрэсіўнасці. Маўляў, гэта не гвалтаўнік дрэнны, сутнічае ў вашым жыцці. Не вельмі жадаеце звярнуцца да свяшчэннаслужыцеляў? Звяртайцеся ў міліцыю ці да псіхолагаў.

Архімандрыт Аляксей лічыць, што ўжо шмат беларускіх мужчын згубілі сваю мужчынскую прывабнасць. Прычыны гэтаму не толькі алкагалізм, але здрадніцтва і нявернасць сваёй жонцы, сям'і, дзецям. За тое, што ў многіх сучасных сем'ях пакутуюць ад гвалту, увогуле за «хваробы» сям'і — нясе адказнасць мужчына. Жанчына, за рэдкім выключэннем, застаецца ахвярай, нават калі сама — ініцыятар разводу. Яна спрабуе зберагчы дзяцей. Жанчына з дзецьмі — гэта хоць і няпоўная, але сям'я.

— Нягледзячы на тое, што мы ганарымся сваёй талерантнасцю, цярпімасцю, да заходняй сацыяльнай культуры нам, на маю думку, вельмі далёка. Я некаторы час жыў у Канадзе і бачыў, наколькі дзяржава там клапоціцца аб сям'і, — узгадвае святар. — Калі сям'я падае на развод, яна адразу трапляе ў поле зроку і сферу клопату псіхолага і псіхааналітыка, прадстаўніка сацыяльнай службы і свяшчэнніка. Да таго ж там існуе шмат законаў, якія садзейнічаюць умацаванню сям'і: розныя праграмы дапамогі сем'ям, праграмы падтрымкі бацькоў, аховы дзяцей. І вельмі строгі закон, які закранае любое праяўленне непавагі ці жорсткасці адзін да аднаго. Нават калі ты павысіш голас у грамадскім месцы, тут жа на цябе звернуць увагу і спытаюць:» У вас нейкія праблемы?»

Архімандрыт Аляксей упэўнены, што адна з галоўных прычын гвалту — страта сваёй спрадвечнай нацыянальнай сямейнай культуры ў зносінах. У гэтым не маленькую ролю сыгралі і СМІ. Чалавек бярэ за аснову тое, што яму навязваюць электронныя СМІ, у першую чаргу — тэлебачанне. Нават інфармацыйныя праграмы пачынаюцца з аповеду пра трагедыі і гаворыцца пра гэта без эмоцый, ніякага спачування.

— Я не кажу пра тое, што людзі паглядзелі нейкі фільм па тэлебачанні і сталі жорсткімі, — дадае архімандрыт Аляксей. — Гэта робіцца паступова, маленькімі крокамі: у адным фільме мужчына ўдарыў жанчыну, у другім пабілі дзіця. Чалавек да гэтага прывыкае!

Царква раіць сучаснай сям'і менш глядзець тэлебачанне, больш чытаць разам добрыя кнігі, якія могуць аб'яднаць усіх сямейнікаў. У нягодах сумеснага жыцця часта дапамагае разабрацца сямейны духоўнік. Гэта свяшчэннаслужыцель, які добра ведае ўнутраны стан мужа, жонкі, іх дзетак, ён дапамагае ўбачыць і выкараніць тыя заганы, якія адмоўна ўплываюць на чалавечае жыццё.

Пазбегнуць гвалту дапамагае таксама самаадукацыя. Не трэба ненавідзець чытаць сямейныя дапаможнікі, апрабаваныя нашай практыкай духоўныя кнігі аб сямейным жыцці і выхаванні дзяцей.

— Аднак чытаць трэба ўважліва, — гаворыць архімандрыт Аляксей. — Нашы мужчыны любяць узгадваць, быццам бы жонкі павінны быць ім пакорныя, маўляў, так у Біблії напісана. І сапраўды, там напісана. Але першае пасланне апостала Пятра гаворыць не толькі аб пакорнасці, і не толькі пра жонак. Там напісана: «Таксама і вы, мужья, обращайтесь благоразумно с жёнами, как с немощнейшим сосудом, оказывая им честь, как сонаследницам благодатной жизни...».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Анталогія беларускай песні

У нашым сяле свадзьба будзе

Народная песня «У нашым сяле свадзьба будзе» весела гучыць і на канцэртах оперных спевакоў, і за бяседным сталом, дзе заводная кампанія дасціпным жартам выказвае свае намеры-жаданні, і ля ўтульнага вогнішча юных вандроўнікаў. З задавальненнем гэтую песню слухаюць і спяваюць дарослыя, моладзь і нават дзеці. Яна пашырана ў памежных расійскіх і ўкраінскіх раёнах. Апрацоўку мелодыі зрабіў Аляксей Туранкоў і іншыя кампазітары.

Міхась ШАВЫРКІН.



Ой, ды ў нашым сяле
Свадзьба будзе. Гэй! Гэй!
Ў нашым сяле свадзьба будзе
Камар муху сватаць. Так!

Ой, ды камар муху
Спадабаў. Гэй! Гэй!
Камар муху спадабаў,
Гарэлкаю часцаваў... Ўпіўсь.

Ой, ды ляжыць камар
Ды не дыша. Гэй! Гэй!
Ляжыць камар ды не дыша,
Ручак, ножак не калыша. Спіць.

Ой, ды скуль ўзяліся
Ды дзве мухі. Гэй! Гэй!
Скуль ўзяліся ды дзве мухі,
Узялі камара пад рукі. Ўстаў.

Ой, ды ў нашым сяле
Свадзьба будзе. Гэй! Гэй!
Ў нашым сяле свадзьба будзе,
Камар муху сватаць будзе. Ўзяў!

POST factum

КРАКАДЗІЛ ВЫРАТАВАЎ СВАЙГО ГАСПАДАРА АД КВАТЭРНЫХ ЗЛАДЗЕЯЎ

Любоў расіяніна да экзатычных жывёл выратавала ягоную кватэру ад рабаўнікоў. Афрыканскі двухметровы кайман па мянушцы Гена жыве ў сям'і Васторнікавых ужо тры гады, і за гэты час стаў усеагульным любімцам, нягледзячы на свой не зусім дружалюбны выгляд.

Гена свабодна перамяшчаецца па кватэры з ранняга ўзросту, але на людзей ніколі не нападаў. Аднак калі аднойчы ноччу ў кватэру забраліся зладзеі, кракадзіл прымусіў іх ратавацца ўцёкамі. «Наогул, дзікія кайманы вельмі небяспечныя драпежнікі, але Гена прывык да нас і даўно стаў хатняй жывёлай, — расказвае Віктар Васторнікаў. — Ён і ў туалет ходзіць сам, і харчуецца ў адным і тым жа месцы».

На нязваных гасцей кракадзіл зрабіў незабыўнае ўражанне — зладзеі ўцякалі, кінуўшы на месцы злачынства свае адмычкі і іншыя рэчы.

СУДДЗЯ З ІНДЫІ ПАПРАСІЎ ДВУХ БАГОЎ «АСАБІСТА З'ЯВІЦЦА Ў СУД»

Двое індуісцкіх багоў, Рама і Хануман, выкліканы ў суд, каб дапамагчы разабрацца ў перыпетыях складанай справы аб уласнасці на зямлю.

«Асабіста з'явіцца ў суд папулярных індуісцкіх багоў праз мясцовую прэсу папрасіў суддзя Суніл Кумар Сінгх. Ён старшынствуе на працэсе, які праходзіць у Штаце Джаркхвнд на ўсходзе краіны. Дыспут, які спрабуе вырашыць суддзя Сінгх, цягнецца ўжо 20 гадоў, ён датычыцца ўчастка зямлі плошчай паўгектара. На гэтым участку стаяць два храмы, адзін прысвечаны Раме, другі — Хануману, богу з чалавечым целам і тварам малпы. Манмахан Патак, настаяцель храма, у якім моляцца Хануману, сцвярджае, што зямля належыць яму — на той падставе, што адзін махарадж калісьці падарыў яе яго дзеду. Мясцовыя жыхары, аднак, з гэтым не згодныя і лічаць, што зямля належыць абодвум боствам.

Азнаёміўшыся са справай, суддзя вырашыў задаволіць просьбу абароны. «Раз гэтая зямля аддадзена багам, трэба, каб яны былі прадстаўлены на працэсе» — так растлумачыў сутнасць патрабаванняў адвакат Біджан Равані. У выніку суддзя Сінгх накіраваў абодвум багам па пісьму, але яны вярнуліся аўтару з паметкай «адрасат не знойдзены». І тады суддзя апублікаваў у мясцовых газетах позвы на імёны Рамы і Ханумана.

МЫЛА — АТРУТА?

Даследаванне Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Дэвісе дало нечаканы вынік: як аказалася, кампанент мыла, шампуні, ласьёнаў і інш, які масава выкарыстоўваецца, здольны крайне негатыўна паўплываць на здароўе чалавека. Падобнае ўздзеянне гэтага рэчыва выяўлена ўпершыню.

Гаворка ідзе аб антыбактэрыяльным рэчыве трыклакарбане, які ў краінах Паўночнай Амерыкі, Еўропы і Азіі на працягу паўстагоддзя выкарыстоўваецца пры вытворчасці касметычных і пральных сродкаў. Лабараторныя даследы паказалі, што трыклакарбан негатыўна ўплывае на эндакрынную сістэму паддоследных пацукоў і клетак чалавека. Раней было даказана, што рэчывы, якія валодаюць падобнымі ўласцівасцямі, спрыяюць узнікненню анкалагічных захворванняў, зніжаюць рэпрадуктыўныя здольнасці, а ў дзяцей здольныя выклікаць паталогіі развіцця.

МІХАЭЛЬ ШУМАХЕР ПАКАЗАЎ КЛАС ВАДЗІЦЕЛЮ ТАКСІ

Ніхто не давязе цябе да пункта прызначэння хутчэй, чым ты сам, асабліва калі ты — Міхаэль Шумахер. Як паведамляе агенцтва Бі-бі-сі, сямікратнаму чэмпіёну «Формулы-1» давялося на адну гадзіну стаць таксістам у горадзе Кобургу, каб своечасова даставіць сябе ж у аэрапорт.

Нямецкі таксіст быў нямала здзіўлены, калі сам Міхаэль Шумахер, спазняючыся ў аэрапорт, захацеў змяніць яго за рулём аўтамабіля. «Я аказаўся пасажырам, і гэта было даволі дзіўна, але атрымаць Шумі ў якасці ўласнага вадзіцеля — гэта было неверагодна, — кажа таксіст Тунсер Ільмаз. — Ён на поўнай хуткасці праходзіў павароты і рабіў абгоны ў самых складаных месцах».

У баварскі горад Кобург Шумахер з жонкай і дзецьмі прыляцеў за шчанюком аўстралійскай аўчаркі па мянушцы Эд. Забраўшы шчанюка, гоншчык з сям'ёй вяртаўся ў мясцовы аэрапорт і спазняўся на самалёт. У выніку таксіст атрымаў не толькі ўрок ваджэння ад аднаго з найлепшых гоншчыкаў у свеце, але і 60 еўра — за паездку і 100 еўра — чаявых.

УСЕ МАРЫІ І ІОСІФЫ Ў ГАТЭЛІ БУДУЦЬ ЖЫЦЬ БЯСПЛАТНА

У Вялікабрытаніі адна з сетак гатэляў прапанавала ўсім жанатым парам — Марыям і Іосіфам — бясплатнае пражыванне ў сваіх нумарах па ўсёй краіне у калядную ноч, перадае агенцтва АР.

«Сёлета мы вырашылі вярнуць Калядам іх сапраўдны дух і запрасіць Марый і Іосіфаў да сябе ў госці», — заявіў прадстаўнік сеткі Джэсан Кота. Каб скарыстацца гэтай прапановай, Марыі і Іосіфы павінны быць афіцыйна жанатыя, мець з сабой адпаведны дакумент і зарэгістравацца праз спецыяльны адрас электроннай пошты.

БЛАКІТНАВОКІЯ ЛЮДЗІ З'ЯВІЛІСЯ ПАЗНЕЙ ЗА ЎСІХ

Людзі з блакітнымі вачыма з'явіліся ўсяго 10 тысяч гадоў таму. Як перадае радыё «Эхо Москвы», да такой высновы прыйшлі амерыканскія генетыкі ў выніку даследавання так званага «атлантычнага спадчыннага генома».

Першапачаткова, як сцвярджаюць вучоныя, усе людзі на планеце былі з цёмнымі вачыма, якія яны атрымалі ў спадчыну ад агульных афрыканскіх продкаў. Змяненне колеру чалавечых вачэй было выклікана эвалюцыяй чалавека, абумоўленай натуральным адборам. У ходзе гэтага працэсу некаторыя людзі сталі ўжываць у ежу малако каровы, якое ў той перыяд не прызнавалася ядомым прадуктам. Аналіз чалавечых астанкаў эпохі неаліту гаворыць аб тым, што прыблізна да 5-га тысячагоддзя да н.э. людзі проста не ўмелі засвойваць малако. У выніку ў тых, хто перайшоў з вады на малако, пачалася бурная генная мутацыя арганізма.

Тым не менш, менавіта яны атрымалі перавагу ў барацьбе за выжыванне па некалькіх прычынах: малако, у адрозненне ад вады, не было заражана паразітамі, акрамя таго, малочная «дыета» забяспечвала чалавечы арганізм неабходнай колькасцю кальцыю і вітаміну Д.

ШАХМАТЫ *Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 11. Мат за 4 хады. (3+2).



Заданне № 12. Мат за 4 хады (5+13).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Змяшчаем рашэнні пачатковых кампазіцый конкурсу рашэнняў , апублікаваных 16 і 21 лістапада.

№ 1. 1. Фа4!

№ 2. 1. Крg5!

№ 3. 1. Фf6!

№ 4. 1. Ла1! Кр:а1 2. Крb3: 1. ... Крс2 2. Лad1.

№ 5. 1. Cf7! ~~ 2. Фf6+, 1. ... C:f4 2. Ф:h7, 1. ... Kb3 2. K:h3 1. ... Ce3 2. Ke2! 1. ... Л~~ 2. Kh5.

Актыўна на конкурсныя заданні адказы дасылаюць наступныя ўдзельнікі: Альберт Літвінаў (Мінск), Іван Козел (Мазырскі раён), Генадзь Мігаль (Кобрын), Алег Чарневіч (г. Барань), Віктар Быкаў (Мінск), Эдуард Крайко (Мінск), Сяргей Гурыновіч (Мінск), Юрый Бандарэнка (Магілёў), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Пётр Шчамялёў (Бялыніцкі раён), Аляксандр Марцуль (Шчучынскі раён) і іншыя.

ЗАПРАШАЕМ ДА ЎДЗЕЛУ!

Рэдакцыя часопіса «Проблемист Украины» аб'явіла тэматычны конкурс складання трохходовак на тэму «Далёкая перамена», якую аўтар В. Мельнічэнка сфармуляваў такім чынам: «Не меней, чым у дзвюх фазах і, па меншай меры, у двух тэматычных варыянтах мяняюцца матуючыя хады пры нязменных хадах чорных і іншых белых фігурах».

Прыклад. Белыя: Крс1, Лс3, Са7, Cg4Kb3, Kf7, пп. b5, f2, g5, h3 (10). Чорныя: Крe4, Ch1, Kb1, Kh4, пп. a2, d5, e7. f4. g5 (9). Мат за 3 хады.

Рашэнне: 1. ... K:c3 2. Kd2+ Kpd3 3. Kte5x, 1. .. d4 2. Kc5+ Kpd5 3. Ce6x, 1. Ce2! ~~ 2. f3+ 3. Cd3x, 2. ... Kpf5 3. Ke4x, 1. ... K:c3 2. K:d2+ Kpf5 3.Cg4x, 1. ... d4 2. Kc5+ Kpd5 3. Cc4x.

Творы дасылайце да 31 студзеня 2008 года на адрас суддзі: Віктар Мельнічэнка, а\с 11, 66302, г. Котовск, Одесская область, Украіна, часопіс «Проблемист Украины». Вынікі конкурсу будуць дасланыя ўсім удзельнікам спаборніцтва.

АБВІНАВАЧВАЕЦЦА Ў СЕРЫІ ЗГВАЛТАВАННЯЎ

У Гомельскім раёне затрыманы 38-гадовы мясцовы жыхар, які падазраецца ва ўчыненні не менш за 10 згвалтаванняў. Па шэрагу фактаў яму ўжо прад'яўлена абвінавачанне, паведаміў начальнік аддзела па наглядзе за расследаваннем крымінальных спраў у органах пракуратуры Гомельскай вобласці Анатоль Кондак.

Ён адзначыў, што ў пракуратуры на пастаянным кантролі знаходзяцца нераскрытыя крымінальныя справы такога характару, незалежна ад тэрміну даўнасці. Аналіз некалькіх падобных спраў даў падставу меркаваць, што злачынствы ўчынены адным чалавекам. Супадзенне шэрагу фактаў, у тым ліку і вынікаў экспертызы крыві і біялагічных рэштак, дазволілі супрацоўнікам крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама і следству пракуратуры ўстанавіць асобу, якая падазраецца. Ёю аказаўся неаднойчы раней судзімы за згвалтаванні.

Мяркуецца, што ўказаныя злачынствы ўчыняліся ім на працягу некалькіх гадоў. Ахвярамі станавіліся жыхаркі розных раёнаў вобласці пераважна ва ўзросце да 30 гадоў.

Пракуратура вобласці працягвае расследаванне.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ВЫТВОРЧЫ КААПЕРАТЫЎ «ГРЫЦКЕВІЧЫ»

ГАСПАДАРЫЦЬ НА ЗЯМЛІ ДОБРА — ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ ГАСПАДАРЫЦЬ ЭФЕКТЫЎНА

«Каб мець вялікі «вал», неабавязкова мець вялікія плошчы», — зазначае кіраўнік гаспадаркі «Грыцкевічы» Нясвіжскага раёна Уладзімір Малахвей.

СВК «Грыцкевічы» ўжо на працягу многіх гадоў уваходзіць у лік 50 лепшых гаспадарак краіны. Адпаведны рэйтынг складваецца па суме прыбытку на кожны бала-гектар. Гэта асноўны ацэначны паказчык. Для параўнання. Праўда, як добра вядома, усякае параўнанне кульгае. Кульгае і гэтае. Большая колькасць гаспадарак, якія знаходзяцца ў гэтым рэйтынгу наперадзе СВК «Грыцкевічы», маюць у сябе, дадаткова, прамысловую перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. Зразумела, што, прапаноўваючы спажыўцам гатовую прадукцыю ў выглядзе каўбасы або яек, яны ў выніку маюць і непараўнальна большую масу прыбытку, адпаведна, і значна большую колькасць яго на кожны бала-гектар. Карацей кажучы, калі выключыць з гэтых разлікаў прамысловую перапрацоўку, мог бы апынуцца СВК «Грыцкевічы» недзе ў першай дзесятцы лепшых.

Тым не меней нават з улікам указаных асаблівасцяў рэйтынгу па выніках мінулага года займаюць «Грыцкевічы» 45-е месца. Нагадаем, у цэлым сярод гаспадарак краіны, якіх у нас недзе каля 2 тысяч. А па выніках гэтага года, якія ўжо хутка павінны быць падведзены, у гаспадарцы разлічваюць значна павысіць свой рэйтынг.

Дзень сённяшні

І гэта ўпэўненасць грунтуецца не на голым месцы. Так, калі ў мінулым годзе ў СВК «Грыцкевічы» мелі 11 950 рублёў прыбытку на кожны бала-гектар, то сёлета наблізіліся да мяжы ў 20 тысяч. Дарэчы, наконт таго, як гаспадараць у «Грыцкевічах», яскрава сведчаць наступныя лічбы. Напрыклад, летась тут дасягнулі ўраджайнасці збожжавых 81,7 цэнтнера з гектара (нават у сёлетнім засушлівым годзе ў гаспадарцы атрымалі па 61,6 цэнтнера). У «Грыцкевічах» надойваюць ад свайго немалога малочнага статку (950 галоў) каля 7 тысяч кілаграмаў малака ў сярэднім на карову.

У кабінеце кіраўніка СВК «Грыцкевічы» Уладзіміра Уладзіміравіча Малахвея на сцяне вісіць разгорнутая табліца-дыяграма, у якой адлюстраваны вынікі работы гаспадаркі па гадах. Прасочым дынаміку эканамічнага развіцця гаспадаркі за 2000-я гады. Пры гэтым спачатку назавём асноўныя накірункі яе дзейнасці — гэта вырошчванне збожжавых (пераважна пшаніцы), цукровых буракоў і вытворчасць малака (а яшчэ тут трохі займаюцца, як зазначаюць у самой гаспадарцы, вырошчваннем і племянным продажам маладняку ад сваіх высокапрадукцыйных кароў — па 100—150 галоў у год). Такім чынам, калі ў 2001 годзе «вал» збожжавых склаў у гаспадарцы 4815 тон, то цяпер тут дасягнулі 7200 тон. Цукровых буракоў у 2001 годзе сабралі каля 10 тысяч тон — цяпер збіраюць каля 20 тысяч, малака ў тым жа 2001 годзе надаілі 3800 тон — цяпер надойваюць каля 7 тысяч тон. Аднак самае галоўнае: цяперашні, непараўнальна большы «вал» бярэцца амаль выключна за кошт павелічэння прадукцыйнасці кожнага гектара зямлі і кожнай галавы малочнага статку, за кошт павышэння эфектыўнасці гаспадарання. Так, напрыклад, пад збожжавыя ў гаспадарцы адводзілася ў 2001 годзе 906 гектараў, у апошнія гады адводзіцца па 850. Гэта зарыентаванасць на атрыманне максімальнай аддачы, па сутнасці, накіроўвае ўсе дзеянні і рашэнні кіраўніцтва гаспадаркі, у якой, дарэчы, даволі часта спасылаюцца на лепшы замежны вопыт. А разам з тым і пераймаюць яго. Можна меркаваць, што такая зарыентаванасць мае ў сваёй аснове, разам з імкненнем гаспадарыць як мага больш эфектыўна, і тое, што гаспадарка валодае адносна невялікімі зямельнымі ўгоддзямі. Так, усіх сельскагаспадарчых угоддзяў у яе каля 2250 тысяч гектараў, у тым ліку каля 1900 гектараў ворнай зямлі. У сувязі з гэтым варта прывесці наступны вельмі цікавы факт, які зусім не характэрны для нашай сельскай рэчаіснасці. Гаспадарка шмат будуе жылля для сваіх работнікаў (і пра гэта яшчэ будзе сказана напярэдадзе). Дык вось, тут пры гэтым, каб пры будаўніцтве эканоміць тую ж зямлю, не займаць новыя ўчасткі, а нават ідуць на знос старых вясковых дамоў (калі на гэтыя дамы не прэтэндуюць нашчадкі). Напэўна, не заўсёды сустрэнеш такія адносіны да зямлі нават у нашых буйных гарадах. Як заўсёды лічылася, яе ў нас хапае... Словам, вельмі бераслівa ставяцца ў «Грыцкевічах» да зямлі. Зямля, нагадвае Уладзімір Малахвей, — гэта асноўная крыніца ўсіх нашых даброт.

Але вось пры гэткім дакладным разуменні, таксама гаворыць ён, мы, па сутнасці, яшчэ не навучыліся найбольш правільна і эфектыўна апрацоўваць яе. З тым, каб атрымаць ад яе тую ж максімальную аддачу. Так было некаторы час таму і ў «Грыцкевічах». Але апошнім часам стаўленне да апрацоўкі глебы, як падкрэслівае кіраўнік, тут кардынальна змянілася. У першую чаргу скарацілі тэхналагічныя праходы па полі і ў выніку зменшылася ўздзеянне на глебу. Для гэтага добра служыць сучасная глебаапрацоўчая тэхніка. Кіраўнік гаспадаркі і яе галоўны аграном Іван Валетаў, галоўны інжынер Міхаіл Цыуля пералічвалі толькі апошнія набыткі: тры абаротныя плугі, шыроказахватныя сеялкі, сеялка суцэльнага пасеву... На вартасцях апошняй сеялкі можна асобна спыніцца. Гэта — дыскавая сеялка, якая выключае папярэдняе ўзорванне глебы, — яна сваімі дыскамі толькі пракладвае радкі для зерня пад новы ўраджай, сее прама па іржышчы. Толькі ў гэтым годзе яе апрабавалі — заклалі збожжавы клін у 70 гектараў: усходы — выдатныя.

— Менавіта на падобную, максімальна найбольш лёгкую апрацоўку глебы і належыць рабіць ухіл, — падкрэслівае Уладзімір Малахвей. — Зямля — яна як той жывы арганізм: улез у яго з хірургічным інструментам — не заўсёды нешта добрае можа атрымацца. Трэба як мага менш траўмаваць зямлю і рабіць як мага большую паверхневую апрацоўку яе. Зямлю трэба не проста любіць, але і ўмела абыходзіцца з ёй...

Для вырошчвання цукровых буракоў у гаспадарцы набылі 18-радковую, таксама эфектыўную, сеялку. Гаспадарка мае ўвесь набор высокапрадукцыйных агрэгатаў для нарыхтоўкі сена і сенажу. У пазалеташнім годзе ўзялі ў лізінг знакаміты нямецкі камбайн «Кляйнэ» для ўборкі цукровых буракоў. У выніку непараўнальна павысілі як эфектыўнасць, так і якасць усёй работы. Так, калі раней на ўборцы буракоў былі заняты дзесяткі людзей, то цяпер з усім добра ўпраўляюцца ўсяго некалькі механізатараў. У планах — набыццё ўборачнай тэхнікі для іншых мэтаў, у прыватнасці камбайна «Палессе 800 Е», які не ўступае замежным аналагам. У гаспадарцы вырошчваюць таксама кукурузу, якая добра папаўняе кармавую базу. Пры гэтым сёлета атрымалі такую кукурузу, якую «не ў стане ўзяць нашы звычайныя гомельскія камбайны»... Увогуле, кукуруза лічыцца ў гаспадарцы таксама ў ліку асноўных, валаўтваральных, культур. Прычым сёлета ў «Грыцкевічах» з дапамогай яе не толькі поўнасцю забяспечылі кармавы баланс для сваёй жывёлы, але таксама значную частку кукурузнага поля адпусцілі пад уборку зерня. І атрымалі апошняга паўтары тысяч тон пры ўраджайнасці 123 цэнтнеры з гектара. Па эфектыўнасці вырошчвання гэтай культуры гаспадарка выйшла на першае месца ў вобласці.

Ад дабра дабра не шукаюць

Аднак справы вытворчыя — гэта, зразумела, вельмі важна, але ж не дзеля самой вытворчасці жыве чалавек. Ды і ўвогуле, як зазначае кіраўнік гаспадаркі, трэба ва ўсіх напрамках развівацца... Як жывуць, развіваюцца ў «Грыцкевічах», так сказаць, у сацыяльным плане? Вось менавіта з гэтага, можа, і трэба было пачынаць увесь наш матэрыял. І ў першую чаргу расказаць пра тое, як тут клапоцяцца пра забеспячэнне сваіх работнікаў добраўпарадкаваным жыллём. А тут за ўвесь час узведзена 170 індывідуальных дамоў. У апошніх ёсць газ, вада, некаторыя з іх забяспечаны і цэнтралізаванай каналізацыяй. Праўда, Уладзімір Малахвей пры гэтым заўважае: яшчэ не закрылі жыллёвую праблему, 16 чалавек на чарзе, з іх пераважна маладыя людзі, якія ахвотна застаюцца ў вёсцы.

Працаўнікі «Грыцкевічаў», акрамя заработнай платы, якая склала сёлета ў сярэднім больш за 500 тысяч рублёў, таксама маюць ад гаспадаркі (для ўтрымання сваёй жывёлы) па 2,5 тоны сена, буракі, жамерыны, канцэнтраты, збожжа (да 2 тон на аднаго працуючага). А яшчэ па меху бясплатнага цукру і г.д.

«Грыцкевічы» практычна сталі кузняй падрыхтоўкі айчынных чэмпіёнаў. У прамым сэнсе. Можа, у гэтым сказваюцца не зусім рэалізаваныя магчымасці самога кіраўніка, які хацеў выбраць спартыўны шлях, шмат займаўся спортам, а атрымалася так, што выбраў цяперашнюю дарогу, — але для тых у гаспадарцы, хто хоча займацца спортам, створаны самыя спрыяльныя ўмовы. А адсюль і тыя ж чэмпіёны. Назавём асобных з іх (усе яны пачыналі свой шлях на п'едэстал у «Грыцкевічах», калі вучыліся ў мясцовай школе): Аляксандр Кузьмін — чэмпіён маладзёжных Алімпійскіх гульняў у Маскве, майстар спорту міжнароднага класа (вучыцца цяпер у гродзенскім універсітэце на аддзяленні фізкультуры), Дзмітрый Паляшчук — майстар спорту па біятлоне, член юніёрскай каманды рэспублікі, чэмпіён рэспублікі (вучыцца ва ўніверсітэце фізкультуры), Аляксей Шарапа — кандыдат у майстры спорту па біятлоне, біятланісты-першаразраднікі Сяргей Раманоўскі, Віталій Цыуля... У «Грыцкевічах» расказваюць: быў час — даходзілі выхаванцы Міхаіла Палешчука, які працуе настаўнікам фізкультуры ў мясцовай сярэдняй школе, да рэспубліканскіх спаборніцтваў, а там да іх гэткае каварнае пытанне: «Прабачце, а дзе вы трэніруецеся? У Грыцкевічах? Нам пра іх нічога невядома». Ну а калі невядома, то і пропуску на спаборніцтвы няма... Цяпер у Грыцкевічах выправілі становішча: набыла іх мясцовая школа статус дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы.

Падчас нашага знаёмства са спартыўнай базай гаспадаркі, няйначай, вельмі ўдала скарыстаў момант Міхаіл Паляшчук: «Уладзімір Уладзіміравіч, а як наконт яшчэ 5 пар лыжаў?». «Будуць лыжы, абавязкова», — памятае пра сваё абяцанне кіраўнік. Ну, а бяруць тут лыжы, так сказаць, высокапрафесійныя: па 1,5 мільёна рублёў адна пара каштуе.

Гаспадарка мае ў сваім арсенале выдатную спартзалу, уласную лыжную трасу, «амаль што гарналыжную», на чарзе — будаўніцтва сучаснага стадыёна. А яшчэ ў гаспадарцы пералічваюць: трэба да лыжнай трасы асфальт пакласці, пры пральным камбінаце басейн пабудаваць... Словам, такія вось гаспадарчыя клопаты. А яшчэ ў Грыцкевічах думаюць пра тое, каб наладзіць у сваёй мясцовасці агратурызм... Дарэчы, мы з калегам на ўсё гэта амаль усур'ёз сказалі: калі раптам задумаеце сваё нейкае друкаванае выданне — не забудзьцеся пра нас. Праўда, калі ўжо зусім сур'ёзна: не так лёгка ў Грыцкевічах і ўладкавацца — цякучасць кадраў тут практычна нулявая. Што, увогуле, і не дзіўна: ці шмат можна сустрэць людзей, якія ад дабра дабра шукаюць?.. Цяпер шмат гаворыцца пра адраджэнне вёскі і шмат чаго ў гэтым накірунку робіцца. Вядома, з дапамогай дзяржавы. У сувязі з гэтым можна смела сказаць: калі мець у дадзеным выпадку нейкі канкрэтны ўзор, то за гэты ўзор можна беспамылкова браць СВК «Грыцкевічы».

Вабіць людзей нясвіжская зямля

Можна яшчэ нямала чаго павучальнага прывесці з вопыту СВК «Грыцкевічы». Напрыклад, тут цяпер робяць цеплавую рэабілітацыю сваёй канторы, а разам з тым і некаторых вытворчых памяшканняў. У тым ліку рамонтнай майстэрні. У сувязі з гэтым у асобных працаўнікоў з'явілася такое пытанне: навошта ў майстэрні ставіць пластыкавыя вокны? Ды таму, што ўмовы працы для ўсіх павінны быць аднолькавымі, і аднолькава добрымі, лічыць кіраўнік... Ужо зразумела, пад добрай апекай СВК знаходзіцца мясцовая сярэдняя школа (дакладней, на тэрыторыі СВК ёсць яшчэ і пачатковая школа, і яе таксама не абышлі ўвагай). Удзячныя СВК і мясцовыя вернікі — гаспадарка аказала немалую дапамогу ў рэканструкцыі іх храма ў самой вёсцы Грыцкевічы (адсюль, як зразумела, і назва СВК).

Аднак трохі скажам пра самога кіраўніка. Уладзімір Уладзіміравіч Малахвей родам з Нясвіжчыны і моцна любіць свой нясвіжскі край, добра ведае яго сучаснасць і гісторыю. Як зазначалася ўжо, некалі думаў ён пра спартыўную кар'еру, але лёс распарадзіўся інакш. У свой час закончыў ён ветэрынарны інстытут, шмат часу працаваў у цяперашняй гаспадарцы спецыялістам, а з 2002 года кіруе ёй. І цяпер удзячны таму ж лёсу, хоць, вядома, сельскагаспадарчая справа — намнога больш складаная. Тут патрэбны не толькі адпаведнае ўменне і адказнасць; тут, калі карыстацца спартыўнай тэрміналогіяй, часам і ўдар трэба добра ўмець трымаць. Затое колішнюю задуму Уладзіміра Уладзіміравіча цяпер паспяхова рэалізоўваюць дзве дачкі, якія вучацца ў Акадэміі спорту; яшчэ адна, старэйшая, закончыла ўніверсітэт культуры. Тут жа, у СВК «Грыцкевічы», працуе ветфельчарам жонка Уладзіміра Уладзіміравіча; пасаду галоўнага ветэрынарнага ўрача ў гэтай жа гаспадарцы займае яго брат. Нягледзячы на тое, што іншую сферу дзейнасці выбралі дочкі Уладзіміра Уладзіміравіча, тым не менш моцныя сельскагаспадарчыя карані пусціў на нясвіжскай зямлі род Малахвеяў.

А ўвогуле, у СВК «Грыцкевічы», як звяртаюць тут асаблівую ўвагу, нямала працоўных дынастый. Пайшлі па слядах сваіх бацькоў, былых механізатараў, Генадзь і Мікалай Сяргеі, Аляксандр і Аркадзь Плоткі, Васіль і Сяргей Гаспадарыкі, Аляксандр Заяц, Мікалай Казакевіч, якія таксама працуюць механізатарамі. Атрымалі ў спадчыну прафесію жывёлавода Ірына Громка, Валянціна Мойсік, Яўгенія Богуш. А Чарнабаі — Леанід Антонавіч і Святлана Аляксееўна і іх тры дачкі Галіна, Алена і Святлана і цяпер ходзяць на ферму вялізнай сям'ёй. Прыехалі некалі з Расіі ды так і прыжыліся ў «Грыцкевічах» назаўсёды сёстры Алена Чыкурова, Людміла Плотка, Таццяна Гусева. І мужы іх, зразумела, тут жа... «Вабіць нясвіжская зямля людзей, — падводзіць рысу гэтаму пераліку кіраўнік гаспадаркі. — Плённая яна ва ўсіх адносінах».

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

2

3

4


6

5

7

НА ЗДЫМКАХ:
1. Кіраўнік гаспадаркі Уладзімір МАЛАХВЕЙ. 2. Галоўны інжынер Міхаіл ЦЫУЛЯ і слесар Вячаслаў ПЛОТКА ў памяшканні, дзе «зімуе» тэхніка гаспадаркі. 3. Памочнік загадчыка малочна-таварнай фермы Валянціна МІНІЧ. 4. Растуць новыя дамы. 5. У Доме культуры ў Грыцкевічах, які ў свой час быў пабудаваны гаспадаркай. — Гэтыя карціны з ліку тых, што падораны гаспадарцы нясвіжскімі мастакамі, — гаворыць дырэктар Дома культуры Людміла ГАДО. 6. Граматай Патрыяршага Экзарха адзначана дапамога гаспадаркі ў рэканструкцыі праваслаўнага храма. 7. Настаўнік фізкультуры Міхаіл ПАЛЯШЧУК і яго юныя выхаванцы.

Дзень заўтрашні

Не збіраецца спыняцца СВК і ў сваім эканамічным развіцці. Кіраўнік Уладзімір Малахвей выкладвае наступны прагноз: выйсці на гэтых жа землях, якія ёсць цяпер, на наступныя паказчыкі — 25 тысяч тон цукровых буракоў (калі яны будуць патрэбныя ў межах цяперашняй зоны Гарадзейскага цукровага завода), 10 тысяч тон валавой вытворчасці малака, 10 тысяч тон валавой вытворчасці збожжа. У плане — будаўніцтва сучаснай малочна-таварнай фермы на 650 галоў (яе намячаюць увесці ўжо ў наступным годзе) са стойлавым утрыманнем на ёй жывёлы. Гэта дазволіць сканцэнтраваць жывёлу пераважна ў адным месцы (цяпер яна ўтрымліваецца на шэрагу дробных фермаў), а разам з тым вызваліць з-пад цяперашніх паш 100—150 гектараў дэфіцытнай для гаспадаркі зямлі з уключэннем яе ў абарот для раслінаводчых мэтаў. А яшчэ ў сувязі, і разам з будаўніцтвам новай малочна-таварнай фермы ў СВК «Грыцкевічы» задумалі ажыццявіць ну зусім незвычайную справу: пабудаваць сваю электрастанцыю на біягазе .

— Усё проста, — казаў Уладзімір Малахвей, паказваючы адпаведны праект. — Вось тут будуць памяшканні для жывёлы, тут станцыя, тут накапляльнікі масы. Той электраэнергіі, якая будзе выпрацоўвацца, хопіць на ўвесь СВК. Такія праекты дзейнічаюць у Германіі, і вельмі паспяхова.

Кіраўнік і калектыў СВК «Грыцкевічы» віншуюць усіх работнікаў аграпрамысловага комплексу з надыходзячым Новым годам і калядным святамі і жадаюць усім працвітання і добрага дастатку, прафесіяналізму, стабільнасці ў рабоце і асабістых поспехаў, здзяйснення ў новым годзе ўсіх жаданняў, жыццёвай энергіі, аптымізму. Няхай усіх вас знойдзе ў новым годзе ўдача!

Нашы чытачы ўжо ведаюць, што АСТРАЛАГІЧНЫ НОВЫ ГОД РАСПАЧНЕЦЦА 18 СНЕЖНЯ, КАЛІ ЮПІТЭР ПЯРОЙДЗЕ Ў СУЗОР'Е КАЗЯРОГА. Напярэдадні гэтай знакавай для многіх падзеі наш журналіст сустрэўся з астролагам Уладзімірам ВАСЮКОМ. які раскрыў некаторыя таямніцы планаў нябеснай канцылярыі на 2008 год. Чаго ж нам чакаць у бліжэйшыя 12 месяцаў?

ГОД КАР'ЕРЫСТАЎ-КАЛЕКТЫВІСТАЎ і «хатніх» мужчын

Хочаце — верце

ГЕАПАЛІТЫЧНЫ АСПЕКТ

Увогуле, знак Казярога — гэта знак грамадскай, сацыяльнай іерархіі (амаль па Канфуцыю), дзе кожны ведае сваё месца ў групе, калектыве. Звычайна ў гады праходжання Юпітэра праз Сузор'е Казярога назіраецца структурызацыя як сусветных (эканамічнай, палітычнай) сістэм, так і сістэм асобных краін.

Для краін Казярога (Кітая, Эстоніі, Беларусі) новы год створыць перадумовы для істотнага росту і прагрэсу, паспрыяе ўмацаванню іх пазіцый на геапалітычнай арэне. А для дзяржаў, звязаных з супрацьлеглым знакам (Рака), надыходзячы год будзе нялёгкім: Індыя і ЗША адчуюць аслабленне свайго палітычнага аўтарытэту. У 2008 і 2009 гадах прагназуецца высокі працэнт верагоднасці замаху на першую асобу Злучаных Штатаў Амерыкі (і ён можа стаць паспяховым). Акрамя таго, у гэты перыяд у ЗША будзе абмежаванне свабод асобы ў інтарэсах дзяржавы.

Сёлета завершыцца цыкл узлёту Расіі. Яе знешнепалітычная пазіцыя стане больш стрыманай.

Для краін Казярога 2008-ы абяцае быць годам сур'ёзных структурных перабудоў дзяржапарату, органаў выканаўчай улады.

Самымі важнымі ў XXI стагоддзі будуць 2018 і 2081 гады (аналагічна 1914 і 1941 гадам у XX стагоддзі). 2008 год стане «рэпетыцыяй» 2018-га, астролагі прагназуюць абвастрэнне геапалітычнай напружанасці. Для таго каб разабрацца ў няпростай геапалітычнай сітуацыі, сёлета кожнаму з нас неабходна будзе адчуць сябе непасрэдным удзельнікам глабальных працэсаў, часткай краіны, свету, дакладна ўсвядоміць сваё месца і ролю ў гэтых зменах.

ЭКАНОМІКА

Праходжаннем Юпітэра праз сузор'е Казярога (калі не ўплываюць іншыя фактары) звычайна абумоўлена панаванне «мядзведжых» тэндэнцый на асноўных сусветных фінансавых і фондавых рынках. Большасць фондавых індэксаў вядучых краін (у першую чаргу краін Вялікай васьмёркі) на працягу года будзе падаць. Будуць падаць акцыі, асабліва адчувальным іх падзенне плануецца ў банкаўскім сектары, у галіне будаўніцтва, у вытворчасці легкавых аўтамабіляў, у фармацэўтычным сектары. Пры гэтым прагназуецца рост пазіцый сектара страхавання.

Рух курсаў валют у 2008 годзе будзе даволі разнастайным, аднак з вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што падзенне долара адносна асноўных сусветных валют працягнецца (праўда, не такімі хуткімі тэмпамі, як у апошнім квартале 2007 года).

Нягледзячы на адноснае ўмацаванне пазіцый амерыканскага долара ў першым квартале 2008 года, у красавіку зноў распачнецца яго падзенне адносна еўра.

Значна ўзрастуць цэны на золата, серабро, плаціну. Працягнецца рост цэнаў на нафту (у красавіку 2008 года яны дасягнуць 120 долараў за барэль). Сёлета павялічыцца верагоднасць крызісу на фінансавых і фондавых рынках, таму астролагі раяць захоўваць зберажэнні не ў доларах, а ў каштоўных металах і нерухомасці.

КАР'ЕРА

У 2008 годзе закон фармальны, сацыяльны будзе дамінаваць над законам духоўным. Для таго каб дабіцца поспеху ў любой галіне жыццядзейнасці, неабходна будзе дасканала вывучыць «правілы гульні». Напрыклад, калі вы працуеце ў эканамічным сектары, то для атрымання станоўчых вынікаў вам трэба ведаць характар эканамічных адносінаў як унутры краіны, так і ў свеце ў цэлым, ведаць законы рынку і г.д.

Вялікае значэнне для дасягнення поспеху ў 2008 годзе будуць мець дысцыпліна, паслядоўнасць, упартасць, уменне пераадольваць перашкоды, пунктуальнасць. Асабліваю ўвагу астролагі раяць звярнуць на своечасовасць выканання пастаўленых кіраўніцтвам задач. Прычым якасць выканання будзе адыходзіць на другі план.

У 2008 годзе трэба дакладна ведаць, чаго вы жадаеце. Па-першае, неабходна сфармуляваць свае канкрэтныя мэты і задачы. Па-другое, кожны дзень «трымаць руку на пульсе» падзей, інакш сітуацыя выйдзе з-пад кантролю. Па-трэцяе, прызвычаіцца весці падрабязнае планаванне і пастаянна карэктаваць жыццёвы «бізнэс-план» у адпаведнасці са сваімі дасягненнямі.

Для кар'ернага росту год выдатны. Аднак каб прасунуцца па службовай лесвіцы, варта не быць «выскачкай», а дзейнічаць у калектыве, выкарыстоўваць на карысць сабе яго энергію. Адзіночкі будуць цярпець паражэнне. У 2008 годзе бессэнсоўнай будзе барацьба адзіночкі са структурай. Спатрэбіцца зрабіць выбар: адысці ўбок або ўкараніцца і падпарадкавацца законам структуры.

АСТРАПРАГНОЗ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Як і для ўсіх краін, чый астралагічны «шэф» — Казярог, для Беларусі 2008 год прынясе значныя станоўчыя змены як у знешне- і ўнутрыпалітычным аспектах, так і ў галіне эканомікі, культуры і г.д. Дадатковы імпульс для развіцця атрымаюць машынабудаванне і страхаванне. Цэны на нерухомасць пачнуць паніжацца. З'явяцца новыя навукова-даследчыя інстытуты планава-эканамічнага, сацыялагічнага, прававога накірунку. Чакаюцца сур'ёзныя змены ў архітэктуры і горадабудаўніцтве (новыя тыпы будынкаў, новыя тэхналогіі, новыя маштабныя праекты і г.д.).

Глабальных прыродных і тэхнагенных катастроф 2008 год Беларусі не абяцае. Аднак лакальныя тэхнагенныя аварыі магчымы летам на Палессі і на паўднёвым усходзе краіны.

АСТРАПРАГНОЗ ДЛЯ МІНСКА

У гады праходжання Юпітэра праз сузор'е Казярога ў нашай сталіцы адкрываліся буйныя грамадскія ўстановы, звязаныя з навукай і адукацыяй. Чакаецца, што не стане выключэннем і 2008 год. Найбольшае развіццё атрымаюць мікрараёны Зялёны Луг-3, Зялёны Луг-6, Сельгаспасёлак, Лошыца, Акцябрскі раён, вуліцы Нававіленская, Варвашэні, Старабарысаўскі тракт.

У новым годзе верагодна «ўразанне» муніцыпальнага бюджэту. Сур'ёзных прыродных і тэхнагенных катастроф не чакаецца, аднак у першы тыдзень жніўня 2008 года небяспечнымі могуць стаць раён стадыёна «Дынама» і вуліца Пуліхава.

КАХАННЕ. ШЛЮБ

У новым годзе асаблівай папулярнасцю ў жанчын будуць карыстацца «хатнія» мужчыны анты-мачо. Тып знешнасці — а-ля Аляксандр Цэкала і Роберт Дэ Ніра (невысокі, таўставаценькі ці проста з «пузікам», мяккі, спагадлівы). Слабы пол будзе шукаць мужчын, якія добра гатуюць, прыбіраюць, маюць «свой вугал». Высока ў 2008-м будзе каціравацца мужчынскае ўменне стварацъ утульнасць (у першую чаргу псіхалагічную). Ідэальным з жаночага пункту гледжання стане мужчына, які круціцца вакол каханай, як Месяц вакол Зямлі, з запытам: «Мілая, адзіная, чым табе яшчэ дагадзіць?».

А вось жанчыны працягнуць энергетыку мінулага года (Венера ў Льве), таму найбольш папулярным і запатрабаваным застанецца вобраз свецкай львіцы (крыху адасобленай, самадастатковай, з высокай самаацэнкай жанчыны, якая маніпулюе мужчынамі).

Адпаведна будуць фарміравацца пары, дзе ён — высокі, «цёплы», «хатні», вядзе гаспадарку і сядзіць дома з дзецьмі; яна — незалежная, эфектная, зарыентаваная на кар'ерныя дасягненні, займаецца спортам, наведвае салярыі і салоны прыгажосці.

2008 год — год высакосны, аднак Уладзімір Васюк сцвярджае, што на якасць шлюбу гэта не ўплывае. Тым не менш Юпітэр у Казярогу прыўносіць пэўную асаблівасць: усе ўзаемаадносіны павінны быць загадзя агавараныя, юрыдычна задакументаваныя. Прасцей кажучы, для рэгістрацыі вашых адносінаў год спрыяльны, а вось рашэнне пажыць «грамадзянскай» сям'ёй можа абярнуцца сур'ёзнымі праблемамі.

Новы год будзе асабліва ўдалым для ўступлення ў шлюб у Казярогаў, Цяльцоў і Дзевы. Зоркі раяць быць асабліва асцярожнымі Ракам і Рыбам. Паветраным знакам (Вадалеям, Блізнятам, Шалям) неабходна больш сур'ёзна паставіцца да жыцця, і тады шлюб сфарміруецца сам сабой. Вогненным Знакам (Авену, Льву, Стральцу) неабходна кіравацца сваімі рынцыпамі, а не меркаваннямі родных і сяброў.

Асабістыя адносіны 2008 года — гэта адносіны кантрастаў: адзін — абавязкова лідар, другі — «падначалены». Калі вы заводзіце новыя знаёмствы — адразу вызначайце сваю ролю ў іх. Увогуле, Уладзімір Васюк раіць не спяшацца будаваць асабістыя адносіны ў 2008 годзе. Спярша варта прыгледзецца да партнёра, усебакова яго ацаніць і толькі потым на нешта адважвацца. Асноўнае правіла: мінімум спантаннасці і імправізацыі.

МОДНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ І СТЫЛЬ

Папулярнасць атрымае манахромная гама. Колер будзе другасным адносна лініі і сілуэту. У фаворы будзе строгі дзелавы (функцыянальны) стыль, пазбаўлены лішніх элементаў. Пасіўныя ювелірныя ўпрыгажэнні будуць не ў модзе. Дызайнеры натхняцца ваеннай формай і... рабочай спецвопраткай. Для жанчын актуальныя кароткія стрыжкі.

ШТО І КОЛЬКІ ЛЕПШ СПАЖЫЦЬ У НАВАГОДНЮЮ НОЧ?

У ноч з 31 снежня на 1 студзеня Месяц будзе ў сузор'і Шаляў, а значыць, ужываць алкаголь трэба ўмерана, пажадана не змешваць напоі, адмовіцца ад кактэйляў. Жанчыны будуць п'янець асабліва хутка, таму ім неабходна захоўваць пільнасць і не перавышаць звыклую норму, каб потым не раскайвацца ўвесь наступны год. У першую чаргу гэтая парада тычыцца **жанчын-Авенаў**. Ім зоркі раяць ужываць толькі слабыя паўсухія віны. **Жанчынам-Цяльцам** у навагоднюю ноч проціпаказана змешваць гарэлку з чырвоным віном (выбраць нешта адно!) і забяспечыць на стале садавіну. **Блізнятам** не трэба баяцца выпіць крыху больш за сваю звычайную норму, але зрабіць гэта неабходна прыгожа, эфектна. Аддаць перавагу белым паўсухім вінам ці гарэлцы (але абавязкова высокай якасці). Каб пазбегнуць назаўтра негатыўных наступстваў, пажадана нікога не крытыкаваць. **Ракам** асабліва не варта злоўжываць алкаголем (могуць узнікнуць праблемы са страўнікам). Ваш напой — шампанскае і лёгкія пеністыя віны. **Львам** — пазбягаць звычкі рабіць усё ад душы. Лепшы выбар — віскі, каньяк. Каб не стаць занудай у навагоднюю ноч, **Дзевам** зоркі раяць аддаць перавагу белым вінам ці гарэлцы, плюс — традыцыйныя беларускія стравы на стале. Для **Шаляў** алкаголь можа быць прычынай сямейнай сваркі. Устрымайцеся ад гарэлкі. Ваш напой — белыя віны ці джын (у невялікім аб'ёме!). А вось на **Скарпіёнаў** у навагоднюю ноч алкаголь будзе ўздзейнічаць слаба. Праўда, ім зоркі раяць не рабіць эксперыментаў з кактэйлямі і экзатычнымі напоямі. **Стральцам** лепш абмежавацца традыцыйнымі напоямі, якія былі на стале ў 2007 годзе. Піце тое, да чаго вы прывыклі. Пазбягайце імпульсіўных дзеянняў. Увогуле, напой **Стральцоў** — каньяк. У **Казярогаў** на стале побач з шампанскім добра было б убачыць бутэльку ірландскага віскі. І не дэманструйце, калі ласка, свае паранармальныя здольнасці тым, хто вас акружае. Традыцыйны напой **Вадалеяў** — гарэлка, аднак не столькі сам напой, колькі стол, які пацвярджае статус гарэлкі. Алкаголь для **Вадалеяў** абавязкова павінен спалучацца са смачнай стабільнай ежай. **Рыбы**, аддайце перавагу лёгкім, але дарагім белым вінам. Алкаголь варта перамяжоўваць з душэўнымі размовамі і садавінай.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.21	15.48	7.27
Віцебск —	8.18	15.30	7.12
Магілёў —	8.11	15.38	7.27
Гомель —	8.00	15.43	7.43
Гродна —	8.35	16.04	7.29
Брэст —	8.27	16.13	7.46

Месяц

Першая квадра 17 снежня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Антона, Апанаса, Івана, Канстанціна, Мацвея, Мікалая, Сцяпана, Сяргея;*

К. *Марыі, Ніны, Хрысціны, Віктара.*

НАДВОР'Е на заўтра



— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 сак. | 5 сак. | 8 сак. | 11 сак. | 14 сак. | 17 сак. | 20 сак. | 23 сак.

...у суседзяў

ВАРШАВА -1..+1°С	КІЕЎ -3..-1°С	РЫГА -5..-3°С
ВІЛЬНЮС -2..0°С	МАСКВА -1..+1°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°С

Дзве даты

15 снежня

1917 год — у Брэст-Літоўску было заключана пагадненне аб часовым спыненні ваенных дзеянняў паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блоку, якія ўдзельнічалі ў Першай сусветнай вайне.

37 год — нарадзіўся Нерон, рымскі імператар. Паходзіць з дынастыі Юліяў-Клаўдзяў. Вызначаўся незвычайнай жорсткасцю, падазронасцю і хітрасцю. У 64 годзе па яго загаду быў падпалены Рым, а каб адвесці ад сябе падазрэнні, абвінаваціў у гэтым хрысціян. Рэпрэсіямі і канфіскацыямі настроіў супраць сябе розныя слаі рымскага грамадства. Апасаючыся паўстання, у 68 годзе збег з Рыма і пакончыў жыццё самагубствам. Праўда, пасля смерці доўга хадзілі чуткі, што імператар жывы, і нават з'яўляліся шматлікія лжэ-Нероны.

Цытата дня

«Жанчына ніколі не ведае, чаго хоча, але не супакоіцца, пакуль гэтага не даб'ецца».

Станіслаў Крылоў.

Усміхнёмся!

Сталы ўрач скардзіцца свайму сябру:

— Вось і чакай падзякі ад сваіх дзяцей! Колькі намаганняў я паклаў на тое, каб мой сын таксама стаў урачом! І ведаеш, як ён мне аддзякаваў?

— Ну?

— Забараніў мне піць і курыць!

☺

Ем «Ролтан» і разумею, як моцна я цябе кахаю. Калі ласка, Ганна, вярніся да мяне!

☺

— Ты не пазычыш мне 10 тысяч рублёў да панядзелка?

— А яно мне патрэбна? Я і так дрэнна сплю!



ЛЕГАЛІЗАЦЫЯ НА 7 ГАДОЎ

Суд Навабеліцкага раёна Гомеля вынес прыгавор былому старшаму інспектару аддзялення па грамадзянству і міграцыі Гомельскага РАУС і яго напарніку — грамадзяніну Азербайджана, якія абвінавачваліся ў незаконнай легалізацыі замежных грамадзян на тэрыторыі Беларусі. Экс-інспектар прыгавораны да сямі гадоў пазбаўлення волі, яго дзелавы партнёр — да шасці гадоў.

Як паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гомельскай вобласці, былы старшы інспектар міграцыйнай службы і грамадзянін Азербайджана былі затрыманы вясной гэтага года. Іх супрацоўніцтва было наладжана па наступнай схеме: азербайджанец пастаўляў кліентаў, якія мелі патрэбу ў легалізацыі, а супрацоўнік аддзялення па грамадзянству і міграцыі за пэўную плату — ад 100 да 500 долараў — праводзіў неабходныя працэдуры. Так, у парушэнне закона легалізацыю атрымалі некалькі грамадзян Азербайджана і Узбекістана.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

